ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Выдаецца з 1932 г.
№ 47 (2573)
ПЯТНІЦА
19
лістапада 1971 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ НА ШАСНАЦЦАЦІ СТАРОНКАХ

Цана 8 кап.

НОВЫ НЕ ТОЛЬКІ АДРАС...



Новы будынак бібліятэкі імя Пушкіна.



Адкрывае бібліятэку намеснік міністра культуры БССР Р. Мачулін.

Юных чытачоў абслугоўвае Ніна Лойка.



Бібліятэкары Людміла Разанцава і Ірына Салаўёва рэгіструюць першых чытачоў.

Старшы бібліятэкар чытальнай залы Рыма Заневіч падбірае літаратуру наведвальнікам.



У дзень адкрыцця гасцямі бібліятэкі былі Анатоль Астрэйка, Васіль Хомчыцка і Рыгор Пахай.

Фота У. КРУКА.

НЕ БАЮЧЫСЯ папрэкаў у шаблоне, усё ж назаву гэты будынак палацам. Палацам кнігі. Бо назваць яго неяк іначай, шчыра кажучы, не выпадае. Зірніце на здымак. Ужо знешне будынак уражвае. Уражвае велічынёй, уражвае сваім фасадам — бетон і шкло, уражвае сваёй несумненна палацавай формай. Яшчэ большае святочнае ўражанне пакідае ён пры бліжэйшым знаёмстве, тады, калі паходзіш па яго светлых калідорах і прасторных залах...

Маю на ўвазе новы будынак Мінскай абласной бібліятэкі імя Пушкіна, ячая нядаўна — 5 лістапада — справіла сваё наваселле. Новы адрас бібліятэкі: горад Мінск, вуліца імя Гікалы, 4. Аднак гэтае наваселле — не проста наваселле. Па сутнасці, гэта трэцяе нараджэнне старэйшай бібліятэкі сталіцы рэспублікі.

...Узнікла яна на пачатку нашага стагоддзя. У 1899 годзе дэмакратычная і прагрэсіўная грамадскасць Мінска рыхтавалася адзначыць стагоддзе з дня нараджэння вялікага рускага паэта Аляксандра Пушкіна. Нарадзілася думка: заснаваць у горадзе бібліятэку яго імя. Энтузіясты сабралі 2 тысячы кніг і паўтары тысячы рублёў на набыццё кніг. Але думка гэтая была зусім не па гусце гарадскім уладам. Бібліятэка? Навошта? Яшчэ адзін рассаднік вольнадумства? Пытанне адкрыцця бібліятэк адкладвалася і адкладвалася. І толькі ў ліпені 1900 года губернатар даў, урэшце, літасцівы дазвол.

25 снежня 1900 года адбылося яе адкрыццё. Штат бібліятэкі складаўся з трох чалавек: бібліятэкар, яго памочнік і вартаўнік. Прадчуванні губернатара былі недарэмныя: бібліятэка імя Пушкіна з першых дзён сваёй работы стала асяродкам не толькі культурна-асветнай, але і рэвалюцыйна-прапагандысцкай дзейнасці, своеасаблівым штабам мінскіх сацыял-дэмакратаў. У 1913 годзе, у самы разгул рэакцыі, чыноўнікі, якія праяраралі бібліятэку, адзначалі, што многія яе аддзелы ўкамплектаваны літаратурай пераважна прагрэсіўнага, сацыялістычнага кірунку. І яны не памыляліся: тут былі творы Маркса, Энгельса, Леніна, Пляханава, Лафарга і г. д.

І яшчэ адзін штрых: у 1909 годзе, калі рэакцыя ўсіх масцей спявала знаёму Льву Талстому, савет бібліятэкі абраў вялікага пісьменніка зямлі рускай сваім ганаровым членам. Леў Талстой з удзячнасцю прыняў гэтае абрачне...

У 1918 годзе бібліятэчную чытальную залу запоўнілі дзеці рабочых, дзеці гарадской беднаты. З 1938 года пушкінская бібліятэка носіць назву абласной. Напярэдадні вайны ў ёй было больш 175 тысяч кніг.

У другі раз пушкінка нарадзілася ў сорак чацвёртым годзе. У зруйнаваным і дашчэнту разрабаваным гітлераўцамі горадзе з цяжкасцю ўдалося сабраць для яе каля 8 тысяч кніг...

Сёння ў бібліятэцы імя Пушкіна — больш 250 тысяч тамоў самай разнастайнай літаратуры. Яна — буйны навукова-метадычны і бібліяграфічны цэнтр Міншчыны.

І вось—трэцяе нараджэнне. Пра яго гаворыць намеснік дырэктара па навуковай частцы Ангеліна Антонава:

— Карысная наша плошча зараз — 7 тысяч пяцьсот квадратных метраў. Агульная чытальная зала, юначая, залы перыёдыкі, беларускай і краязнаўчай, тэхнічнай і сельскагаспадарчай літаратуры, зала мастацтва — усіх іх восем — адначасова могуць прыняць 800 чытачоў. Створаны выдатныя ўмовы для работы ўсіх аддзелаў і служб бібліятэкі: навукова-метадычнага, даведачна-бібліяграфічнага, арганізацыі каталогаў, камплектавання, сектараў міжбібліятэчнага абанемента і ўліку, аддзела кнігасховішча і г. д. У штаце бібліятэкі — 62 бібліятэчныя работнікі, з іх дзезяноста працэнтаў маюць вышэйшую адукацыю. Галоўны бібліограф Ганна Уладзіміраўна Кубіцкая, загадчык аддзела апрацоўкі Браніслава Міхайлаўна Жаймовіч, загадчык аддзела кнігасховішча Тамара Захараўна Гарэлік, старшыя бібліятэкары Мацільда Крупко і Людміла Касяк, рэдактар каталогаў Тамара Гаўрына і многія іншыя — гэта сапраўдныя энтузіясты бібліятэчнай справы, гатовыя заўсёды прыйсці на дапамогу чытачу, даць яму вычарпальную інфармацыю і прафесіянальную кансультацыю. Ёсць у нас зараз і магчымасці для правядзення масавай работы — арганізацыі вечароў, сустрэч, дыспутаў, канферэнцый...

Новая пушкінка гасцінна запрашае чытачоў.

М. ГІЛЬ.

УСЕ СІЛЫ—ВЫКАНАННЮ СТВАРАЛЬНЫХ ПЛАНАЎ ПАРТЫІ І НАРОДА

Прамова кандыдата ў члены Палітбюро ЦК КПСС, першага сакратара ЦК КПБ таварыша П. М. МАШЭРАВА на IV з'ездзе Саюза журналістаў Беларусі

11—12 лістапада 1971 года ў Мінску праходзіў IV з'езд Саюза журналістаў рэспублікі. Каля 300 дэлегатаў — работнікаў рэспубліканскіх, абласных, гарадскіх, аб'яднаных, раённых і шматтыражных газет, часопісаў, тэлебачання і радыёвяшчання, выдавецтваў сабраліся на свой форум, каб абмеркаваць надзённыя справы, абмяняцца думкамі, вопытам, намеціць новыя далягляды.

Пра важкасць журналісцкага слова, пра ганаровы абавязак савецкіх журналістаў кіравацца прынцыпамі ленінскай публіцыстыкі, па-партыйнаму горача, натхнёна адлюстроўваць нашу сацыялістычную рэчаіснасць гаварылася ў прывітанні з'езду Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі.

Са справаздачным дакладам аб рабоце праўлення Саюза журналістаў БССР і задачах журналістаў рэспублікі ў святле рашэнняў XXIV з'езда КПСС выступіў старшыня праўлення, рэдактар «Сельской газеты» У. Мацвееў, справаздачу рэвізійнай камісіі Саюза журналістаў БССР зрабіў старшыня камісіі Я. Міско.

Цёпла сустрэты прысутнымі, з вялікай яркай прамовай на з'ездзе выступіў кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў.

З'езд выбраў кіруючыя органы Саюза журналістаў БССР і дэлегатаў на III з'езд Саюза журналістаў СССР. Старшынёй праўлення саюза выбраны У. Мацвееў, першы намеснікам — М. Дзялец, намеснікамі — А. Зінін, Г. Лысо[illegible] сакратаром — М. Пацёмкін.

У рабоце з'езда прынялі ўдзел П. М. Машэраў, Ф. А. Сурганаў, Ц. Я. Кісялёў, А. Н. Аксёнаў, А. Т. Кузьмін, У. Ф. Мішкевіч, А. А. Смірноў, У. І. Падрэз, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н. Л. Сняжкова, загадчык сектара выдавецтваў аддзела прапаганды ЦК КПСС І. І. Чхіквішвілі, сакратар праўлення Саюза журналістаў СССР, галоўны рэдактар газеты «Известия» Л. М. Талкуноў, загадчыкі аддзелаў ЦК КПБ А. Ц. Караткевіч, С. В. Марцэлеў.

ТАВАРЫШЫ!

Ваш з'езд — з'езд Саюза журналістаў рэспублікі — мы разглядаем як важную падзею ў ідэйна-палітычным жыцці Кампартыі Беларусі, усяго беларускага народа. Вы прадстаўляеце адзін з баявых атрадаў савецкай журналістыкі, сіла і аўтарытэт якой у беззаветным служэнні справе партыі, інтарэсам працоўных, вялікім камуністычным ідэалам.

Сацыяльна-актыўная роля сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды за апошнія гады няўхільна ўзрастае. Гэтаму садзейнічаюць штодзённыя клопаты партыі і ўрада аб усямерным развіцці друку, тэлебачання, радыёвяшчання, расшырэнні сферы іх дзеяння, павышэнні ідэйнага зараду і эстэтычнай каштоўнасці журналісцкага слова. Асабліва бурна прагрэсіруе тэлебачанне, якое стала адным з дзейсных і перспектыўных сродкаў ідэйна-палітычнага і эмацыянальна-мастацкага ўздзеяння на масы. Створаны самыя спрыяльныя ўмовы для таго, каб вялікая і неадольная праўда ідэй нашай партыі, яе дынамічнай унутранай і знешняй палітыкі даходзіла да розуму і сэрца кожнага савецкага чалавека, каб усе багацці духоўнай культуры, непераўзыйдзеныя маральныя каштоўнасці нашага грамадства станавіліся здабыткам усяго народа.

Бальшавіцкая прэса, паводле вызначэння Уладзіміра Ільіча Леніна, гэта калектыўны прапагандыст, агітатар і арганізатар. Яна заўсёды выступала і выступае баявым памочнікам партыі ва ўсёй яе шматграннай дзейнасці.

Партыя, наш народ аддаюць належнае высакароднай, нястомнай працы журналістаў — людзей неспакойнага лёсу, натхнёных летапісцаў нашай гераічнай эпохі, страсных, перакананых барацьбітоў за новае, перадавое, камуністычнае.

Як вядома, XXIV з'езд ленінскай партыі высока ацаніў плённую дзейнасць і творчыя намаганні шматтысячнага атрада савецкіх журналістаў. «Наш друк, радыё, тэлебачанне, — гаварыў Леанід Ільіч Брэжнеў, — робяць многае для аператыўнага асвятлення актуальных праблем унутранага жыцця краіны і міжнародных спраў, якія сапраўды цікавяць савецкіх людзей, дапамагаюць пашыраць перадавы вопыт камуністычнага будаўніцтва, даюць адпор ідэалагічным вылазкам класавых праціўнікаў».

Прыемна адзначыць, што ў гэтую вялікую работу важкі ўклад уносяць і журналісты нашай рэспублікі. Поплеч з усімі ідэалагічнымі работнікамі яны прыкладаюць немалыя намаганні па прапагандзе гістарычных рашэнняў XXIV з'езда КПСС і мабілізацыі працоўных на ажыццяўленне выстаўленай партыяй велічнай праграмы камуністычнага будаўніцтва, грандыёзных заданняў дзевятай пяцігодкі. Можна без перабольшання сказаць, што гэта стала самым важным, самым галоўным у дзейнасці нашага друку, тэлебачання і радыё. І радасна, што менавіта гэтыя пытанні, звязаныя з пошукам новых, больш эфектыўных шляхоў творчага ўдзелу журналістаў у рэалізацыі рашэнняў партыі, аказаліся ў цэнтры ўвагі вашага з'езда, з'явіліся прадметам сурёзнага, дзелавога абмеркавання.

У справаздачным дакладзе, у прамове тав. Талкунова Л. М. і выступленнях дэлегатаў было выказана шмат цікавых і важных думак і прапаноў, якія трэба абавязкова рэалізаваць у далейшай рабоце. На з'ездзе былі выстаўлены таксама і некаторыя пытанні пастановачнага характару. Думаецца, што яны заслугоўваюць увагі і павінны быць разгледжаны ў адпаведных органах з тым, каб знайсці магчымасці для іх станоўчага вырашэння.

Мне таксама, таварышы, хацелася б падзяліцца з вамі некаторымі меркаваннямі, якія маюць, з майго пункту гледжання, прынцыповае значэнне для далейшага паляпшэння практыкі работы ўсіх органаў масавай інфармацыі рэспублікі ў святле ўказанняў XXIV з'езда КПСС і задач Кампартыі, працоўных Беларусі на сучасным этапе камуністычнага будаўніцтва.

У нашай рэспубліцы, як і ва ўсёй краіне, асноўны змест і рытм жыцця характарызуюцца цяпер высокім напалам усенароднай барацьбы за ажыццяўленне генеральнай лініі партыі. Другі пленум ЦК КПБ, як вядома, разгледзеў пытанне аб мерапрыемствах па паспяховым выкананні рашэнняў XXIV з'езда. Мерапрыемствы, адобраныя пленумам, сталі канкрэтным рабочым планам практычнай дзейнасці партыйных, савецкіх, гаспадарчых і грамадскіх арганізацый, усіх працоўных калектываў рэспублікі па ажыццяўленні дырэктыў партыі, заданняў пяцігодкі.

Вынікі дзесяці месяцаў гэтага года сведчаць аб тым, што пакладзен добры пачатак, што энергія і воля камуністаў, усіх працоўных накіраваны цяпер у рэчышча вялікай творчай работы па ўсямерным павелічэнні ўкладу рэспублікі ў вырашэнне гістарычных задач, намечаных XXIV з'ездам партыі.

Ва ўпэўненым, устойлівым тэмпе працуе індустрыя рэспублікі. Работнікі прамысловасці перавыканалі план 10 месяцаў гэтага года па рэалізацыі прадукцыі і вытворчасці большасці важнейшых відаў вырабаў. Аб'ём прамысловай вытворчасці ўзрос у параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года на 11,8 працэнта. Выкананы план па росту прадукцыйнасці працы. Паспяхова развіваюцца энергетыка, электроніка, машынабудаванне, хімія, нафтахімія і іншыя галіны, якія вызначаюць і стымулююць агульны тэхнічны прагрэс усёй нашай народнай гаспадаркі. Прыкметна расце аб'ём вытворчасці лёгкай і харчовай прамысловасці, шырыцца спаборніцтва за выпуск у рэспубліцы звыш плана на мільярд рублёў тавараў народнага спажывання. Працоўныя калектывы прамысловых прадпрыемстваў імкнуцца стрымаць сваё слова — выканаць план першага года пяцігодкі ў цэлым па прамысловасці да 26 снежня, па росту прадукцыйнасці працы — да 25 снежня.

З вялікім напружаннем працуюць работнікі сельскай гаспадаркі. У засекі дзяржавы паступіла звыш 670 тысяч тон беларускага збожжа, у тым ліку больш як 170 тысяч тон звыш цвёрдага плана. Паспяхова выконваюцца заданні па продажу дзяржаве мяса. Перавыкананы планы дзяржаўных закупак лёк, воўны, бульбы і фруктаў. На жаль, узніклі пэўныя цяжкасці з рэалізацыяй устаноўленых планаў і прынятых абавязацельстваў па вытворчасці малака. Гэта патрабуе прыкласці асаблівыя намаганні па паскарэнні росту прадукцыйнасці дойнага статку, арганізаваным правядзенні зімоўкі жывёлы з тым, каб як мага хутчэй нагнаць упушчанае.

Папярэднія вынікі гаспадарча-эканамічнага развіцця рэспублікі ў першым годзе пяцігодкі даюць магчымасць нам глыбей разабрацца ў тым, дзе і ў чым мы працуем на ўзроўні патрабаванняў з'езда, а ў якіх галінах справы ідуць не так, як хацелася б, як патрабавалася б. Кожны павінен добра ўсвядоміць, на якіх участках, на якіх напрамках нам трэба будзе сканцэнтраваць максімум увагі, сіл і сродкаў, каб безумоўна выканаць узятыя Кампартыяй, працоўнымі рэспублікі на гэтую пяцігодку высокія абавязацельствы і забяспечыць такім чынам паспяховае ажыццяўленне Дырэктыў XXIV з'езда КПСС.

У прамысловасці і ў цэлым у народнай гаспадарцы рэспублікі — гэта, як вядома, барацьба за павышэнне эфектыўнасці вытворчасці, паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу і росту прадукцыйнасці працы.

У сельскай гаспадарцы — гэта ўсямернае павелічэнне вытворчасці важнейшых відаў прадукцыі раслінаводства і, перш за ўсё, збожжа на асове няўхільнага павышэння ўрадлівасці глебы і росту ўраджайнасці ўсіх сельскагаспадарчых культур; гэта — далейшае развіццё і павышэнне прадукцыйнасці грамадскай жывёлагадоўлі шляхам стварэння трывалай кармавой базы, паўсюднага пераходу да новай прагрэсіўнай тэхналогіі кормавытворчасці.

У плане ідэалагічным — гэта фарміраванне ва ўсіх працоўных марксісцка-ленінскага светапогляду, высокіх ідэйна-палітычных якасцей, норм камуністычнай маралі.

Тое, што ў гэтых адносінах робіцца, а робіцца многае, пакуль што ніяк не ў поўнай меры адпавядае сучасным патрабаванням. І каб, як гаворыцца, стаць упоравень з жыццём і рухацца паспяхова наперад па ўсіх напрамках, патрэбны сапраўды творчыя, сапраўды наватарскія адносіны да справы ўсіх нашых кадраў, у тым ліку больш дзейсная, больш актыўная арганізуючая і мабілізуючая роля нашай прэсы, усіх служб і сродкаў інфармацыі і прапаганды.

Каб падкрэсліць выключную важнасць таго або іншага пытання, журналісты нярэдка ўжываюць выраз «праблема нумар адзін». Дык вось такой «праблемай нумар адзін» для нашай народнай гаспадаркі з'яўляецца сёння паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу. Бо, як адзначыў XXIV з'езд КПСС, гэта рашаючая ўмова павышэння эфектыўнасці грамадскай вытворчасці. Перад партыяй і народам пастаўлена задача першараднай важнасці — арганічна спалучыць дасягненні навукова-тэхнічнай рэвалюцыі з перавагамі сацыялістычнай сістэмы гаспадаркі.

Актыўная роля сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды тут можа праявіцца перш за ўсё ў тым, каб пытанні паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу паставіць у цэнтр грамадскай думкі, зрабіць іх прадметам штодзённых клопатаў і ўсеагульнай зацікаўленасці.

Газеты і часопісы за апошні час даволі часта пішуць аб розных аспектах навукова-тэхнічнага прагрэсу. У гэтых адносінах заслугоўваюць адабрэння многія выступленні газет «Звязда», «Советская Белоруссия», «Сельская газета», часопіса «Сельское хозяйство Белоруссии», Беларускага тэлебачання і радыё.

Больш таго, тэма навукова-тэхнічнага прагрэсу стала ў нейкай меры нават моднай. Але, як ва ўсякай пагоні за модай, тут часам з'яўляецца нямала лёгкаважкага, павярхоўнага, выпадковага. У многіх публікацыях аб тэхнічным прагрэсе нярэдка пераважае прагматычны, вузкатэхнічны падыход. Возьмем, напрыклад, часопіс «Промышленость Белоруссии». Нельга сказаць, што ён не асвятляе праблемы навукова-тэхнічнага прагрэсу. Але бяда ў тым, што асобныя грунтоўныя артыкулы па данай праблематыцы засланяюцца дробнатэм'ем, адцясняюцца малазначнымі паведамленнямі: ад збору макулатуры да гісторыі шахмат. У часопісе шмат рубрык, але вядучай рубрыкі — аб сучасным рабочым, інжынеры, вучоным, аб савецкім чалавеку — галоўнай рухаючай сіле навукова-тэхнічнага і сацыяльнага прагрэсу — у часопісе няма. Тэхналогія, схемы і чарцяжы засланяюць жывых людзей на старонках як гэтага, так і некаторых іншых галіновых часопісаў.

Другі недахоп — гэта асветніцкі падыход прэсы, радыё і тэлебачання да пытанняў навукова-тэхнічнага прагрэсу. Паведаміўшы аб якім-небудзь новаўвядзенні ў тэхналогіі і арганізацыі вытворчасці, многія рэдакцыі лічаць сваю задачу выкананай. Між тым агульнавядома, што галоўнае заключаецца ў практычнай рэалізацыі дасягненняў навукі, іх укараненні ў масавую вытворчасць.

Менавіта тут з усёй сілай і заклікана праявіцца арганізатарская, я б сказаў, ініцыятыўная функцыя друку, тэлебачання і радыё. У чым канкрэтна павінна заключацца іх работа? Думаецца, перш за ўсё ў шырокім аператыўным і дакладным інфармаванні нашай грамадскасці аб дзейнасці навукова-даследчых устаноў, у кваліфікаванай прапагандзе найбольш важных фундаментальных і прыкладных распрацовак, якія даюць магчымасць дабіцца высокага навукова-тэхнічнага ўзроўню ўсёй вытворчасці. Я наўтараю, менавіта ўсёй вытворчасці, бо, як адзначалася на XXIV з'ездзе КПСС, у эпоху, калі ўсё ў большай меры праяўляецца роля навукі як непасрэднай прадукцыйнай сілы, галоўным становіцца ўжо не асобныя дасягненні, якімі б бліскучымі яны ні былі, а высокі навукова-тэхнічны ўзровень усёй народнай гаспадаркі.

Значыць, сродкам масавай інфармацыі і прапаганды трэба ўзяць пад жорсткі грамадскі кантроль выкананне планаў па ўкараненні дасягненняў навукі і тэхнікі ў вытворчасць, прымяненне і эфектыўнае выкарыстанне ва ўсіх звеннях народнай гаспадаркі самай прагрэсіўнай тэхналогіі, навуковую і канструктарскую распрацоўку найбольш вузкіх месц вытворчасці, яе механізацыю і аўтаматызацыю, павышэнне энергаўзброенасці працы.

Інакш кажучы, наша прэса можа і павінна ўстанавіць своеасаблівае шэфства над ходам укаранення кардынальных навуковых адкрыццяў, вынаходстваў і рацыяналізатарскіх прапаноў, якія вызначаюць рост тэхнічнай аснашчанасці вытворчасці. Трэба больш эфектыўна выкарыстоўваць для гэтай мэты ўжо набыты вопыт сумеснай работы газет, радыё і тэлебачання. Маецца на ўвазе арганізацыя рэйдаў, грамадскіх аглядаў укаранення ў вытворчасць навукова-тэхнічных дасягненняў. На старонках друку, у перадачах тэлебачання і радыё, відаць, мэтазгодна праводзіць дзелавую пераклічку вучоных і работнікаў народнай гаспадаркі па пытаннях хутчэйшага ўкаранення ў вытворчасць вынікаў навукова-тэхнічных даследаванняў.

І, нарэшце, мне хацелася б асабліва падкрэсліць неабходнасць выяўлення праз прэсу недахопаў у рабоце па паскарэнні навукова-тэхнічнага прагрэсу. Маюцца на ўвазе факты кансерватызму, цяганіны, нежадання пановаму вырашаць сучасныя задачы. Наша прэса заклікана з усёй вастрынёй выступаць супраць такіх ненармальных з'яў.

На XXVII з'ездзе Кампартыі Беларусі была востра пастаўлена праблема комплекснай механізацыі вытворчасці і перш за ўсё механізацыі дапаможных работ. Да гэтага часу ў нас нямала працуючых у прамысловасці, будаўніцтве і на транспарце занята ручной працай. Зусім відавочна, што для механізацыі дапаможных работ не патрабуецца ні асаблівых навуковых распрацовак, ні вялікіх матэрыяльных затрат. Даную праблему можна было б з поспехам вырашаць на месцы, ва ўмовах кожнага горада, прадпрыемства, правяўшы, вядома, патрэбную ініцыятыву і прыклаўшы энергію. Аднак гэтаму ўчастку работы не надаецца яшчэ належнага значэння. Механізацыя дапаможных работ водзецца пакуль што нездавальняюча.

У чым жа справа? Перш за ўсё ў тым, што многія гаспадарчыя кіраўнікі ўсё яшчэ недаацэньваюць гэты найбольш хуткі і эканамічны спосаб павышэння эфектыўнасці грамадскай вытворчасці і па-ранейшаму мала ўдзяляюць яму ўвагі. Вось тут мы і бачым шырокае поле дзейнасці для прэсы. З дапамогай такога магутнага сродку, як грамадская думка, неабходна рашуча ламаць кансерватызм і інертнасць такіх работнікаў, падвяргаць суровай крытыцы тых, хто ўсё яшчэ дзейнічае па-даўнейшаму, не лічыцца з патрабаваннямі часу, праяўляе марудлівасць, а часам і пасіўнасць у выкананні прамых партыйных і дзяржаўных дырэктыў. Трэба больш настойліва змагацца за тое, каб давесці ў гэтай пяцігодцы ўзровень механізацыі дапаможных, пагрузачна-разгрузачных і іншых работ не менш чым да 70 працэнтаў і вызлабаніць для кваліфікаванай працы значную частку занятых тут рабочых.

Як адзін з важнейшых напрамкаў тэхнічнага прагрэсу, мы разглядаем павышэнне якасці, тэхнічнага ўзроўню, надзейнасці і даўгавечнасці машын, прыбораў, абсталявання і г. д. Цяпер у рэспубліцы многае робіцца ў гэтым напрамку. Партыйныя арганізацыі прамысловых прадпрыемстваў праводзяць вялікую работу ў сувязі з выкарыстаннем сістэмы дзяржаўнай атэстацыі вырабаў. Ажыццяўляюцца комплексы мерапрыемстваў, заснаваных на вопыце саратаўцаў і перадавых прадпрыемстваў Беларусі, укараняюцца рэкамендацыі вучоных па павелічэнні даўгавечнасці дэталей і вузлоў. Значная колькасць вырабаў прамысловасці рэспублікі атрымала Дзяржаўны знак якасці — гэты вышэйшы знак усебаковай дабротнасці.

І ўсё ж нас не можа задаволіць тое, што зроблена. Якасць многіх вырабаў, як гаворыцца, пакідае жадаць лепшага. Не перавяліся яшчэ людзі, якія не даражаць гонарам сваёй заводскай маркі і не праяўляюць сапраўдных клопатаў аб якасці прадукцыі. Друку, тэлебачанню і радыё трэба ўзяць пад абстрэл халтурщыкаў і бракаробаў, праводзіць на прыкладзе ізвесціцаў аб'ектыўнае «рэцэнзіраванне» вырабаў, асабліва тавараў народнага спажывання. Гэта будзе мець вялікае гучанне і значэнне, прынясе несумненную карысць нашай агульнай справе.

Навукова-тэхнічны прагрэс немагчымы без удасканалення кіравання, арганізацыі такой структуры вытворчасці, якая адпавядае сучаснаму ўзроўню развіцця індустрыі, навукі і тэхнікі. Вырашэнне многіх народнагаспадарчых і сацыяльна-эканамічных праблем цяпер па сіле толькі буйным аб'яднанням і камбінатам, якія маюць магутную вытворчую і значную праектна-канструктарскую, навукова-даследчую і эксперыментальную базу.

Цяпер у рэспубліцы функцыянірує больш як сорак прамысловых аб'яднанняў, у саставу якіх уваходзіць каля 13 працэнтаў агульнай колькасці прадпрыемстваў. На іх долю цяпер прыпадае крыху больш як 14 працэнтаў прамысловай прадукцыі. Гэтага, вядома, мала.

Чаму ж марудна ідзе стварэнне вытворчых аб'яднанняў? Адна з прычын у тым, што некаторыя гаспадарчыя органы і ў першую чаргу міністэрствы моцна трымаюцца за захаванне так званай «самастойнасці» сваіх прадпрыемстваў, за старую, зжыўшую сябе структуру кіравання.

Вядома, новае, перадавое само неазбежна праб'е сабе дарогу, бо прагрэс неадольны. Але наш абавязак, у тым ліку і абавязак журналістаў — баявых памочнікаў партыі — заключаецца ў тым, каб не дапускаць самацёку ў гэтай выключна важнай справе, каб усямерна садзейнічаць паскораному пераходу да арганізацыі вытворчасці і кіравання па-новаму. Журналістам пара ўжо глыбей вывучыць першы вопыт вытворчых аб'яднанняў у народнай гаспадарцы, на канкрэтных прыкладах расказаць, якія выгоды дае пераход да прагрэсіўных форм гаспадарання, усямерна садзейнічаць, так сказаць, маральна-псіхалагічнаму павароту нашых гаспадарчых кадраў да больш прагрэсіўных форм і метадаў арганізацыі і кіравання вытворчасцю.

Паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, зразумела, залежыць ад многіх ле складаемых. Але нездарма лічыцца: справа чалавекам ставіцца і чалавекам славіцца. У сучасных умовах тым больш узрастае значэнне суб'ектыўнага фактара — свядомай мэтанакіраванай дзейнасці мільёнаў людзей. Высокая свядомасць, ініцыятыўнасць і адказнасць нашых кадраў, глыбокія веды і кваліфікацыя кожнага работніка, арганізаванасць і дысцыпліна і многія іншыя прывычныя паняцці цяпер набываюць асаблівы сэнс і павінны стаць прычынай для сур'ёзных роздумаў партыйных і дзяржаўных работнікаў, нашых журналістаў-публіцыстаў.

Практыка штодзённа пераконвае ў тым, што на ўчастках, дзе працуюць работнікі, якія творча думаюць, добра падрыхтаваны, не баяцца новага, самыя складаныя задачы вырашаюцца паспяхова і справы, што называецца, ідуць угору. І, наадварот, там, дзе праяўляюцца марудлівасць, непаваротлівасць, коснасць асобных работнікаў, мы нясём буйныя і не толькі матэрыяльныя, але і маральныя выдаткі. У нашы дні «цана» затрымак і памылак, якія дапускаюцца на любым участку, няхай гэта гаспадарчага або культурнага будаўніцтва, рэзка ўзрастае.

Усё гэта абавязвае нас глыбей, больш кваліфікавана займацца праблемай кадраў у шырокім сэнсе гэтага слова, паляпшаць тэарэтычную, у тым ліку эканамічную падрыхтоўку работнікаў, падтрымліваць людзей здольных, шукаючых, павышаць патрабавальнасць за даручаную справу.

Пры гэтым трэба падкрэсліваць, што прад'яўляемыя да работнікаў вытворчасці новыя, больш павышаныя патрабаванні, звязаныя з сучасным навукова-тэхнічным прагрэсам, поўнасцю адпавядаюць гуманістычным маральным прынцыпам, на якіх заснаваецца жыццядзейнасць нашага грамадства, адпавядаюць эканамічным, сацыяльным і культурным задачам будаўніцтва камунізма.

Таварышы! Велізарнае багацце і разнастайнасць тэм адкрывае перад журналістамі аграрная палітыка партыі, усенародная барацьба за інтэнсіфікацыю сельскагаспадарчай вытворчасці. Тут сапраўды вялікае мноства пытанняў, але з усёй іх сумы мне хочацца асабліва выдзеліць праблему далейшага павышэння ўраджайнасці, павелічэння валавых збораў збожжа і іншых сельскагаспадарчых культур. Гэта — ключавое звяно, ад якога ў канчатковым выніку залежыць прагрэс жывёлагадоўлі і ўсёй сельскай гаспадаркі.

У народзе здаўна гавораць, што хлеб — усяму галава. І гэта сапраўды так. Барацьба за высокія ўстойлівыя ўраджаі, за вялікі хлеб на нашых землях стала справай усяго беларускага народа. Пачатак гэтаму закладзены, і пачатак, як вы ведаеце, нядрэнны. Рэспубліка ў гэтым годзе выйшла на рубеж амаль 22 цэнтнераў збожжа з гектара. У наяўнасці несумненны поспех, бо ніколі раней беларуская зямля такіх ураджаяў не давала. Гэты поспех дасягнуты дзякуючы велізарнай дапамозе дзяржавы, якая ўсё лепш забяспечвае сельскую гаспадарку тэхнікай і мінеральнымі ўгнаеннямі, узяла на сябе клопаты аб меліярацыі зямель і многае іншае. На аснове больш шырокага ўкаранення дасягненняў навукі і перадавога вопыту ў рэспубліцы прыкметна павысілася культура земляробства. І як вынік, развенчана бытаваўшае доўгія гады ўяўленне аб тым, што ў Беларусі немагчыма атрымліваць высокія ўраджаі. Сваёй самаадданай працай нашы земляробы даказалі, што справа не толькі ў зямлі, у ступені яе прыроднай урадлівасці, а ў адносінах да яе, у тым, як на ёй гаспадарыць, як нарошчваць прадуктыўную сілу кожнага гектара ворнай зямлі.

Вынік апошніх гадоў пераконвае нас у тым, што пры належным напружанні сіл і максімальным выкарыстанні ўсіх рэзерваў і магчымасцей нашы беларускія калгасы і саўгасы ў стане ў будучым поўнасцю задавальняць патрэбнасці рэспублікі ў збожжы ўласнай вытворчасці. Задача гэта не з лёгкіх. Для таго, каб яе вырашыць, неабходна, як паказваюць разлікі, збіраць штогод амаль 10 мільёнаў тон збожжа. Значыць, пры існуючай у нас сёння структуры пасяўных плошчаў патрэбна атрымліваць да 35 цэнтнераў збожжа з гектара, або па 17 цэнтнераў у разліку на гектар ворнай зямлі. Напомню, што ў гэтым годзе мы атрымалі на гектар ворнай зямлі толькі па 9,3 цэнтнера пры агульнай ураджайнасці амаль 22 цэнтнеры з гектара. Значыць, ніяк нельга задавальняцца дасягнутым. Наадварот, трэба больш патрабавальна і прыдзірліва ацаніць праведзеную работу, глыбока разабрацца ў прычынах, якія пакуль што яшчэ стрымліваюць рост ураджайнасці збожжавых і іншых сельскагаспадарчых культур, узважыць свае магчымасці, ясна ўявіць сабе бліжэйшую і доўгачасовую перспектыву. У гэтых адносінах наша прэса можа і абавязана аказаць партыйным арганізацыям, савецкім і сельскагаспадарчым органам, кіраўнікам і спецыялістам гаспадарак, усім земляробам неацэнную дапамогу.

Гутарка ідзе, перш за ўсё, аб тым, каб пазбавіцца ад бытуючага ў тагосяго пераканання, што мы, маўляў, дасягнулі мяжы ў росце ўраджайнасці і немагчыма з году ў год ле павялічваць. Між тым, факты гавораць не ў карысць такіх малавераў. У мінулым годзе, як вядома, толькі 78 калгасаў і саўгасаў Беларусі намалацілі па 30—40 цэнтнераў збожжа з гектара. Сёлета на гэты рубеж выйшла ўжо 228 гаспадарак, а ў калгасах «Новае жыццё» Карэлицкага і «Рассвет» Навагрудскага раёнаў атрымана на круг звыш 47 цэнтнераў. Больш таго, цэлы шэраг раёнаў атрымаў такі ўраджай збожжавых і іншых сельскагаспадарчых культур, які раней быў даступны толькі асобным перадавым гаспадаркам. Але пакуль што «траката» ва ўзроўнях ураджайнасці застаецца вельмі значнай.

У чым жа прычына? Думаецца, што яна заключаецца ў тым, што некаторыя кіраўнікі ўсё яшчэ ніяк не могуць, а часам і не жадаюць па-новаму ацаніць і па-гаспадарску выкарыстаць наяўныя магчымасці. Яны прывыклі задавальняцца вельмі пасроднымі вынікамі і не імкнуцца турбаваць сябе непазбежнымі клопатамі, звязанымі з барацьбой за багатыя ўраджаі збожжа, ільну, бульбы, агародніны, кармавых культур.

Наш прамы абавязак і адна з важнейшых задач прэсы — частойліва і рашуча пераадольваць у дзейнасці асобных людзей інертнасць, сілу прывычкі, дапамагаць кадрам, калектывам калгасаў і саўгасаў вывучаць і ўкараняць перадавы вопыт, павышаць пачуццё адказнасці перад партыяй і народам за дасягненне самых высокіх рубяжоў у развіцці сельскай гаспадаркі. Падцягнуць адстаючыя гаспадаркі да ўзроўню перадавых — у гэтым наш важнейшы абавязак. У гэтым магутны рэзерв агульнага росту сельскагаспадарчай вытворчасці.

Работнікі друку, тэлебачання і радыё рэспублікі павінны выразна ўяўляць, якой мэты трэба дабівацца. А часам жа бывае, што журналісты з захапленнем распісваюць поспехі іншых калгасаў і саўгасаў, не задумваючыся над тым, наколькі дасягнутае імі адпавядае наяўным магчымасцям, вынікам перадавых гаспадарак рэспублікі, нарэшце, задачам, якія стаяць перад намі. І атрымліваецца часам, што на пічыт славы ўзнімаюць тых, хто яшчэ гэтага не заслужыў.

Прыведу характэрны прыклад. Пінская аб'яднаная газета «Полесская правда» апублікавала 3 жніўня фотарэпартаж пад выразным загалоўкам «Моладзь наперадзе». Гутарка ішла аб калгасе «Шлях Леніна», які, калі верыць газеце, вёў жніво збожжавых ударнымі тэмпамі. Але, па сутнасці справы, чытачы былі дэзарыентаваны. Са зводкі аб ходзе ўборкі збожжавых, апублікаванай той жа самай газетай у наступным нумары, відаць, што калгас быў на апошнім месцы па ўборцы. Праз некалькі дзён зноў канфуз: з'явіўся ў станоўчым плане артыкул пад загалоўкам «На два цэнтнеры вышэй, чым летась» — аб гэтай жа гаспадарцы, якая займае па ўраджайнасці апошняе месца ў раёне.

А ў журналістаў жа «Полесской правды» ёсць выдатная магчымасць прапагандаваць сапраўды перадавы вопыт атрымання высокіх ураджаяў збожжавых. Літаральна побач з Пінскам пачынаюцца землі вядомага ўсёй рэспублікі ордэна Леніна калгаса «Аснежыцкі». Гэта гаспадарка з году ў год павялічвае ўраджаі і валавыя зборы збожжа і сёлета атрымала 43,8 цэнтнера збожжа з гектара. «Аснежыцкі» можа служыць эталонам для калгасаў і саўгасаў рэспублікі. Сюды едуць вучыцца гападарыць. На жаль, журналісты слаба выкарыстоўваюць такую вельмі добрую магчымасць расказаць сваім чытачам, у чым «сакрэт» поспехаў гэтага калгаса, разабрацца, чаму перадавы вопыт слаба ўкараняецца ў гаспадарках, дзе землі не горшыя, а ўраджаі растуць марудна.

Друк, тэлебачанне і радыё павінны арыентаваць людзей на выкананне напружаных планаў і заданняў, на творчы пошук і ініцыятыву ў выкарыстанні рэзерваў, на крытычны аналіз дасягнутага і імкненне ісці далей, дабівацца большага. Між тым, многім работнікам яўна не хапае смеласці і прынцыповасці сказаць кіраўнікам і спецыялістам некаторых гаспадарак. Дарагія таварышы, вось ужо некалькі гадоў запар вы топчацеся на месцы. І тэхнікі, і ўгнаенняў у вас прыбавілася, а ўраджайнасць не расце або расце вельмі марудна. Гэта ж факт, што ў шэрагу гаспадарак запланавалі ўраджайнасць ніжэйшую за ўзровень, дасягнуты ў мінулыя гады, пад выглядам таго, што, маўляў, год на год не прыпадае, і хто яго ведае, як яно атрымаецца. Так могуць рабіць толькі безініцыятыўныя людзі, якія думаюць не па-дзяржаўнаму. Нам патрэбны такія планы і абавязацельствы, якія б найбольш поўна ўлічвалі рэальныя магчымасці калгасаў і саўгасаў, стымулявалі актыўную мэтанакіраваную работу па іх выкананні. Толькі пры гэтай умове можна выйсці на высокія рубяжы.

Цяпер, калі падводзяцца вынікі сельскагаспадарчага года, надзвычай важна самым старанным чынам разабрацца, як працавалі кожная брыгада і кожны вытворчы ўчастак, калгас і саўгас, раён і вобласць, што зроблена сапраўды добра, што новага з'явілася ў ходзе спаборніцтва. Але галоўнае — гэта высветліць, якія дапушчаны промахі, недаробкі, памылкі і што трэба зрабіць, каб іх не паўтарыць. Трэба давесці да свядомасці кожнага, на чым неабходна сканцэнтраваць намаганні на будучых этапах выкачання пяцігодкі, за кошт якіх рэальных рэзерваў мы можам атрымаць важкую прыбаўку ўраджаю ў бліжэйшыя гады. Тут ёсць над чым паразважаць, ёсць да чаго прыкласці вопыт і веды, талент і ўменне як вучоным і практыкам, так і работнікам усёй нашай прэсы.

Грунтоўныя расказы аб сутнасці перадавога вопыту, аб новых дасягненнях сельскагаспадарчай навукі, аб нашых магчымасцях і нявыкарыстаных рэзервах — гэта свайго роду і мабілізуючы стымул, і прадметная школа авалодання «сакрэтамі» высокіх ураджаяў. Але прапаганду перадавога вопыту нельга весці са старых пазіцый, падмяняць агульнымі разважаннямі і дакучлівым паўтарэннем прапісных ісцін. Сказаць, напрыклад, што ўраджай будзе высокім, калі зямлю добра ўгноіць, гэта значыць вольна або міжвольна прыпадобніцца да чахаўскага героя, які з разумным выглядам гаварыў аб тым, што Волга ўпадае ў Каспійскае мора, а коні ядуць авёс. А вось раскрыць прадметна, на канкрэтных прыкладах і фактах, на вопыце лепшых калгасаў і саўгасаў сутнасць арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці на сапраўды навуковай аснове з выкарыстаннем сучасных дасягненняў агратэхнікі, аграхіміі і заатэхнікі, паказаць саюз працы і навукі ў дзеянні — гэта зусім іншая справа. Гэта тое, што патрабуецца. Такая расшыфроўка ланытлівамy розуму сельскага працаўніка пойдзе на карысць.

І яшчэ аб адным першараднай важнасці пытанні хочацца сказаць. Вы, вядома, добра разумееце, што велізарныя поспехі на ўсіх участках камуністычнага будаўніцтва, якімі мы захапляемся і ганарымся, не прыйшлі самі па сабе. Яны заваяваны самаадданай працай рабочага класа, калгаснага сялянства, інтэлігенцыі, усяго нашага народа. За кожным паказчыкам, кожным фактам рэальных дасягненняў стаіць савецкі чалавек, палымяны патрыёт Радзімы, нястомны працаўнік. Людзі працы — творцы ўсіх багаццяў, і ў той жа час яны з'яўляюцца і самым вялікім багаццем нашага сацыялістычнага грамадства. Для вас, журналістаў, гэта найбольш адказная, высакародная і, я сказаў бы, удзячная тэма. Пачуццё глыбокага задавальнення выклікае кожны яркі нарыс, кожны змястоўны артыкул, тэлевізійная і радыёперадача, якія раскрываюць моцныя, валявыя характары, абаяльнасць і ідэйную пераканаасць савецкіх людзей, веліч іх штодзённых спраў і здзяйсненняў.

І ў той жа час нічога, акрамя прыкрасці і засмучэння, не пакідае матэрыял, напісаны сухой, бяспрасной мовай, зроблены па шаблону раўнадушным чалавекам. У такіх артыкулах і перадачах — а іх, на жаль, яшчэ нямала, — не ўбачыш людзей з высокім узлётам іх патрыятычных думак і імкненняў, сапраўднай самаадданасцю ў працы, душэўнай высакароднасцю і прыгажосцю.

Трэба, таварышы, зжываць халодны, безаблічны стыль, смялей і больш рашуча выкараняць штамп са старонак прэсы, не дапускаць дэвальвацыі жывога журналісцкага слова. Сапраўдны журналіст — гэта свайго роду разведчык і новых тэм, і новых чалавечых характараў. І яго абавязак расказаць аб нашых справах і клопатах,

аб нашых слаўных працаўніках з усім запалам свайго сэрца, ярка, даходліва, захапляюча, з партыйнай прынцыповасцю і зацікаўленасцю.

У гэтых адносінах трэба асабліва падкрэсліць неабходнасць далейшага ўдасканалення сацыялістычнага спаборніцтва і асвятлення ўсіх яго аспектаў нашай прэсай.

Людзі старэйшых пакаленняў добра памятаюць, які велізарны пераварот у поглядах на працу ў псіхалогіі мільёнаў працоўных зрабіла сацыялістычнае спаборніцтва ў гады першых пяцігодак. Вестка аб атрыманні «выкліку» на спаборніцтва звычайна хутка аблятала ўвесь калектыў, няхай гэта брыгада, цэх або завод. І раней, чым прыняць такі выклік, калектыў усебакова ўзважваў усе свае вытворчыя магчымасці. Праяўляўся неспакой, ці справімся, ці не асаромімся, ці зможам атрымаць верх. Толькі пасля сур'ёзнага абмеркавання выклік прымаўся, заключаўся дагавор аб сацыялістычным спаборніцтве.

Відаць, нам трэба ў поўнай меры адрадзіць гэту выдатную традыцыю, з улікам новага вопыту і новых задач узбагачаць і ўдасканальваць практыку спаборніцтва, рашуча пазбаўляцца ад усякага роду фармалістычных наслаенняў, якія не-не ды і даюць аб сабе знаць. Бо не сакрэт, што цяпер іншы работнік, а то і ўвесь калектыў спаборнічае не з калегамі па прафесіі, па працы, а нярэдка з «паперай», з тымі абавязацельствамі, якія часам складзены фармальна, без уліку рэзерваў вытворчасці і думкі калектыву. Сям-там бяруць абавязацельствы ніжэй сваіх магчымасцей. Такія абавязацельствы, вядома, не цяжка выканаць і нават перавыканаць. Усё гэта зніжае тонус спаборніцтва, пазбаўляе яго жывога, творчага характару.

Трэба сказаць, што і наша прэса неяк па-кампанейску асвятляе ход спаборніцтва, пытанні яго арганізацыі. У свой час беларускі друк, на наш погляд, больш ярка і пераканаўча расказваў аб гэтым патрыятычным руху мільёнаў, прапагандаваў і падтрымліваў застрэльшчыкаў выдатных пачынанняў у прамысловасці і ў сельскай гаспадарцы, на транспарце і ў будаўніцтве. Кожны месяц, а то і тыдзень публікаваліся ў газетах паведамленні аб ходзе і выніках спаборніцтва абласцей і раёнаў Беларусі, працаўнікоў Мінска і Волгаграда, аднатыпных прадпрыемстваў брацкіх саюзных рэспублік. Цяпер аб гэтым мала пішуць. Са старонак газет, па тэлебачанні і радыё стаў радзей гучаць голас удзельнікаў спаборніцтва. Калі прэса і звяртаецца да гэтай тэмы, то абмяжоўваецца часта толькі кароткай інфармацыяй аб прынятых абавязацельствах і першых водгуках на іх. А асноўнае ж — гэта сам ход спаборніцтва, грамадскі кантроль за тым, як выконваюцца прынятыя абавязацельствы. Працоўныя павінны атрымліваць ясную і пераканаўчую справаздачу аб тым, як і чаму адны дабіліся поспеху, а другія адстаюць. Словам, тут патрэбна самая шырокая публічнасць, гранічная аператыўнасць і поўная параўнальнасць вынікаў. Менавіта на гэта нацэльвае нас пастанова Цэнтральнага Камітэта КПСС «Аб далейшым паляпшэнні арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва». Мы можам і павінны ператварыць спаборніцтва, як таго патрабуе партыя, у магутны інструмент развіцця народнай гаспадаркі, павышэння прадукцыйнасці працы і камуністычнага выхавання мас.

Самай пільнай увагі заслугоўвае рух за камуністычныя адносіны да працы.

На жаль, наша прэса часта фіксуе толькі павярхоўныя факты гэтага руху, не ўнікае глыбока ў духоўны свет разведчыкаў будучыні, слаба раскрывае матывы, якія падахвочваюць да працы, да творчага пошуку.

У некаторых публікацыях і перадачах аднабакова трактуюцца матэрыяльныя стымулы, якім іншы раз надаецца пераўвялічаны, самагодны характар. Усім вядома, што за апошнія гады ў нашай краіне праводзяцца буйныя мерапрыемствы па павышэнні матэрыяльнай зацікаўленасці работнікаў у выніках працы на агульную карысць. Гэта садзейнічае развіццю вытворчай і грамадскай актыўнасці савецкіх людзей, паспяховаму выкананню і перавыкананню народнагаспадарчых планаў. Разам з тым партыя зыходзіць з непарыўнага адзінства матэрыяльных і маральных стымулаў, падкрэсліваючы ўзрастаючае значэнне маральных стымулаў ва ўмовах развітага сацыялістычнага грамадства.

І гэта правільна. Для нас заўсёды і ва ўсім была, ёсць і будзе галоўнай, вызначаючай ідэйная, маральная аснова адносін да працы, грамадства, адзін да аднаго. Вышэйшая мэта эканамічнай і сацыяльнай палітыкі партыі — задавальненне матэрыяльных і духоўных патрэбнасцей членаў грамадства, няўхільны рост народнага дабрабыту, стварэнне ўсіх перадумоў для ўсебаковага развіцця асобы. Аднак мала папулярызаваць ідэю XXIV з'езда аб непарыўным адзінстве і ўсебаковым павышэнні матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця народа. Трэба ўсяляк расшыраць само паняцце «матэрыяльны і культурны ўзровень», фарміраваць разумныя патрэбнасці людзей, усяляк рабіць высакароднымі іх, развенчваць вульгарнамяшчанскія ўяўленні аб жыццёвых каштоўнасцях. Мы — за неабходныя і зручныя рэчы, якія аблягчаюць і ўпрыгожваюць быт чалавека, забяспечваюць яго матэрыяльны дастатак. Але мы — рашуча супраць дробнабуржуазных тэндэнцый да набыцця і назапашвання. Нашым людзям глыбока чужыя як культ аскетызму, так і ўяўленне аб камфартабельным гультайстве як ідэале чалавечага існавання. Гаворачы словамі У. Маякоўскага, мы цэнім вышэй за ўсё «наше советское первородство», высокі прэстыж сацыялістычнага спосабу жыцця, заснаванага на высакародных прынцыпах марксісцка-ленінскай ідэалогіі і камуністычнай маралі.

Мы павінны выхоўваць у нашых людзей пачуццё гордасці за свой савецкі спосаб жыцця, за вялікія заваёвы сацыялізма, які звязаў разам інтарэсы асобы з інтарэсамі ўсяго працоўнага народа. І, як указваў Л. І. Брэжнеў, «рабіць гэта трэба ўпэўнена, пераканаўча, даходліва і ярка».

Сама гераічная гісторыя партыі і народа, наша выдатная савецкая рэчаіснасць, напоўненая пафасам барацьбы і стварэння, нашы светлыя перспектывы і натхнёныя планы — усё гэта выдатны, сапраўдны унікальны матэрыял для выхавання камуністычнай перакананасці, савецкага патрыятызму, велічы духу і культуры пачуццяў у кожнага працаўніка. Трэба сказаць, што наша прэса, тэлебачанне, радыё, усе прапагандысцкія работнікі набылі ў гэтым сэнсе велізарны, незаменны вопыт у дні падрыхтоўкі і святкавання 50-годдзя Вялікага Кастрычніка, 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, паўвекавога юбілею рэспублікі і Кампартыі Беларусі і іншых знамянальных дат.

Нам трэба па-гаспадарску распарадзіцца набытым вопытам, творча развіваць і выкарыстоўваць яго ў прапагандзе гістарычных рашэнняў XXIV з'езда КПСС, пры падрыхтоўцы да 50-годдзя з дня добраахвотнага аб'яднання народаў нашай краіны ў адзіны магутны Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Гэту выдатную падзею савецкія людзі будуць адзначаць як светлае свята ленінскай нацыянальнай палітыкі, брацкай садружнасці народжаных Кастрычнікам сацыялістычных нацый. Неабходна з большым размахам і, самае галоўнае, з вычарпальнай глыбінёй і выразнасцю раскрываць у друку, па тэлебачанні і радыё, усімі сродкамі прапаганды выдатны плён дружбы савецкіх народаў, веліч і трыумф ідэй і прынцыпаў сацыялістычнага інтэрнацыяналізму.

Велізарная сіла і заслуга савецкай журналістыкі ў тым, што яна заўсёды і ва ўсім выступае як страсны, нястомны і актыўны барацьбіт за камуністычныя ідэалы, за ажыццяўленне ленінскай палітыкі партыі. Дзейснасць яе выступленняў вызначаецца многімі фактарамі і перш за ўсё накіраванасцю і зместам публікацый, іх палітычнай актуальнасцю, навуковай абгрунтаванасцю і, калі хочаце, эстэтычнай каштоўнасцю. Багацце нашага жыцця, практыка камуністычнага будаўніцтва адкрываюць перад савецкімі журналістамі сапраўды неабсяжнае поле дзейнасці. Але ў акіяне тэм і праблем трэба ўмець арыентавацца, бачыць рашаючыя, вузлавыя пытанні, каб, як гаворыцца, не гублянь галоўную ніць, «не растекаться мыслью по древу».

Між тым многія рэдакцыі газет і часопісаў, выдавецтваў, тэлебачання і радыё грашаць імкненнем сказаць аб усім, не вычляняючы істотнае ад выпадковага, другараднае ад асноўнага. Яўна часам не хапае паслядоўнасці і ўмення сканцэнтраваць увагу на кардынальных напрамках дзейнасці партыі і народа, на тых праблемах, ад вырашэння якіх залежыць поспех выканання Дырэктыў XXIV з'езда КПСС, заданняў дзевятай пяцігодкі.

Адсутнасць выразнай мэтанакіраванасці ў рабоце рэдакцый, захапленне шматтэм'ем, інакш кажучы, эпізадычнай пастаноўкай розных пытанняў, у тым ліку і такіх, якія не маюць вялікага грамадскага значэння, прыводзіць да распылення сіл нашай прэсы, пазбаўляе яе магчымасці трымаць пастаянна ў фокусе важнейшыя эканамічныя і сацыяльныя задачы, рабіць актыўны ўплыў на іх хутчэйшае практычнае вырашэнне.

Відаць, варта ацэньваць дзейнасць рэдакцыі таго або іншага органа не па колькасці ўзнятых пытанняў, а па здольнасці вызначаць і сістэматычна, з належнай глыбінёй і перакананасцю асвятляць вядучыя тэмы, якія вынікаюць з рашэнняў XXIV з'езда, патрэбнасцей гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. І справа, зразумела, не толькі ў тым, каб своечасова паставіць актуальную праблему. Важна рэалізаваць яе, прасачыць за ажыццяўленнем той або іншай канструктыўнай ідэі, важнай народнагаспадарчай ініцыятывы. Словам, неабходна творча асэнсоўваць рэчаіснасць, бачыць галоўнае ў грамадскім жыцці і адлюстроўваць яго з прынцыповых, ідэйна-вытрыманых, сапраўды навуковых партыйных пазіцый.

Наша прэса мае дастаткова магутныя сродкі ўсталявання новага, перадавога і пераадолення ўсяго коснага, аджыўшага, што перашкаджае руху наперад. У арсенале такіх сродкаў важнае месца належыць крытыцы і самакрытыцы. Гэта дзейсная зброя, і карыстацца ёй трэба ўмела, тым больш журналістам.

Трэба заўсёды памятаць, што любое крытычнае выступленне ў друку, па тэлебачанні і радыё выклікае вялікі грамадскі рэзананс. Тут патрэбны абсалютная дакладнасць, канкрэтнасць, глыбокае пранікненне ў сутнасць фактаў, жыццёвых з'яў, іх правільная палітычная ацэнка. Інакш кажучы, неабходна канструктыўная, я сказаў бы, стваральная крытыка, а не крытыканства.

Калі ў гэтым плане прааналізаваць стан крытыкі ў органах інфармацыі і прапаганды, то звяртаюць на сябе ўвагу прынамсі дзве з'явы. З аднаго боку, у нас ёсць цэлы шэраг выданняў, якія ўсё яшчэ ад выпадку да выпадку, нібы з аглядкай, публікуюць крытычныя матэрыялы, ды і то ў «прычэсаным» выглядзе. Напэўна, кіраўнікі такіх рэдакцый імкнуцца забяспечыць сабе спакойнае жыццё, захоўваючы «нейтралітэт» там, дзе патрэбны рашучасць і прынцыповасць у пастаноўцы вострых пытанняў, у крытыцы недахопаў.

Ёсць і другая крайнасць, калі захапляюцца публікацыяй негатыўных матэрыялаў, якія падаюцца занадта крыкліва, без глыбокай аргументацыі, без належных вывадаў і абагульненняў.

Духу і прызначэнню савецкай прэсы супярэчаць перабольшанне, абыгрываннe фактаў і фактаў у разліку на сенсацыю, падмена крытыкі нізкапробным выскаляннем, разлічаным на абывацеля.

Нельга не сказаць і аб рэагаванні на крытычныя выступленні. Уважлівыя адносіны да іх — гэта важная ўмова ўмацавання аўтарытэту прэсы і паказчык палітычнай сталасці кіраўніка любога ранга. На жаль, мы маем факты, калі асобныя кіраўнікі замоўчваюць крытычныя выступленні або фармальна адпісваюцца.

Вось адзін з такіх прыкладаў. 16 верасня г. г. у «Сельской газете» быў апублікаваны крытычны артыкул «За спіной перадавікоў». У ім адзначалася трывожнае становішча, якое склалася ў Жабінкаўскім раёне Брэсцкай вобласці з нарыхтоўкай кармоў. Тут у многіх гаспадарках не клапоцяцца аб паляпшэнні сенакосных угоддзяў, правалілі закладку сенажу і ў апошнія асенніх дні не спяшаліся папоўніць кармавыя запасы. Сігнал востры і правільны. І тым не менш да гэтага часу кіраўнікі Жабінкаўскага раёна ніяк на яго не адрэагавалі.

Любыя факты такога роду нельга расцэньваць інакш, як своеасаблівую форму зацікання крытыкі, і вінаватыя ў гэтым павінны несці самую строгую адказнасць.

Па-ленінску, па-бальшавіцку паніць сілу партыйнага слова — значыць усямерна ахоўваць і ўмацоўваць аўтарытэт нашай прэсы, павышаць дзейснасць яе выступленняў. Гэта значыць — узмацняць партыйнае кіраўніцтва ўсімі інфармацыйнымі службамі, пастаянна клапаціцца аб умацаванні рэдакцый газет, часопісаў, выдавецтваў, тэлебачання і радыё кваліфікаванымі, палітычна сталымі работнікамі. Гэта значыць усяляк садзейнічаць стварэнню ў калектывах журналістаў творчай атмасферы, узаемнай патрабавальнасці, разгортванню ўнутры Саюза журналістаў прынцыповай крытыкі і самакрытыкі.

Журналісцкая справа — клопаты агульнапартыйныя. Кампартыя Беларусі, Цэнтральны Камітэт лічаць сваім абавязкам узмацняць патрабавальнасць да партыйных камітэтаў за кваліфікаванае і штодзённае кіраўніцтва ўсімі органамі інфармацыі і прапаганды.

У актыве журналісцкай арганізацыі рэспублікі — багацейшы вопыт і бясспрэчныя дасягненні. Але творчаму парыву і пошуку няма мяжы. Дазвольце мне, таварышы, у заключэнне выказаць упэўненасць, што вялікі атрад журналістаў рэспублікі, натхнёны рашэннямі XXIV з'езда КПСС, будзе працаваць яшчэ лепш, з яшчэ большым напружаннем сіл і энергіі і пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый памножыць свой уклад у вялікую справу ўсенароднай барацьбы за ажыццяўленне прадвызначэнняў партыі, за перамогу ідэалаў камунізма ў нашай краіне. **(Бурныя апладысменты).**

БЕЛАРУСЬ ІНДУСТРЫЯЛЬНАЯ.

Агульны выгляд Магілёўскага завода сінтэтычнага валакна.

Фота М. ЖАЛУДОВІЧА. (БЕЛТА).

Набліжаецца галоўная падзея ў культурным жыцці краіны — святкаванне 150-годдзя з дня нараджэння вялікага рускага народнага паэта М. А. Някрасава. Творы выдатнага майстра слова заўсёды былі папулярныя на Беларусі, яны неаднаразова перакладаліся на нашу мову. Вось і цяпер, напярэдадні юбілею, у выдавецтве «Беларусь» выходзіць з друку зборнік выбраных вершаў і паэм М. А. Някрасава ў новых перакладах лепшых беларускіх паэтаў. Прапануем чытачам некаторыя з гэтых перакладаў.

М. А. НЯКРАСАЎ

РОЗДУМ ЛЯ ПАРАДНАГА ПАД'ЕЗДА

Вось парадны пад'езд. У святочныя дні,
Апантаны халопскай знямогай,
Прыязджае ўвесь горад з трывогай
Да дзвярэй, поўных гоману і мітусні.
Запісаўшы імя сваё, званне,
Едуць госці дамоў чарадой,
Задаволеныя ўсе сабой,
Быццам бы — ў гэтым іх і прызванне!
А ў звычайныя дні ля пад'езда заўжды
Пражакцёры, удовы таўпяцца,
І нябогі, якія прыходзяць сюды
Атрымаць ці пасаду, ці працу.
То туды, то ізноўку назад стрымгалоў
Ўсе кур'еры з паперамі скачуць.
Часам нехта вяртаецца з песняй дамоў,
Але большасць прасіцеляў плача.
Бачыў раз, як сюды мужыкі падышлі,
Спрацаваныя рускія людзі,
На царкву памаліліся, сталі ўдалі,
Апусціўшы галовы на грудзі.
Паказаўся швейцар. Просяць:
«Дапамажы».
Словы поўны надзеі і мукі.
Глянуў той. Непрыгожыя, што ні кажы!
Загарэлыя твары і рукі,
Світка зношаная на плячах,
Што ад торбы дарожнай сагнуты,
Крыж на шыі і кроў на нагах,
У лазовыя лапці абутых.
(Знаць, цягнуліся доўга яны
З нейкіх самых далёкіх губерняў).
Нехта крыкнуў швейцару: «Гані!
Наш не любіць абношанай чэрні!»
Хтось яшчэ ля дзвярэй пастаяў,
Потым кайстры свае развязалі,
Ды швейцар нат гасцінца не ўзяў,
І пайшлі яны, бедныя, з жалем:
«Хай яго лепш не ведае бог!»
Безнадзейна разводзячы рукі,
Покуль позірк мой бачыць іх мог,
Шапкі зняўшы, брылі яны брукам.

А ўладар у палацы сваім
Яшчэ спаў сном глыбокім, глухім.
Ты, што лічыш зайздросным жыццём
Захапленне гульнёй і віном,
Бессаромнасць, ліслівасць пустую,
Абудзіся! Вярні іх з дарогі!
Акажы бедакам дапамогу!
Ды шчаслівы сумлення не чуе...

Што табе ўсе грымоты нябесныя,
Калі ты не баішся зямных.
І нясуць сваё гора няўцешнае
Людзі гэтыя ў сэрцах сваіх.
Што табе іх пакуты бязвінныя
І як гэтыя людзі жывуць?
Дні твае, быццам свята няспыннае,
Нат ачуцца табе не даюць.
І нашто? Грамацеяў забаваю
Ты народнае шчасце завеш;
Без яго пражывеш ты са славаю
І са славай памрэш!
Бесклапотнай аркадскай ідыліяй
Абарвуцца старэчыя дні:
Пад блакітамі неба Сіцыліі
У духмяных аліў цішыні.
Будзеш бачыць, як сонца вячэрняе
Апускаецца ў мора Міжземнае
І праменні на ім зіхацяць,—
Загайданы пявучымі хвалямі,
Звонам іх, ты заснеш, — як дзіця,
Пад апекай сваіх не разжаленых,
А абрадаваных сваякоў
(Што, нарэшце, канца дачакаліся);
Прывязуць цябе потым дамоў,
Памянуць цябе трызнай багатай
І засыплюць магілу... герой,
Ціха ўсёю айчынай праклятый,
Узвялічаны гулкай хвалой.
Зрэшты, што ж мы асобу такую
Непакоім з-за простых людзей.
Мо на іншых спагнаць злосць крутую! —
Беспячней... А яшчэ весялей
У другім чым знайсці уцяшэнне...
Не бяда, што пацерпіць мужык:
Розум кажа, пра гэта здарэнне
Памаўчаць лепш... ды ён жа прывык!
На прадмесці ў харчэўні убогай
Ўсё прап'юць бедакі да рубля
І пайдуць жабраваць па дарогах
І застогнуць... Радзімы зямля!
Назаві мне мясціну пад сонцам,
Я такое яшчэ не спазнаў,
Дзе б твой сейбіт і твой абаронца,
Дзе б твой рускі мужык не стагнаў?
Стогне ён на палях і дарогах,
Стогне ён па ўсіх турмах, астрогах.
Скуты путамі ў шахце сырой;
Стогне ён пад асеццю, пад стогам,
Сярод стэпу начною парой;
Стогне ў хаце гнілой, у адрыне,
Ад сваіх горкіх думак і сноў,
Стогне ў кожнай забытай мясціне,
Ля пад'езда палацаў, судоў.
Стань над Волгай. Чый стогн раздаецца
Над вялікаю рускай ракой?
Гэты стогн у нас песняй завецца —
Там ідуць бурлакі грамадой!..
Волга! Волга! Вясной мнагаводнай
Ты не так заліваеш палі,
Як вялікай журбою народнай
Перапоўнены нетры зямлі!
Дзе народ, там і стогн не сціхае.
Што ж, гаротнік, твой стогн азначае?
Ці ж ты сілы свае загубіў,
Ці пакорны ты лёсаў закону,
Ўсё магчымае ажыццявіў, —
Даў падобную песню да стогну,
Назаўсёды духоўна спачыў?..

Пераклаў М. ТАНК.

●

Душна! без волі панура,
Ноч гэта будзе дакуль?
Хай бы ўжо грымнула бура, —
Чаша запоўна пакут!
Грымні над хвалямі мора,
Лес абудзі і палі,
Чашу народнага гора —
Грымні, — разлі!..

●

Неўзабаве з жыццём развітанне.
Добра мёртвым, ды страшна канаць;
Нічыйго не прашу шкадавання,
Дый не будзе каму шкадаваць.

Я дваранскаму нашаму роду
Бляску лірай сваёй не прыдбаў,
Але гэткі чужы я народу
Паміраю, як жыць пачынаў.

Сувязь дружбы парвана сардэчнай,
Цяжкі лёс мне з дзіцячых гадоў
Ворагаў пасылаў даўгавечных,
Барацьба забірала сяброў.

Не дасяглі жаданае мэты,
Палі здрады ахвярай яны,
І з дакорам цяпер іх партрэты
На мяне ўсё глядзяць са сцяны.

Пераклаў Ал. РУСЕЦКІ.

У МІНІСТЭРСТВЕ КУЛЬТУРЫ БССР.

ВЫХОЎВАЦЬ АТЭІСТАЎ

Калегія Міністэрства культуры БССР прыняла пастанову аб мерапрыемствах, накіраваных на атэістычнае выхаванне насельніцтва. Абласным і мінскаму гарадскому ўпраўленням, раённым і гарадскім аддзелам культуры прапанавана разгледзець пытанне аб стане атэістычнага выхавання насельніцтва і распрацаваць канкрэтныя планы па ўмацаванні антырэлігійнай работы ва ўсіх установах культуры, звярнуць асаблівую ўвагу на атэістычнае выхаванне рабочай, сельскай і вучнёўскай моладзі, на індывідуальную работу з веруючымі.

У культурна-асветных установах прадугледжваецца сістэматычна праводзіць гутаркі, лекцыі, дыспуты, вечары пытанняў і адказаў, бібліяграфічныя агляды, канферэнцыі чытачоў, выступленні калектываў мастацкай самадзейнасці і іншыя масавыя мерапрыемствы на антырэлігійныя тэмы, шырэй выкарыстоўваць творы кіно, выяўленчага мастацтва, дыяфільмы. Да канца года будуць абноўлены наглядная агітацыя па навукова-атэістычнай тэматыцы, кніжныя паліцы, вітрыны, куткі атэіста. У гарадскіх і раённых аддзелах культуры намечана стварыць гарадскія і раённыя перасоўныя антырэлігійныя выстаўкі для дэманстрацыі іх на прадпрыемствах, у навучальных установах, калгасах, саўгасах. Клубы стануць месцамі правядзення сучасных абрадаў — рэгістрацыі шлюбаў, нараджэнняў, уручэння пашпарта, прысвячэння моладзі ў рабочыя або хлебаробы, провадаў у армію, на пенсію. Палепшыцца арганізацыя масавых народных святаў зімы, вясны, ураджаю, Дня работнікаў сельскай гаспадаркі і інш.

Музеям рэспублікі прапанавана ўзмацніць работу па прыродазнаўча-навуковай і атэістычнай прапагандзе, шырэй практыкаваць правядзенне мэтавых экскурсій на атэістычныя тэмы, стварыць пастаяннадзеючыя перасоўныя антырэлігійныя выстаўкі і накіраваць іх для паказу ў сельскія культасветустановы.

Намечана ажыццявіць многія іншыя мерапрыемствы.

У СЯМ'І АДЗІНАЙ

ГОСЦІ З ЛІТВЫ

Саюз кінематаграфістаў Беларусі да 50-годдзя з дня ўтварэння СССР арганізуе цыкл вечароў, прысвечаных кінематаграфіям усіх саюзных рэспублік.

Днямі адбыўся першы вечар гэтага цыкла. Яго адкрыў сакратар праўлення Саюза кінематаграфістаў БССР рэжысёр Ігар Дабралюбаў. Пра развіццё літоўскага кіно беларускім калегам расказаў першы сакратар праўлення Саюза кінематаграфістаў Літвы, заслужаны дзеяч мастацтваў і лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Літоўскай ССР кінарэжысёр Райманда Вабалас, пастаноўшчык вядомых мастацкіх кінакарцін «Крокі ў ночы», «Лесвіца ў неба», «Марш-марш гра-та-та» і іншых.

Затым адбылася прэм'ера і абмеркаванне фільма рэжысёра Р. Вабаласа «Камень на камені», які прысвечаны барацьбе прыгонных літоўскіх сялян супраць самавольства і прыгнёту памешчыкаў. Кінакарціну здымаў выдатны кінаператар Іонас Грыцюс (яго папярэднія стужкі «Ніхто не хацеў паміраць», «Гамлет», «Кароль Лір»). У ёй прымаюць удзел вядомыя акцёры Р. Адамайціс, К. Віткус, Г. Карка, В. Бледзіс, А. Матуленіс, якія, дарэчы, не раз здымаліся і ў беларускіх кінатворах.

У сваю чаргу госцю з Літвы былі паказаны і разам з ім абмеркаваны дакументальныя стужкі вытворчасці аб'яднання «Летаніс», Р. Вабалас, у прыватнасці, высока ацаніў фільм сцэнарыста і рэжысёра Віктара Дашука «Дом».

Наступныя вечары будуць прысвечаны кінамастацтву Латвіі, Узбекістана, Кіргізіі, Таджыкістана. У бліжэйшы час у Казахстан, на Украіну і іншыя братнія рэспублікі з новымі фільмамі выязджаюць групы беларускіх кінематаграфістаў.

І. РЭЗНІК,
метадыст Саюза кінематаграфістаў БССР.

ПАМЯЦІ М. А. МІНКОВІЧА

Савет Міністраў БССР прыняў пастанову аб увекавечанні памяці міністра культуры БССР Міхаіла Аляксандравіча Мінковіча. Яго імя прысвоена бібліятэцы № 10 г. Мінска. Яна надалей будзе называцца: бібліятэка № 10 імя М. А. Мінковіча.

БЕЛТА.

Новыя назвы на афішах

Калектыў Рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага паказаў новы спектакль — «А зоры тут ціхія...» паводле аднайменнай аповесці Б. Васільева. Інсцэніроўка Ю. Любімава і Б. Глаголіна, паставіў спектакль заслужаны артыст РСФСР Ю. Любімаў, рэжысёр Б. Глаголін, мастакі А. Бароўскі, Л. Дзетар, музычнае афармленне Ю. Буцко.

На здымку — сцэна са спектакля.

Фота Ул. КРУКА.

ПАМФЛЕТ

Алесь БАЖКО

ЕЛІ, ЕЛІ «САЛАДУХУ»...

ІХ АБСТРАЛЯЛІ з Нью-Йорка. Знянацку, як ваўкоў або шакалаў. Асколкі магутных газетных «ракет» і «снарадаў», нацэленых на Вашынгтон, шыбанулі і па яго радыёрупарах — «Голасе Амерыкі», «Свабодзе», «Вольнай Еўропе»...

У так званай «беларускай» рэдакцыі «Свабоды» якраз стрыглі інфармацыі з нашых газет, падтасоўвалі іх на ўласны манер і цягнулі ў свае панылыя і ўбогія радыёперадачы пра жыццё ў Савецкім Саюзе. Нехта запрапанаваў яшчэ больш падчарніць іх вытрымкамі з пісьма калінінградскай спекулянткі Доры Калядзінскай, якой бессардэчныя бальшавікі цынічна забараняюць ехаць у Ізраіль да сваёй радні. Але шэф рэдакцыі запярэчыў. Мабыць, ён рашыў, што Дора Калядзінская — даўно пройдзены этап у іх беспардоннай хлусні. На рэдакцыйны стол леглі паведамленні заходнееўрапейскіх тэлеграфных агенцтваў пра новыя прыгоды «геніяльнага» Тарсіса, які па-здрадніцку пакінуў Радзіму разам са сваёй нікчэмнай пісанінай. Не менш «цікавымі» былі паведамленні і пра Кузняцова. Гэты таксама папрацаваў на буржуазную прапаганду, выкленчыўшы ў англічан права на здрадніцкую дзейнасць у Лондане.

Да гэтай інфармацыі можна было дадаць і паведамленні з Бруселя, дзе сіяністы тры дні запар пратэставалі, як яны брахалі, супраць «пагалоўнага праследавання» яўрэяў у нашай краіне. Было не было, але лямант нарабілі. Затое аб тым, што верхаводы Ізраіля кожны дзень здзекуюцца з арабаў, гэтыя крыкуны, канечне, нават і не пікнулі.

Не адважылася нічога вартага ўвагі сказаць пра гэта і «Свабода». Хопіць і таго, што яны пратэстуюць. Сіяністы выбіваюцца ў авангард антысаветчыкаў, таму «Голасу Амерыкі», «Свабодзе», «Вольнай Еўропе» загадана ўслаўляць іх «подзвігі». Невыпадкова яшчэ ў жніўні 1953 года па ініцыятыве Дуайта Эйзенхаўэра, тагачаснага гаспадара Белага дома, было створана інфармацыйнае агенцтва — ЮСІА, у якім цяпер завіхаюцца каля 12 тысяч чалавек. У сто адной краіне свету яны збіраюць звесткі, надаюць ім адпаведную афарбоўку і на гэтыя ж краіны трансліруюць па радыё, перадаюць па тэлебачанні, рассылаюць у спецыяльных прэс-бюлетэнях.

Яўна тэндэнцыйная спекуляцыйная інфармацыя перадавалася з франтоў так званай «в'етнамскай кампаніі». «Свабода» трансліравала гэтую ідэалагічную «саладуху» на Савецкі Саюз і краіны народнай дэмакратыі. Больш за 1 500 чалавек — наймітаў капіталістычнай радыёбрахалаўкі — карміліся ёю і вялі супраць нас падрыўную работу.

І раптам... О, гэта сапраўды быў страшэнны ўдар! Страшнейшы за выбух фугаснай бомбы. Яго можна было б неяк перажыць, схаваўшыся за шырокія плечы містэра Хэлмса, дырэктара Цэнтральнага разведвальнага ўпраўлення ЗША. А тут і ён яшчэ не ведае, ці ўтрымаецца на сваім крэсле. І ўсё з-за таго, што 13 чэрвеня 1971 года — аказваецца, сапраўды ёсць нешчаслівыя даты — амерыканская газета «Нью-Йорк таймс» выйшла, нашпігаваная звышсакрэтнымі дакументамі Пентагона, якія сарвалі маску з вашынгтонскіх палітыканаў, паказалі, чаго яны варты, як ашуквалі свой народ, увесь свет і нажывалі мільёны.

Кажуць, што пасля гэтага сумнага выпадку ў шэфа ЮСІА Фрэнка Шэкспіра на некалькі дзён адзеравянеў язык. Анямелі, разгубіліся і яго калегі па распаўсюджванні хлусні на радыёстанцыях «Голас Амерыкі», «Свабода» і «Вольная Еўропа». Гэта проста цуд, што яны ўцалелі. Елі, елі небаракі саладуху і... абкіпаліся. Цяпер ужо ніякім шпінінарам не адмыюцца яны, хоць, як вядома, ад іх і так несла нячыстым — людзі выключалі радыёпрыёмнікі і пляваліся.

Дагаджаючы Ніксану і яго аднадумцам у Пентагоне, Фрэнк Шэкспір выдаў на-гара свой дакументальны фільм «В'етнам, В'етнам!». У Пентагоне паглядзелі яго, і спачатку ўсе павесялелі. Нехта нават дзіка зарагатаў ад захаплення: вынаходлівы кароль хлусні даказваў гэтай кінастужкай, што амерыканцы не наступаюць, а абараняюцца ў В'етнаме. А калі так, значыць, яны не ворагі, а сябры мясцовых абарыгенаў. Агрэсіяй там і не пахла. Калі хто і пагражае В'етнаму, дык гэта самі в'етнамцы. Тыя, што яшчэ не скарыліся. Але яны будуць разбіты. Адсюль і шытая белымі ніткамі мараль: палітыка Вашынгтона — адзіна правільная. Аспрэчваць гэта могуць толькі самі амерыканскія вайскоўцы і іх саюзнікі па крывавых расправах у Індакітаі.

Аднак у самы разгар прагляду гэтай кінакамедыі Фрэнку Шэкспіру сказалі: вы перастараліся, шаноўны! Такія кінабаевікі цяпер небяспечна дэманстраваць у Амерыцы. Перш займіцеся газетай «Нью-Йорк таймс», дакажыце, што яна вар'ятка.

Даказаў бы, ды гэта цяжка было зрабіць. «Нью-Йорк таймс» — адна з найбольш інфармаваных буржуазных газет ЗША. І выходзіць яна тыражом 800 тысяч экземпляраў. Хіба тое, што яна тады апублікавала, можна было перахапіць і ўтаіць ад шырокай грамадскасці? Фрэнк Шэкспір не верыў у такі цуд. Праз якую гадзіну ён ужо бушаваў у сваёй канторы — рабіў неабходныя захады, каб утрымацца на палітычнай арэне. Але «Нью-Йорк таймс» зноў абстраляла Вашынгтон з цяжкай газетнай артылерыі. Аб чым думалі рэдактары яе? Як яны адважыліся запусціць свае памаўзлівыя рукі ў самыя глыбокія сховы Пентагона і выцягнуць адтуль звышсакрэтныя дакументы? А яны б'юць і па інфармацыйным агенцтве, якое гадамі ўслаўляла амерыканскую агрэсію ў Індакітаі.

Так, цяпер ужо ніхто не сумняваўся, што Злучаныя Штаты самі справакавалі вайну ў Індакітаі. Ды ніхто гэтага і не аспрэчваў, настолькі важкія і неабвержныя былі тыя публікацыі. Гаспадары Белага дома, крыху ачомаўшыся, аж заходзіліся ад злосці, даведаўшыся, што сакрэтныя дакументы перадаў газеце не які-небудзь малады недасведчаны клерк, а добра знаёмы ім прафесар Даніэл Элсберг, супрацоўнік цэнтра міжнародных даследаванняў Масачусецкага тэхналагічнага інстытута. Няўжо ён быў заадно з палахлівымі «галубамі»? Не, Даніэл Элсберг сімпатызаваў «ястрабам», верыў у неабходнасць вайны ў В'етнаме. Але ён не людаед, а звычайны амерыканец, ненавіснік палітычных інтрыг і падману.

Я прыводжу гэтыя агульнавядомыя факты з нашага друку дзеля таго, каб чытачу лягчэй было зразумець, якую непрыглядную пазіцыю займалі тады «Свабода» і «Вольная Еўропа». У іх не хапіла «аб'ектыўнасці» падтрымаць працаўнікоў бруднай вайны ў В'етнаме. А сіяністаў — падтрымалі, хоць добра ведаюць, што яны не лепшыя за нацыстаў.

Дора Калядзінская... Тарсіс... Анатоль Кузняцоў. На гнілыя цялячыя мазгі разлічана гэтая радыёгульня ў «лаві злодзея». Шкада, што ў ваколіцах «Свабоды» і «Вольнай Еўропы» няма сцяны плачу. Мюнхенскія плаксуны даўно перапланулі б не толькі сваякоў Доры Калядзінскай, але і самога Залмана Шызара, шаноўнага прэзідэнта Ізраіля. Той у разгар лютай паліцэйскай расправы над мірнымі дэманстрантамі на плошчы Сіён у Тэль-Авіве галасіў каля «сцяны плачу»... па злачынцах, якія напшкодзілі ў СССР і атрымалі за гэта па лапах.

Ад Залмана Шызара набралася жалю і газета «Ал-Гамішмар». Яна, усхліпваючы, аб'явіла суайчыннікам, што «савецкія ўлады разгарнулі ледзь не па ўсім Саюзе д'ябальскую кампанію» працэсаў.

Потым у Тэль-Авіў нечакана завітаў галоўны абаронца «ўсіх пакрыўджаных» — яго светласць Рычард Хэлмс, шэф ЦРУ. Разам з ім з авіялайнера тыпу «Боінг» высадзілася цэлая гайня «давераных супрацоўнікаў». Чаго яны сарваліся з насіджаных крэслаў у Ленглі (штаб-кватэра ЦРУ каля Вашынгтона), ніхто дакладна не ведаў. Высокі госць моцна трымаў язык за зубамі. Можна было нават падумаць, што яго заваражылі або напалохалі палесцінскімі партызанамі. Яны доўга не валаводзіліся б з гэтым «міратворцам». Але гаспадары паднялі на ногі ўсю службу бяспекі, і праз колькі дзён увесь свет ужо ведаў (аб гэтым пастараўся містэр Шэкспір са сваімі малойчыкамі), што Хэлмс цішком сустракаўся з Г. Меір, М. Даянам і А. Эбанам, што ў Тэль-Авіў яго паслаў асабіста прэзідэнт Ніксан, забяспечыўшы пры гэтым асобымі паўнамоцтвамі.

Не цяжка здагадацца, аб чым гэтыя паны шапталіся ў Тэль-Авіве. Ізраілю патрэбны грошы і ўзбраенне для абароны «яго» граніц на акупіраваных землях Іарданіі, Сірыі, Егіпта, Палесціны, а Злучаным Штатам — плацдарм для ваенных і палітычных інтрыг у раёне Міжземнага мора.

На ваеннай базе Шарм-аш-Шэху ў аднаго высокапастаўленага тэльавіўца пачаўся прыступ ваеннай істэрыі. Кажуць, гэта быў Мошэ Даян, якому сняцца новыя крывавыя паходы. Але Хэлмс тузануў самсселага авантурыста за крыса мундзіра і сказаў, што пакуль не можа гарантаваць Ізраілю хуткай перамогі над арабамі.

Варта нагадаць мюнхенскім «сябрам падняволеных народаў», што лёгкія да слёз лідэры Ізраіля, напэўна, толькі зларадна ўсміхаліся, калі зайшла гаворка пра абрабаваных да ніткі палесцінскіх арабаў. Дзікуны-анучнікі выганялі іх з гарадоў і вёсак у неабжытыя мясціны. Гэта ж ненавісныя гоі, іх можна страляць, паліць напалмам, гнаіць у астрогах і канцэнтрацыйных лагерах. На адабраныя ў іншаверцаў землі прыедзе рабіць свой гешэфт пані Дора Калядзінская. Над уваходам у кнесет Ізраіля даўно красуецца надпіс на старажытнаяўрэйскай мове: «Яўрэй, твая радзіма ад Ніла да Еўфрата». А калі гэта так, дык чаго ёй было сядзець у тым старажытным прыгожым, але няўтульным для яўрэйскіх арыек Калінінградзе. Бедная, няшчасная пакутніца. Бальшавікі нават не спрэзентавалі ёй халадзільніка на дарогу. Пад яго абшыўку можна было б схаваць усё тое золата, якое Калядзінская мерылася нелегальна пераправіць за граніцу.

Не наступайце на мазоль і «геніяльнаму» Тарсісу. Ён крыху падлячыўся ў псіхіятрычнай бальніцы ды зноў раздае аўтографы, заклікаючы да гэтага і Анатоля Кузняцова, свайго аднадумца і калежку па здрадзе. Ёсць чутка, што іх партрэты красуюцца ледзь не ва ўсіх літаратурных салонах Тэль-Авіва.

Толькі дарэмна там носяцца з гэтымі адшчапенцамі. Нікому яны не патрэбны на Захадзе. Асабліва цяпер, калі ўсім стала ясна, што гэта за птахі. Тарсіса, якому пасля перапалкі з «ненажэрнымі» парыжскімі выдаўцамі «нагарэла ў галаве», неўзабаве зноў запратораць у бальніцу. А нованарачоны мас'е Анатоль (Кузняцоў прасіў, каб яго так называлі) будзе ціха сядзець, як пацук пад венікам, у адным з лонданскіх прытонаў ЦРУ. Спрытны «раманіст» прырабляе там на дробных падрадах — дапамагае нейкаму Фількенштэйну расстаўляць сілкі на савецкіх турыстаў.

Вядомы рускі паэт Яўген Еўтушэнка, які добра ведае Кузняцова, гаворыць, што гэта — копія дзікенсаўскага Урыя Гіпа, якому ўсё адно, дзе жыць, з кім дружыць, абы не адганялі ад стала і не скупіліся на чаявыя.

КІНО

АГНЁМ І КУЛЯМІ ВЫПАЛЕНА

ФІЛЬМ БЕЛАРУСКАГА ТЭЛЕБАЧАННЯ «ЯШЧЭ ГАРЫЦЬ ХАТЫНЬ»

Трагедыя Хатыні, трагедыя сотняў загінуўшых вёсак... Пра гэта не перастаюць думаць, гаварыць, пісаць, здымаць фільмы. Словы жалобныя і гнеўныя, словы-набаты, словы-званы, словы-стогны, словы, што жахлівым камяком застраюць у горле, болем і смуткам вырываюцца з грудзей і гучаць над планетай, бо ўсё яшчэ гарыць Хатынь.

Фільм Беларускага тэлебачання «Яшчэ гарыць Хатынь» — трэці, што зроблены на гэтую тэму ў рэспубліцы. Два папярэднія — «Боль мой — Хатынь» (рэжысёр П. Аліфярэнка) і «Хатынь, пяць кіламетраў» (рэжысёр І. Калоўскі) — здымаліся ў аб'яднанні «Летапіс» студыі «Беларусьфільм».

Нядаўна ў Славакіі адбыўся Міжнародны фестываль тэлевізійных фільмаў для дзяцей і моладзі. Ён праходзіў пад дэвізам «За прагрэсіўныя адносіны дзяцей і моладзі да жыцця». Адным з нямногіх фільмаў на антываенную тэму быў савецкі «Яшчэ гарыць Хатынь», паказаны, на жаль, па-за конкурсам. Маркуючы па водгуках, якія з'явіліся ў друку, ён мог атрымаць адзін з прызоў гэтага пачэснага фестывалю. Вось што пісала ў тыя дні браціслаўская газета «Праўда»: «Жахлівая гісторыя беларускай вёскі, адной з сотняў знішчаных фашыстамі, будзіць сумленне кожнага гледача і вымушае задумвацца пра бесчалавечнасць войнаў, пра лёс іх ахвяр».

Павольнай цяжкай ходай вядуць нас стваральнікі фільма «Яшчэ гарыць Хатынь» (аўтар сцэнарыя А. Вялюгін, рэжысёр А. Колас, аператар В. Хайцін) па зямлі, на якой стаялі хаты, жылі людзі. Як усе людзі на зямлі, яны чакалі шчасця, вялікага і маленькага, працавалі, марылі, спадзяваліся... І раптам сакавіцкай раніцай 1943-га ўсяго гэтага не стала. Сто сорак тры чалавекі згарэлі жывымі. Старэйшаму было семдзесят гадоў, малодшаму — сем тыдняў... Сто сорак тры чалавекі згарэлі жывымі. Сто сорак тры чалавекі...

Кроў стыне ў жылах... Міжволі прыгадваюцца радкі з паэмы А. Вярцінскага «Даруйце!», радкі, якія, бадай, маглі б стаць эпіграфам да фільма: «Плывуць вашы цені ў чужыя сусветы... Дзе вашы целы, дзе вашы твары? Плывуць вашы цені... Ахвяры, ахвяры!» Як немагчыма зразумець, што такое бясконцасць, так немагчыма ўявіць, як людзі знішчаюць людзей. Тое, што здарылася, нельга апісаць словамі — няма такіх слоў. І нельга зняць на плёнку — немагчыма зняць жах, боль, смерць. Немагчыма... Гэта разумеюць аўтары фільма, таму яны гранічна стрыманыя ў сваім расказе (толькі тэкст, здаецца, чытаецца надта ўзнёсла і ўрачыста, хацелася б, каб Павел Кармунін рабіў гэта менш «артыстычна»). Яны не спрабуюць абудзіць у нас пачуцця аптымізму ў канцы фільма: тых, каго няма, — няма. Ніхто, нішто не можа вярнуць іх да нас. Нават памяць. Пра гэта таксама з бязмежным болем гавораць стваральнікі стужкі. Але той, хто жыве, павінен памятаць. Перад намі на экране сведкі злачынстваў у Хатыні і іншых спаленых вёсках.

— Кроў лілася ручаём, снег чырвоны быў...

— Так і сканаў сын на руках у мяне, так і сканаў на руках...

— Няма партрэтаў Мішы — яшчэ не здымалі. Пяць гадочкаў было... Калі расстрэльвалі, ён пабег. Але кулі яго дагналі...

— Сто іх там было. Адны бабы ды дзеткі малыя. Хату аблілі і падпалілі. Усе згарэлі... Вось як...

— Сто трыццаць шэсць вёсак загінулі разам з людзьмі.

На экране твары, твары, твары. Маладыя — яны нарадзіліся пасля вайны, і старэйшыя, што перажылі вайну: студэнты, лётчыкі, дзяржаўныя дзеячы, вучоныя, рабочыя.

Трыццаць гадоў таму разыгралася хатынская трагедыя ў Беларусі. Яна паўтарылася ў Францыі, яна паўтарылася ў В'етнаме.

Звоняць хатынскія званы—спыніцеся! Крычаць на ўсе галасы шыльдачкі з імёнамі загінуўшых — спыніцеся! Бацька нясе на руках мёртвага сына. Гады нясе. Дні і ночы. У спякоту і дождж. Спыніцеся! Гэта вельмі важна—спыніцца, гавораць аўтары фільма. Спыніцца і задумацца. Лёс чалавецтва залежыць ад кожнага з нас. Ад усіх нас. Спыніцеся.

Жыццё працягваецца. У жыцця няма канца. Мы жывём і нават не прыкмячаем, якія мы шчаслівыя. Дыхаць, глядзець на неба, раджаць дзяцей, складаць вершы, расціць збажыну — гэта, відаць, і ёсць сапраўднае шчасце, калі падумаць...

Але была вайна. І зараз ідзе вайна. І недзе там, па-за межамі нашай краіны, тоіцца вайна. Давайце памятаць пра гэта. Немагчыма, каб Хатынь паўтарылася.

Хай даруюць мне стваральнікі стужкі «Яшчэ гарыць Хатынь», што ў гэтай маленькай рэцэнзіі на фільм нічога не гаварылася пра ўдалыя і няўдалыя планы, пра спецыфіку тэлефільма, пра пошукі тэлевізійнасці пра стыкоўкі і перабіўкі, пра ўважлівую камеру аператара. Хай даруюць мне за тое, што я наогул гаварыла не пра фільм, а пра тыя пачуцці, якія ён выклікае. Мне здаецца, што такія стужкі наогул нельга аналізаваць з халоднай галавой, бо вельмі цяжка спакойна гаварыць пра тое, што «агнём і кулямі выпалена».

Ірына ПІСЬМЕННАЯ.

Паэтычная паверка

Ніл ГІЛЕВІЧ

НАМ ВЫПАЛА ПЕСНЯ

Да ночы брынчыць у альтанцы
гітара,
Да ночы басяць ёй у лад юнакі.
Чарговая песенька моднаю
стала,
А сэнс гэтай песенькі моднай
такі:

«Мне клопату мала—ці буйна,
ці дробна,
Ці ярка, ці блекла жывём
на зямлі,
Ці крыва, ці роўна—таксама
ўсёроўна:
Каб толькі мне кветачкі ўцехі
цвілі».

Ну, вось вам і лозунг і
мудрасць эпохі—
Бярыце з сабою, нясіце
ў жыццё!

Ні болю, ні гневу не трэба
ні трохі—
Адмоўна ўплываюць на сэрца
біццё.

Паслухайце, мілыя хлопцы,
дзяўчаты,—
Хіба гэта ваш пуцяводны
штандар?
«Гэй, крыллем узвейце сваім,
арляняты!»—
Заклікаў калісьці вялікі пясняр.

Не ведаю, хто вам свой выраб
падсунуў—
Няйначай па часці наркоцікаў
спец.
А толькі паверце: і крыўдна,
і сумна.
Не гэта, не гэта нам суджана
спець!

Нам выпала песня такая
на долю,
З якой разрываецца сэрца
ў грудзях:
Калі яна ў бітве пахіліцца
долу—
Другі дабяжыць і падхопіць,
як сцяг!

НА СВЯЦЕ РУЖ

З балгарскага спытка

Як па дзівосную даніну,
Я рваўся, выбраўшы маршрут,
У Казанлыкскую даліну—
У царства руж—на Свята руж.

І ўбачыў ружы... Скрозь
і ўсюды—
Духмяны цвет, ружовы цвет.
І скрозь так гучна граюць
дуды—
Як бы святкуе цэлы свет.

А людзі крочаць праз палеткі
У ззянні ранішняй расы—
І рвуць, і рвуць няшчадна
кветкі,
Каб карыстаць дабро з красы.

І я, няўладны над сабою,
Хачу ірваць пялёсткі руж,
Ды шэпча кветка мне
з мальбою:
«Не руш мяне, не руш, не руш!

Зрываць красу—пабойся бога!
Пялёсткам сум не залячыць!..»
Ах, павядзі мяне, дарога,
Ад гэтай казкі ўдалячынь!

Вярнуся ў родную краіну—
У пушчу сінюю прыйду:
Лясную, дзікую шыпшыну
У гушчары яе знайду.

І пакланюся нізка ў ногі,
Скажу: «Паклон ты мой
прымі...»
Забуду ўсе перасцярогі
І абкалюся—да крыві!..

ЗАНАДТА СЯРДЗІТАМУ КРЫТЫКУ

Не хавай мяне, браток, жывога,
Пачакай, паспееш пахаваць.
Мне зрабіць яшчэ патрэбна
многа,
Шмат яшчэ дзе трэба
пабываць.

Я не ўсіх яшчэ са шчырай
песняй
Абышоў і павітаў сяброў,
І не ўсім яшчэ паклон адвесіў
За дабро, за хлеб і за любоў.

Я не ўсё яшчэ раздаў, што
маю:
Я збіраў свой скарб дзесяткі
год
І ў труну з ім легчы
не жадаю—
Марнатраўцам назаве народ.

Дый чаго табе ўжо так
спяшацца?
Я ж адсюль нікуды не збягу.
Ці баішся: як бы не застацца
Перад чалавецтвам у даўгу?..

У паэтаў—нават
несмяротных—
На планеце не салодкі лёс.
Дык нашто ж ты, мой каханы-
родны,
Адчапіў аглоблю ад калёс?

АЛЕ НЕ БУДЗЕМ адхіляцца ад галоўнага, ад таго, пра што не хочуць і асцерагаюцца паведамляць хвалёвыя радыёгаласы капіталістычнай Амерыкі. Пасля паездкі Хэлмса ў Тэль-Авіў і яго біблейскія ваколіцы ў Белым доме зноў прыўзнялі пяласаты сцяг — гаспадарам яго карцела пахваліцца, што Ізраіль паранейшаму «гераічна заступае дарогу экспансіўным арабам» і гатовы нацяжніца, пусціць на свае ваенныя базы ўзброеных да зубоў «кватарантаў» з ваеннага блоку НАТО.

Аднак запланаваная з гэтай нагоды прэс-канферэнцыя ў тыя дні не адбылася.

Мясцовыя газеты ў сувязі з гэтым падкраслівалі, што гаспадары Белага дома страцілі палітычную арыентацыю. Узяць, напрыклад, Роджэрса. Ён, як заведзены, распінаўся на прэс-канферэнцыях, што ўрад ЗША арганічна ненавідзіць вайну. Яму, Роджэрсу, гэта было ясна, як божы дзень. «Мы не збіраемся ўдзельнічаць у спрэчках на гэту тэму, — тлумачыў ён сяўтыкам. — Няхай гэта робяць іншыя. Мы заклапочаны тым, як выбрацца з вайны, — гэта наша галоўная задача... Мы гаворым грамадскасці праўду, мы выконваем свае абавязацельствы».

А міністр абароны, слухаючы дзяржаўнага сакратара, здзіўлена націскаў плячыма: якія, маўляў, абавязацельствы, што ён балбоча? Злучаным Штатам неабходны «базы іх прысутнасці» ў Паўднёвым В'етнаме. Калі іх там не будзе — амерыканскі найміт Нгуен Ван Тхіеу і дня не пратрымаецца ў Сайгоне. А в'етнамцы... Не, гэта ідыятызм — добраахвотна ўступаць свае пазіцыі камуністам. Яны ж захопяць увесь Індакітай!..

Індакітай — гэта яшчэ паўбяды, вохкаў віцэ-прэзідэнт Агню. Кіньце вокам на Бліжні Усход і Лацінскую Амерыку. Хіба там нашай бяспецы ніхто не пагражае?..

Яна, гэтая выдуманая хворымі галовамі пагроза, штурхае Злучаныя Штаты на змову з самымі рэакцыйнымі ўрадамі свету. Вялікай крывёю, сотнямі разбураных гарадоў і вёсак плацяць за гэта народы, якія ЗША намагаюцца паняволіць...

Вядома, «Голас Амерыкі», «Свабода» і «Вольная Еўропа» не пагодзяцца з гэтым. Яны гадамі марочылі людзям галаву, што капіталісты — самая «надзейная апора» працоўных, якія любяць мір, свабоду і незалежнасць. Аб іх лёсе яны і турбуюцца. Так гаварыла «Свабода», так дурманілі людзей і іншыя радыёгаласы мілітарыстаў.

А з Вашынгтона тым часам паступалі трывожныя весткі, якія рашуча абвяргалі гэтыя байкі. Амерыканцы даведаліся, што яшчэ ў студзені 1970 года Ніксан блаславіў чатырох высокапастаўленых урадаўцаў на самае актыўнае супрацоўніцтва з сіяністкім кагалам «Аб'яднаны яўрэйскі заклік». На падліках штотыднёвіка «Разэль—Юзеф», гэтая змяючка, накіраваная супраць арабаў, дала злавесныя ўсходы: праз якія пяць—сем месяцаў у ізраільскай армі ўжо служыла 3 500 чужаземцаў, сярод іх былі і амерыканцы. Акрамя таго, ва ўзброеных сілах Ізраіля налічвалася 10 тысяч яўрэяў з двайным грамадзянствам. Усё гэта, як справядліва адзначае ў сваёй кнізе «Ваяўнічы нацыяналізм—ідэалогія і палітыка імперыялізму» А. Малашка,— ландскнехты імперыялістычных дзяржаў і ў першую чаргу Злучаных Штатаў Амерыкі.

У гэтай жа кнізе — сцінлая, але трапная заўвага загадчыка кафедры гісторыі КПСС Віцебскага тэхналагічнага інстытута дацэнта Я. Гольдберга, які за многія гады сваёй навуковай дзейнасці пераканаўся, што «гісторыя сіянізму — гэта гісторыя жахлівых злачынстваў, у тым ліку і перад яўрэйскім народам». «Нават у гады другой сусветнай вайны, калі фашысты знішчалі мільёны яўрэйскіх грамадзян, — піша ён, — сіяністы ўмудрыліся дзейнічаць заадно з гітлераўцамі...» Ці не таму амерыканскія мілітарысты і знюхаліся з сіяністамі?

ДЗІЎНА, але факт — Моше Даян стаў эталонам «сучаснага ваеннага стратэга» для Пентагона. Калісьці яго пасылалі ў Сайгон на вывучку, а цяпер часта просяць надзяліцца «баявым» вопытам з амерыканскімі генераламі. Гэта нічога, што ў яго душа чорная, як халява. Аба Эбан, міністр замежных спраў Ізраіля, пераканаў сваіх амерыканскіх апекуноў, што яны маюць справу з ваенным самародкам, які, падобна біблейскаму Давіду, з прашчай пераможа незгаворлівага арабскага Галіяфа. Толькі няхай дзядзька Сэм на ўсялякі выпадак падкіне яшчэ сотню-другую «фантомаў».

Аба Эбан пайшоў яшчэ далей. Як паведамляе Польскае агенцтва друку, ён нядаўна заявіў рэпарцёрам адной тэлестанцыі ЗША, што пасля суда над Эйхманам, які ў час другой сусветнай вайны кіраваў масавымі яўрэйскімі пагромамі, адпала патрэба лавіць і жорстка караць ваенных злачынцаў. Чаму? Іх стратэгія разбою тады дапамагала ўмацавацца сіяністам, якія і цяпер натхняюць Даяна на ратныя справы. Хіба ж такі «герой» не знаходка для ваяўнічых янкі?

Нядаўна ў Ізраілі аб'явілі, што Моше Даян неўзабаве зноў наведаецца ў Нью-Йорк і будзе асабістым госцем гаспадароў Пентагона.

Можа яго там будуць угаворваць, каб менш пагражаў арабам амерыканскай зброяй? Не, гэтага не будзе. Так, па крайняй меры, гавораць самі амерыканцы.

Яшчэ летам, не параіўшыся з прадстаўнікамі ўрада, супрацоўнікі Фрэнка Шэкспіра запрасілі ў вашынгтонскі цэнтр ЮСІА для размовы з замежнымі карэспандэнтамі П. Харта, былога намочніка дзяржаўнага сакратара па справах Бліжняга Усходу і Паўднёвай Азіі ва ўрадзе Джонсана. П. Харт, нібы згаварыўшыся з Элсбергам, пальнуў, што Ізраіль свядома зацягвае рашэнне пытання аб вывадзе сваіх войск з акупіраваных арабскіх тэрыторый.

У містэра Шэкспіра пачалася трасучка. Яму далі нагаяй у Белым доме за гэты недагляд. Таму ён як мага хутчэй адмежаваўся ад заявы Харта. Мясцовыя сіяністы парвалі б на кавалкі беднага Фрэнка, калі б ён не зрабіў гэтага. Пад іх лямант адбывалася пасяджэнне падкамісіі палаты прадстаўнікоў па асігнаваннях, дзе дзяржаўны сакратар Роджэрс і яго намочнік па справах Бліжняга Усходу і Паўднёвай Азіі Сіско кляліся кангрэсменам, што яны таксама не маюць ніякіх адносін да заявы Харта і не адабраюць яе.

Але шыла ў мяшку не ўтоіш. Не паспелі абураныя містэры Роджэрс і Сіско спуціцца са сцэны, як карэспандэнт Франс Прэс Клод Муаці перадаў, што ізраільскія лідэры незадаволены марудлівасцю амерыканцаў, патрабуюць ад іх дадатковых паставак узбраення. Для чаго? Можа для мірных перагавораў з арабамі? Не. Ізраілю не церпіцца зноў напасці на іх. І паны Роджэрс і Сіско ведаюць пра гэта, абодва ж удзельнічалі ў перагаворах Ніксана з Голдай Меір. Але куравыя вочы, як гаворыцца, дыму не баяцца. Што Роджэрсу і Сіско паведамленне Клода Муаці?! Яго можна прапусціць міма вушэй, спісаць на «дрэнную даследчанасць» або «прадузятасць» замежнага журналіста. Тады, нанэўна, зноў усё сыдзе з рук, і на асабістыя рахункі заправіл «вольнага свету» паступяць новыя мільёны долараў, нажытыя на крыві і свайго і чужых абяздоленых імі народаў.

Толькі хто гэта з парабкаў «Свабоды» або «Вольнай Еўропы» здважыцца папракнуць іх за гэта? Хіба Роджэрс і Сіско не хваляваліся, «абвяргаючы» П. Харта, хіба ім лёгка было выкручвацца ад адказнасці? Яны стараліся дзеля далейшага росквіту «амерыканскай дэмакратыі», дбаючы перш за ўсё аб тым, каб з большага звесці канцы з канцамі.

Але дарэмна яны стараюцца. Цяпер, пасля публікацыі сакрэтных дакументаў Пентагона, як справядліва адзначалася ў «Правде», «вялікая хлусня» стала надзвычай лўнай і для тых людзей у краінах Захаду, хто яшчэ верыў у ілюзорныя каштоўнасці так званага «вольнага свету», у бязгрэшнасць яго галоўнага апостала—ЗША. Менавіта для гэтай катэгорыі людзей першы стрэл, зроблены 18 чэрвеня газетай «Нью-Йорк таймс», прагучаў нібыта выбух бомбы.

Да гэтага можна толькі дадаць: а для... «Свабоды» і яе беларускіх ландскнехтаў гэта быў чарговы хаўтурны звон. Ніякія фарысейскія рэверансы, ніякія выкрутасы не рэабілітуюць іх у вачах сусветнай грамадскасці. Не намогуць ім і тыя калідорныя палітыканы, што яшчэ водзяцца ў некаторых краінах, і, забыўшыся аб тым, чый яны ядуць хлеб, стараюцца апраўдаць ізраільскіх мілітарыстаў.

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

ПЯТРУ ВАЛКАДАЕВУ — 60.

22 лістапада спаўняецца шэсцьдзесят гадоў пісьменніку Пятру Валкадаеву. Праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі наўіравала юбіляру прывітанне, у якім гаворыцца:

«...Першыя вершы, якія Вы напісалі на рускай мове, з'явіліся ў друку ў 1934 годзе. Але аб літаратурнай сталасці Вы заявілі пазней, зборнікам вершаў «Родная сторона», які быў выдадзены ў 1950 годзе. Пасля адна за адной з'яўляліся Вашы кнігі, адрасаваныя і дарослым і дзецям. Гэта—зборнікі «Зелёная пристань», «Ливень», паэма «Чандра», аповесці «Разлив», «Чей мальчишка?», зборнік апавяданняў «Егоркины рапорты».

Шмат увагі Вы аддаяце жанру нарыса, пішаце пра людзей працы, аб іх гераічных справах. Мы не можам не адзначыць Ваш уклад у справу выхавання літаратурнай моладзі. Пра гэта сведчыць Ваша шматгадовая праца ў рэдакцыі газеты «Знамя юности» ў якасці літкансультанта.

Жадаем Вам, дарагі Пётр Іванавіч, новых творчых поспехаў, добрага здароўя, шмат радасцей».

Рэдакцыя штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» далучаецца да віншавання.

УКРАІНА ПОМНІЦЬ НАШЫХ ПЕСНЯРОЎ

Да 90-годдзя з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Якуба Коласа Кіеўская студыя хранікальна-дакументальных фільмаў выпусціла на экраны фільм «Якуб Колас і Украіна». Рэжысёр — А. Слесарэнка. У стужцы шырока прадстаўлены матэрыялы, якія адлюстроўваюць дружбу беларускага паэта з украінскімі літаратурнымі і грамадскімі дзеячамі, выкарыстаны яго публіцыстычныя выступленні, прысвечаныя братняму народу, перапіска з кіеўскімі сябрамі і інш.

Вечары памяці Янкі Купалы і Якуба Коласа адбыліся ў Кіеве, у калонным зале Украінскай дзяржаўнай філармоніі, у Мелітопальскім культасветвучылішчы. Са словам пра Я. Купалу і Я. Коласа і чытаннем вершаў украінскіх паэтаў у беларускіх перакладах выступаў А. Слесарэнка. Адно з яго выступленняў увайшло як сюжэт часопіса № 41 украінскай кінахронікі.

М. ЖЫГОЦКІ.

Паэтычная паверка

Пятрусь МАКАЛЬ

●

Да вяршынь
Няма прамых дарог,
Да вяршынь
Вядуць крутыя сцежкі,
Па якіх карабкаемся пешкі,
Абдзіраем пальцы рук і ног.

За гранітны ўчэпішся карніз.
І цябе ўжо болей не пакіне
Рызыка сарвацца зверху ўніз,
Недзе за паўкрока ад вяршыні.

Мой дружбак,
Што абыйшоў мяне,
Крышку фанабэрны робіць выраз.
Воблака на чорным валуне
Прымярае горда: бач, як вырас!

Сам сябе ў адчаі не кляні,
Што ў паход не ўзяў з сабой біклагу.
Прагнымі глыткамі вышыні
Наталяй пранізлівую смагу...

●

У травы
Забіраюць правы—
Хіба гэта не бачыце вы?
Аграмады няўмольных будоў
Выцясняюць траву з гарадоў.
Рэчка чорная ўдаль плыве
Па траве,
Па траве,
Па траве...
І кладзецца сцяблінка травы
Пад асфальт,
Як пад танк,—
Радавы.
На душы—каменнем туга,
Бо мурожнага астраўка
Не знаходзіць мая нага,
Не знаходзіць мая рука.
Я хвалююся, як і вы,
Нахіляючы галаву:
У травы
Забіраюць правы...
Заступіцеся за траву!

●

Росы на травы выпалі,
На вуснах агонь гаркавы
Ад ночы, якую мы выпілі,
Як кубак чорнай кавы.

У локанах змрок за спіною,
Ад воч трапяткіх світае.
Ступаеш поруч са мною,
Грэшная і святая.

Пясок пад нагамі, як порах.

ПРАБЛЕМЫ, МЕРКАВАННІ, РОЗДУМ

НА БЛАКІТНЫМ ЭКРАНЕ— «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ»

В. КУЦЭНКА,
аспірант БДУ імя Леніна

ГЭТАЯ назва з'явілася ўпершыню на экранах нашых тэлевізараў 15 чэрвеня 1963 года. Менавіта ў той дзень дыктары Беларускага тэлебачання паведамілі аб выхадзе ў эфір першага нумара тэлевізійнага штомесячнага часопіса «Літаратурная Беларусь». Яны ў даволі дасціпнай форме аб'явілі, што тэлегледачам, каб даведацца пра літаратурныя навіны ў рэспубліцы, цяпер не трэба чакаць пашталёна ці стаяць у чарзе каля кіёскаў «Саюздруку». Для гэтага дастаткова будзе ўключыць тэлевізар і, калі ласка,—глядзіце, слухайце... Зразумела, новы тэлечасопіс не імкнуўся і не мог замяніць больш грунтоўнае знаёмства з тым альбо іншым творам літаратуры. (Хоць трэба заўважыць, што ў словах дыктараў была і доля ісціны. Зараз некаторыя даследчыкі і тэлекрытыкі прытрымліваюцца думкі, што ў недалёкім будучым людзі большую частку інфармацыі, у тым ліку і літаратурнай, будуць атрымліваць праз экран. А вядомы балгарскі філосаф і эстэтык К. Гаранаў сцвярджае, напрыклад, што ўдасканалены тэлеэкран з цягам часу возьме на сябе многія функцыі друкаванага слова).

Беларускія тэлегледачы і да гэтага бачылі нямала цікавых літаратурных перадач: блакітны экран часта паведамляў пра лепшыя здабыткі роднай літаратуры, пра жыццёвы і творчы шлях нашых класікаў, час ад часу па тэлебачанні выступалі пісьменнікі. Але з выхадам у эфір тэлевізійнага часопіса ўся літаратурная інфармацыя набыла больш мэтанакіраваны характар. Тэлевізійны літаратурны штомесячнік даў магчымасць аб'яднаць разрозненыя літаратурныя матэрыялы, як кажуць, пад адну «вокладку», сістэматычна весці сур'ёзную гаворку пра літаратурны працэс у рэспубліцы. Дарэчы, новы тэлечасопіс стаў своеасаблівым органам Саюза пісьменнікаў Беларусі: рэдакцыя літаратурна-драматычных перадач угадняла ўсе наспелыя пытанні з кіраўніцтвам пісьменніцкай арганізацыі. Усё гэта дазваляла на «старонках» тэлечасопіса падымаць важныя тэмы і літаратурныя праблемы.

Нагадаем змест першага нумара «Літаратурнай Беларусі». Першым раздзелам тэлечасопіса быў — «Пісьменнік сёння». Меркавалася, што ў гэтым раздзеле будуць выступаць літаратары і публіцысты па розных пытаннях літаратурнага і грамадскага жыцця. Так, у першым нумары гутарку пачаў Т. Хадкевіч. Пісьменнік гаварыў пра найбольш значныя здабыткі беларускай літаратуры, пра паглыбленую ўвагу пісьменнікаў да ўнутранага жыцця герояў, пра пашырэнне грамадскіх далягляданў і жыццесцвярджальны пафас сучаснай беларускай прозы.

Другая «старонка» штомесячніка мела назву—«Паэт і песня» (вядучы—А. Астрэйка). Яе можна было не толькі «чытаць» і «глядзець», але і слухаць. Меркавалася, што гэта таксама будзе пастаянны раздзел, у якім рэдакцыя часопіса абяцала знаёміць з новымі альбо малавядомымі песнямі на словы беларускіх паэтаў.

У трэцім раздзеле—«Незабыўнае мінулае»—з дапамогай унікальных кадраў расказвалася аб тым, як у паэтычны край Купалы і Коласа яшчэ ў перадваенныя гады з'ехаліся прадстаўнікі нацыянальных літаратур, каб абмеркаваць надзённыя пытанні развіцця савецкай паэзіі.

У чацвёртым раздзеле—«Набывае беларускае гучанне»—выступіў перакладчык Ю. Гаўрук, які гаварыў аб перакладах на беларускую мову санетаў Шэкспіра. Аб характве роднага слова гаварыў у наступным раздзеле тэлечасопіса пісьменнік Ул. Юрэвіч. А ў заключэнне—«Сяброўскія ўсменкі», з якімі выступіў парадыст Г. Юрчанка.

Як бачым, першы нумар тэлечасопіса быў даволі змястоўны і разнастайны. У далейшай сваёй рабоце літаратурна-драматычная рэдакцыя тэлестудыі прытрымлівалася гэтых жа прынцыпаў. Рэгулярна выступалі пісьменнікі з чытаннем новых твораў, расказвалі пра свае паездкі па рэспубліцы, пра сустрэчы з цікавымі людзьмі, дзяліліся творчымі планамі.

Больш-менш пастаянную прапіску ў тэлечасопісе атрымалі новыя раздзелы—«У нас у гасцях», «Літаратурныя знаходкі», «З карэктурных лістоў», «Паэт і тэатр» і іншыя.

Даволі ўдалым атрымаўся раздзел «На другіх мовах і сцэнах», дзе гаварылася, як беларускае слова набывае новае сцэнічнае жыццё ў розных тэатрах Савецкага Саюза, як перакладаюць творы беларускіх аўтараў на рускую і іншыя мовы.

Палюбіўся гледачам і раздзел — «Пісьменнік чытае твор». І гэта натуральна, бо ёсць нешта асаблівае ў тым, як гучыць пісьменніцкае слова ў вуснах аўтара. Кожны чытае «сваё» па-свойму. З цікавасцю слухаліся, напрыклад, вершы ў выкананні П. Броўкі, М. Лужаніна, М. Танка, А. Куляшова, С. Грахоўскага, М. Аўрамчыка, Р. Барадуліна і іншых.

З асаблівай увагай глядзеліся тэматычныя выпускі «Літаратурнай Беларусі», прысвечаныя, напрыклад, 20-годдзю вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 50-годдзю БССР, паўвекавому юбілею камсамола і г. д. Змястоўным атрымаўся нумар, прысвечаны рабоце праўлення Саюза пісьменнікаў БССР.

У жніўні 1970 года гледачы пазнаёміліся са спецыяльным выпускам «Літаратурнай Беларусі», прысвечаным нашым хлебаробам. Гэтую перадачу вёў І. Шамякін. Цікава выступіла В. Палтаран. Яна расказала пра ўвасабленне вобразаў працаўнікоў калгаснай вёскі на старонках беларускай літаратуры, спынілася на праблеме «ўцёкаў» моладзі з вёскі ў горад, на тым, якой павінна быць сельская інтэлігенцыя ў цяперашні час. Пра вялікія перамены ў нашай вёсцы гаварылі А. Савіцкі і М. Аўрамчык.

На блакітным экране сістэматычна з'яўляліся выпускі тэлечасопіса, прысвечаныя вынікам таго ці іншага літаратурнага года, а таксама выхаду ў свет чарговых «Дзён паэзіі».

Пачэснае месца ў тэлечасопісе заняла творчасць народных паэтаў Я. Купалы і Я. Коласа. Літаратурна-драматычная рэдакцыя тэлестудыі падтрымлівае цесную сувязь з купалаўскім і коласаўскім музеямі, часам непасрэдна адтуль трансліруе перадачы.

Калі на пачатку тэлечасопіс «Літаратурная Беларусь» выходзіў рэгулярна і аднавядаў сваёй назве тэлевізійнага штомесячніка, то ў 1967—1969 гадах ён паяўляўся на экране час ад часу. І добра, што апошнія два гады ён зноў стаў штомесячнікам. Добра і тое, што весці літаратурныя перадачы часта запрашаюцца беларускія пісьменнікі. У новай ролі тэлевізійнага вядучага выступілі ўжо І. Шамякін, С. Грахоўскі, М. Лужанін, А. Савіцкі.

Апошнім часам тэлечасопіс стаў тэматычна разнастайным, ён усебакова асвятляе літаратурнае жыццё, шукае новыя формы падачы літаратурнага матэрыялу. Так, да некаторых яго выпускаў даволі ўдала падключыліся абласныя тэлестудыі. Добра і тое, што тэлечасопіс спрабуе дапаўняць сённяшняе жыццё літаратуры старонкамі з гістарычнага мінулага. Брэсцкая студыя тэлебачання, напрыклад, расказала пра ўдзел выдатнай польскай пісьменніцы Элаізы Ажэшкі ў нацыянальна-вызваленчым паўстанні 1863 года. Работнікі Гродзенскай студыі тэлебачання падрыхтавалі цікавы сюжэт пра жыццё і дзейнасць «паэта аднаго верша» Паўлюка Багрыма, а таксама пра рэвалюцыйную дзейнасць дачкі Дуніна-Марцінкевіча Камілы і пра «Мужыцкую праўду» К. Каліноўскага. Варта адзначыць, што ў тэлечасопісе ўсё часцей з'яўляюцца невялікія інсцэніроўкі твораў беларускіх пісьменнікаў у выкананні вядомых артыстаў.

Праглядаючы часопіс «Літаратурная Беларусь», заўважаеш, што большую частку яго матэрыялаў складаюць выступленні беларускіх пісьменнікаў. Значыць, на якім прафесійным узроўні, з якой актыўнасцю і падрыхтаванасцю будуць выступаць нашы празаікі, паэты і драматургі, будзе залежаць і папулярнасць тэлечасопіса. Калі гаварыць шчыра, то, нягледзячы на асобныя ўдалыя прыклады, праблема садружнасці пісьменнікаў і тэлебачання ў нас яшчэ не вырашана. Сваіх Андронікавых і Смірновых мы яшчэ, на жаль, не маем. Многія вядомыя празаікі і паэты яшчэ нібы баяцца тэлеэкрана. Не сакрэт, што работнікам тэлебачання іншы раз даводзіцца падоўгу ўпрошваць некаторых літаратараў выступіць па тэлебачанні. А як бы выйграла наша агульная літаратурная справа, калі б паміж тэлебачаннем і пісьменнікамі наладзіліся добрыя, па-сапраўднаму творчыя сувязі!

Тут я дазволю сабе невялічкае адступленне. Хацелася б напомніць цікавыя меркаванні І. Андронікава адносна выступленняў пісьменнікаў на тэлебачанні. У самым кароткім выглядзе яго выказванні, паўтораныя неаднаразова ў друку і з тэлеэкрана, зводзяцца да наступнага. У далёкі час, калі яшчэ не было друкарскага станка, літаратура распаўсюджвалася пераважна ў вусным выглядзе. Пісьменнікі вымушаны былі быць выканаўцамі і прапагандыстамі ўласных твораў, большасць з іх умелі добра выступаць перад шырокай аўдыторыяй, зачароўваць людзей вусным словам. Друкаваны станок зрабіў цэлую рэвалюцыю ў распаўсюджванні пісьменнасці. Кнігадрукаванне нарадзіла новыя жанры, новыя стылі, надало літаратуры новыя функцыі. Але, з другога боку, мастацкае слова пачало менш гучаць, яно стала «нямым». Прачытанае вачыма, яно паступова змяніла псіхалогію ўспрыняцця, ператварыла слухача ў чытача. І вось з'явіўся тэхнічны цуд XX века—радыё і тэлебачанне. Пад іх уздзеяннем паступова пачалі мяняцца ранейшыя ўяўленні аб характары слова і характары відовішча. Усё часцей і часцей мастацкая літаратура пачынае «гучаць». У новай якасці, памножанае мільёнамі тэлевізараў, мастацкае слова набывае ранейшыя функцыі. На мільёнах блакітных экранаў чытач убачыў і пачуў пісьменніка. Мастацкая літаратура «набыла голас», і Андронікаў цвёрда ўпэўнены, што тэлебачанне — таксама нешта накшталт «друкарскага станка», якому выпала ўнесці ў развіццё культуры яшчэ больш уклад, чым вынаходніцтву Гутэнберга. Ён заклікае пісьменнікаў часцей выступаць па тэлебачанні, поўнасцю выкарыстаць цуд XX века для наладжвання кантактаў з шматмільённай аўдыторыяй.

Праблема пісьменніцкіх выступленняў па тэлебачанні—спрэчная. Некалькі гадоў назад на старонках газет узнікла нават невялікая дыскусія па гэтым пытанні. Некаторыя сцвярджалі, што асноўнае прызванне пісьменніка—пісаць мастацкія творы, і, маўляў, няма чаго яму лезці ў тэлекадр, тым больш—не маючы артыстычных, аратарскіх здольнасцей. Зразумела, гэта крайнасць. Канечне, не ўсе пісьменнікі змогуць выступаць з такім артыстызмам і тэмпераментам, як І. Андронікаў ці С. Смірноў. Але, калі аўтар цікавы, глыбока эрудзіраваны, бывалы чалавек, то яму будзе што сказаць тэлегледачам, ён зможа пераадолець часовую разгубленасць перад тэлекамерай і парадаваць людзей сваім выступленнем. Трэба ўлічваць, што тэлегледачоў у дадзеным выпадку цікавяць не толькі творы пісьменніка. Для іх таксама важна ведаць аўтара як чалавечую асобу, бо вядома, што ў творах заўсёды знаходзяць адбітак нейкія рысы характару пісьменніка. Гісторыя не памятае такога выпадку, каб чалавек, надзелены літаратурным талентам, у жыцці быў бы ардынарнай асобай. Іншая

[Заканчэнне на 14-й, 15-й стар.]

Чаму нам насустрач выйшлі
У белых вясельных уборах,
За рукі пабраўшыся, вішні?

Чаму сярод зорных гронак,
Што ў рэчку зляцелі з кручы,
Як абручальны пярсцёнак,
Трымціць маладзік бліскучы?

У ранак, у свет жаночы
Сваіх дарагіх і любых
Пяшчотна выводзім з ночы,
Нібы з палаца шлюбаў.

●

Размывала адна бяда
берагі,
падзяляла адна вада
бераг адзін
і бераг другі.
Каб, урэшце, яны ў жыцці
насустрач змаглі пайсці
наўпрост—
збудавала любоў мост,
над вадой,
над былой бядой
у далонь
легла
далонь.
Ды падкраўшыся ціхай хадой,
запаліла нянавісць агонь.
Пад глыбінямі цёмных вод
пахавала абломкі дно.
Будавалася столькі год—
узляцела ў імгненне адно.
Скарб аплакаўшы дарагі,
ходзім сумныя—я і ты.
Будзьце пільнымі, берагі,
беражыце свае масты.

●

Ты маўчаў тады,
як білі дружбака,
Білі словам,
як кастэтам адмысловым.
Ты мычаў сабе,
што слова не рука,
Не кулак і не нагайка.
Слова словам.
Але заўтра
пад прыцэл патрапіш ты,
Дзе ад слоў шукаеш сховішча
дарэмна.
І адчуеш,
як злачынства нематы
Нас штодзённа забіваe
узаемна.
Не ад куль—
часцей мы падаем ад слоў,
Кулі словамі апрануты,
як плаццем.
Невыноснаю цаной людскіх
галоў
За маўчанне палахлівае мы
плацім.
Потым будзеце старацца
напаказ,
Ды ці можа апраўдаць
перад сумленнем
Дабрата,
якую робіце не ў час,
Справядлівасць,
што прыходзіць са спазненнем?
І мяне грызе часамі пачуццё,
Што адпушчана гадоў
па норме строга.
Але знаю,
на паўторнае жыццё
Не пакінуць перавучвацца
нікога.
Каб у тых,
што поруч з намі,
не забраў
Усявышні
чалавечае цярплівасці,
Не адкладвайце на потым
добрых спраў,
Не адкладвайце на потым
справядлівасці.

ПА ВЫСТАВАЧНЫХ ЗАЛАХ

ЖЫВОЕ ІМГНЕННЕ

Беларусь... Гераічныя старонкі яе барацьбы. Яе зямля, яе працаўнікі і яе абаронцы — нязменная прывязанасць жывапісца П. Крахалёва, заслужанага дзеяча мастацтваў рэспублікі. Выстаўка яго твораў, прысвечаная 50-годдзю мастака, зараз з поспехам экспануецца ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР.

— Я вырас у вёсцы, — расказвае мастак. — Памятаю цяжкі час калектывізацыі, час вялікага пералому ў сялянскім лёсе і, што, бадай, яшчэ больш складана — у сялянскай свядомасці. І гэта другая рэвалюцыя, калі так можна назваць калектывізацыю, стала для мяне вядучай тэмай у творчых пошуках.

«Беларускаму мастаку П. Крахалёву, аўтару карціны «Арганізацыя калгаса», удалося перадаць вельмі жыва той пераломны час, калі перад сялянствам на ўвесь рост паўстала пытанне: або ўступаць у новае жыццё, або жыць у адзіночку», — пісаў народны мастак СССР, акадэмік Б. Іагансон у нататках аб Усесаюзнай юбілейнай мастацкай выстаўцы 1957 года.

І сапраўды: тады яшчэ малады мастак здолеў пераканаўча паказаць станаўленне першых калектыўных гаспадарак праз складаныя перыпетыі сялянскага лёсу.

А да гэтага была яшчэ карціна «Рамонтныя работы», мноства падрыхтоўчых эцюдаў, эскізаў.

Ішоў час. З'яўляліся ўсё новыя і новыя работы. Больш удалыя, менш удалыя. Пераадольваліся рысы ілюстрацыйнасці, некаторая пасіўнасць мастацкіх вобразаў.

У вядомым сэнсе кожная папярэдняя работа рыхтуе да наступных. Так, пэўнымі стадыямі на шляху раскрыцця тэмы калектывізацыі сталі для мастака яго эскізы карцін «1929 год», «Раскулачванне», «Першая баразна», раннія варыянты карцін «Першы трактар», «Трактарыст забіты», агульная задума якіх вылілася ў шматпланавае жывапіснае апавяданне «Аб зямлі, аб калектывізацыі».

Ужо ў карціне «Арганізацыя калгаса» перад намі не безаблічная маса — за плячамі кожнага з персанажаў свая біяграфія, цяжкая і непаўторная. Успомніце «Узнятую цаліну» або «Людзей на балоце»! І тут— і ў трыпціху, і ў кампазіцыі «Пералом» — розны лёс, чарада характараў, складаная палітра перажыванняў.

Цэнтральная частка трыпціха «Калектывізацыя». Па задуме і кампазіцыі, па асобных вобразных характарыстыках яна падобна на карціну «Пералом». Па агульным духу — з «Арганізацыяй калгаса». Яны падобныя і па вобразна-стылістычных прынцыпах, па інтанацыі, па пункту гледжання на падзеі. Розная толькі псіхалагічная тональнасць. А ці не гэта для мастака галоўнае?! Так што справа зусім не ў паўтарэнні прыёмаў, а ў пранікненні ў сутнасць характараў, ва ўменні зразумець і перадаць філасофію жыцця, простым і лаканічным вырашэннем узнавіць на палатне складаную тканіну псіхалогіі чалавека, яе сувязь са спрадвечнымі традыцыямі бацькоў і дзядоў і першыя крокі ломкі гэтых традыцый. І гэта П. Крахалёву ў цэлым удалося — і ў цэнтральнай частцы трыпціха, і ў карціне «Пералом».

Што збліжае і раз'ядноўвае людзей? Што робіць іх справядлівымі ў час гневу, калі ад куляў абрэза гіне таварыш? Што надае карціне «Трактарыст забіты» вялікі эмацыянальны напал і сапраўды трагічную выразнасць? Невыпадкова тут усё дзеянне вынесена на першы план.

Вынашанае, глыбокае разуменне мастаком праўды бурнага часу — вось што ўмацоўвае асноўную канцэпцыю палотнаў.

Значны філасофскі змест трыпціха заклікае да нетаропкага і ўдумлівага суперажывання, выклікае ўсхваляваныя асацыяцыі. За знешняй прастатой сюжэтаў трыпціха, «Пералома», «Першай камуны», «Арганізацыі калгаса» адкрываецца складаны свет трывог і спадзяванняў, свет першых радасцей, свет, прасякнуты гарачым водбліскам класавай барацьбы, у якой гінулі і першыя старшыні, і селькоры, і першыя коннікі, якія скарылі жалезнага каня. Ніхто не хацеў паміраць — але класавая вайна жорсткая.

Мне здаецца, унутранай спружынай шуканняў у гэтых работах было імкненне мастака да рэзкага ўзмацнення эмацыянальнай напружанасці зместу, у першую чаргу, аўтарскіх адносін да з'яў, да іх асэнсавання.

Лагічным прадаўжэннем і развіццём пошукаў мастака ў стварэнні вобраза савецкага народа сталі яго палотны, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне. Самай цікавай работай, эмацыянальна напружанай мне ўяўляецца карціна «Былыя паходы»: тут — высокі напал пачуццяў, вера ў перамогу, арганічнае адчуванне дачынення кожнага да цяжкага подзвігу краіны, народа.

На жаль, некаторая паспешлівасць, якая часта прыводзіць да спрашчэння вобразнага ладу карціны, пэўны схематызм і адназначнасць, якімі грашаць многія мастакі, не абышлі і П. Крахалёва ў палотнах «Абаронцы Брэста», «Праводзілі на фронт», «Адпомсці, сын», хоць у гэтых творах і ёсць нямала добрага ў задуме. У «Марсавым полі» не хапае, мне здаецца, каларыстычнай свежасці і вялікага запасу ўнутранай эмацыянальнай энергіі, а ў «Рудабельскай рэспубліцы» — кампазіцыйнай выверанасці дзеяння, якое павінна ўплываць на гледача не толькі шляхам разгортвання нейкай сюжэтнай канвы, а ўсімі вобразнымі выяўленчымі сродкамі: пластыкай, лініяй, фарбамі і прасторавымі аб'ёмамі. Якраз іх аўтар скарыстаў недастаткова.

У сучасны момант у жывапісе праяўляецца тэндэнцыя прынцыповай шматзначнасці. Глядач, такім чынам, становіцца ў пэўнай меры саўдзельнікам творчага працэсу. І ў гэтай сувязі, мне здаецца, у П. Крахалёва наступае той каштоўны перыяд у творчасці, які вядзе да глыбокага, эмацыянальна - паэтычнага ўвасаблення вялікай тэмы, над якой гледачу будзе аб чым задумацца, як ён сёння задумваецца над палотнамі аб зямлі, аб калектывізацыі. Бо гарачай улюбёнасці ў сваю справу, творчай радасці і добрага здзіўлення перад жыццём у П. Крахалёва хапае.

П. КРАХАЛЁЎ. Абаронцы Брэста.

П. КРАХАЛЁЎ. Партрэт Ганны Шпакоўскай з дзецьмі.

Вазьміце яго серыю дзіцячых партрэтаў! Колькі ў гэтых хлопчыках і дзяўчынках жывасці, непасрэднасці і абаяння! А жаночыя кампазіцыйныя партрэты! Гэта не вялікія палотны, не складаныя кампазіцыі з драматычнымі і псіхалагічнымі калізіямі. У іх вы не прыкмеціце аналізаў і складаных абагульненняў. Гэта — проста песня.

На выстаўцы многа пейзажаў. Некаторыя работы, як «Бярэзіна», «Азёрны край», «Ранняя вясной», «Пачатак сакавіка», «Блакітная вясна» ўнутрана закончаны, без сырой неспакойнай эцюднасці. Гэта, калі хочаце, лірычныя матывы, якія інакш не маглі быць выказаны, як у нешматслоўным «сюжэце», з перавагай уражання над складанай задумай. Сувязь з наваколлем «напрамую», як бы імправізацыйная непасрэднасць жывапіснага пісьма, абвостранае адчуванне жывога імгнення — вось прывабныя рысы і такіх работ, як «Апошні снег», «Івацэвічы», «Вясна на рацэ Вяча», «Сакавік», «Рака Іслач», «Май». Уся пейзажная частка выстаўкі ўражвае цёплым настроем прыналежнасці да зямлі, на якой сёння жывём.

П. КРАХАЛЁЎ. Бярозкі.

Усяго толькі каля двух дзесяткаў гадоў аддзяляе першую самастойную работу П. Крахалёва ад апошніх. А колькі між імі іншых, вялікіх і малых! Колькі звязана з кожным творам хваляванняў, упартасці, імкнення пранікнуць у самую сутнасць вобраза, прыроды, характару, жыцця тых, каго ўзяўся адлюстраваць на палатне! І гэта ўсё для таго, каб глядач бачыў у мастацтве не толькі і не столькі мадэлі мастака, а яго самога, яго час — непаўторны і цудоўны.

Барыс КРЭПАК.

ТАЛЕНТ ШЧОДРЫ, НЕПАЎТОРНЫ

ДА 70-годдзя З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ МІХАСЯ ЗАРЭЦКАГА

На радзіму пісьменніка ехаў я з Магілёва праз Круглае і Талачын. Сяло Высокі Гарадзец на невялікай, але чыстай рачулцы Усвейка—адна з вёсак саўгаса «Іскра», нанава адбудаваная, заможная. Прыкмет даўніны, звязаных з жыццём пісьменніка, амаль не засталося. Непадалёк ад школы і над Усвейкай магутныя ліпы. На высокім пагорку відны рэшткі царквы і царкоўнай старожкі («калавуркі», як тут яе называлі). У гэтай калавурцы, выконваючы абавязкі царкоўнага вартаўніка, будучы пісьменнік пры святле лампадкі чытаў «усялякія кнігі, якія толькі ўдавалася знайсці». Крыху ў бок ад сяла — вялікі куст бэзу, якраз там, дзе стаяла калісьці хата мясцовага дзяка Яфіма Ануфрыевіча Касянкова. У яго сям'і 20 лістапада 1901 года і нарадзіўся сын Міхась—будучы выдатны беларускі пісьменнік Міхась Зарэцкі.

Цяжкім і складаным было жыццё Міхася Касянкова. На выхаванне сына наймацнейшы ўплыў зрабіў бацька — чалавек незалежнага норэву, «няроўнага» характару. «Магчыма, — піша М. Зарэцкі ў аўтабіяграфіі,—што мой літаратурны шлях у значнай меры вызначаны тым уплывам, які з дзяцінства аказаў на мяне бацька—чалавек з глыбока крытычным стаўленнем да жыцця, з вялікім запасам уражанняў і перажыванняў, з характарам, які дзіўна спалучаў у сабе шчырую цягу да людзей і разам з тым—панурасць, хваравітую падазронасць у адносінах да іх».

Міхась вучыўся ў мясцовай школе, у Аршанскім духоўным вучылішчы і Магілёўскай (таксама духоўнай) семінарыі. Нягледзячы на суровы клерыкальны рэжым, вучоба дала яму нямала і карысных урокаў. Пазакласнае жыццё «бурсакоў» найболей уплывала на хлопца, прывіваючы пачуцці таварыскасці, самастойнае мысленне і атэізм.

Пад час рэвалюцыі давялося «паблукаць» у пошуках хлеба і свайго месца ў жыцці. Юнак далучаецца да актыўнай грамадскай работы, асабліва ў галіне асветы. Вырашальным фактарам у станаўленні светапогляду пісьменніка з'явілася служба ў Чырвонай Арміі (1920—1927), якая, паводле яго ўласнага сведчання, «садзейнічала канчатковаму засваенню мной ідэй камуністычнай рэвалюцыі і, урэшце, зрабіла мяне камуністам».

Ужо на пачатку творчага шляху (1921) Міхась Зарэцкі з усёй сур'ёзнасцю і адказнасцю ставіцца да літаратурнай справы. «З самага пачатку, як я стаў пісаць, — гаворыць ён сам, —я пісаў па-беларуску. Захапленне літаратурнай творчасцю было ў мяне часткай рамантычнага захаплення «беларускасцю», якое заўладала мною, захапіла ідэяй адраджэння нацыянальнай беларускай культуры».

М. Зарэцкі браў актыўны ўдзел у літаратурным і грамадскім жыцці рэспублікі (аб'яднанні «Маладняк», «Полымя»), часта выязджаў у акруговыя гарады, паветы і воласці, выступаў з дакладамі, арганізоўваў мастацкую самадзейнасць, літаратурныя гурткі і г. д. Як і іншыя, больш вопытныя, сталыя пісьменнікі, М. Зарэцкі быў незадаволены распыленнем літаратурных сіл у шматлікіх групоўках, выказваўся за аб'яднанне пісьменнікаў Беларусі ў адзіны творчы саюз. «Першая і асноўная задача, — гаворыцца ў артыкуле, напісаным у сааўтарстве з М. Чаротам,—гэта супольная праца, супольныя клопаты аб узвышэнні мастацкае і ідэалагічнае вартасці нашае літаратуры, аб поўным узгодканні яе поступу з агульным поступам будаўніцтва нашае рэспублікі».

Творчая практыка самога Зарэцкага была вельмі актыўнай і плённай. Пачынаючы з 1924 года, выходзяць у свет шматлікія яго кнігі—зборнікі апавяданняў «У віры жыцця», «Пела вясна», «Пад сонцам», «42 дакументы», аповесць «Голы звер» і славуты раман «Сцежкі-дарожкі». Глыбіні жыцця, яго супярэчнасці, узнятыя Кастрычнікам сацыяльныя і маральныя праблемы, складаная, але перамаганосная барацьба новага супраць старога—такі змест і пафас творчасці Міхася Зарэцкага.

Пачынаў Міхась Зарэцкі з бытавых ці лірычных замалёвак. Нейкая агністая рамантызацыя асвятляе малюнкі жыцця, прыроды, аўтарскія адступленні. Гэта тыповая «маладнякоўская» проза — паэтычная, узнёслая, якая эмоцыяй слоў, рытмікай фразы ўслаўляла новую эпоху, перамогу над старым светам.

У далейшым пісьменнік зусім не адмаўляецца ад рамантычнага стылю, прывабных асаблівасцей паэтычнай прозы. Ён увогуле з'яўляецца адным з самых яркіх прадстаўнікоў эмацыянальна-рамантычнай плыні ў нашай літаратуры. Але знікаюць крайнасці, празмерная абагульненасць. Рамантызацыя падзей і чалавека спалучаецца з канкрэтнай фабулай, псіхалагічным аналізам, глыбокім роздумам над жыццём. Гэта можна сказаць пра апавяданні «Адкупіўся», «У віры жыцця», «Цішка бабыль», «Як Настулька камсамолкай зрабілася» і асабліва пра апавяданні «Ворагі», «Двое жвіроўскіх», «Мар'я», «На маладое», «Бель», «Смерць». Тут агульная праблема ўзасмаадносін грамадскага і асабістага. Але кожны раз непаўторнасць канкрэтнага канфлікту, рэзкая абвостранасць сацыяльна-маральных і псіхалагічных сутыкненняў персанажаў. Пісьменнік прасочвае (можа, не заўсёды глыбока), як эпоха рэвалюцыі, новы час адбіваюцца ў душах людзей, перайначваюць іх асабісты лес, вызначаюць іх месца ў жыцці.

Несумненна, яркую творчасць Зарэцкага жывіла героіка рэвалюцыі, успрынятай як велічнае, незвычайнае свята працоўных. Страсна сцвярджаючы героіку сацыялістычнай эпохі, Міхась Зарэцкі з неменшай сілай выкрывае нэпмана, мешчаніна, чалавека-індывідуаліста і яго звярыную філасофію (аповесць «Голы звер», апавяданні «Ой, ляцелі гусі...», «Максімаліст» і інш.). Праўда, тут заўважаецца некаторае супрацьстаўленне грамадскага і біялагічнага ў чалавеку, прычым супрацьстаўленне абстрактна-філасофскае. Відаць, такое тлумачыцца кніжнымі запазычаннямі, станаўленнем светапогляду і таленту пісьменніка, пошукамі заглыбленага пранікнення ў сферы падсвядомага, у псіхалогію чалавека.

У канцы 20-х гадоў Зарэцкім напі-

ЛАЎРЭАТЫ КУПАЛАЎСКІХ ПРЭМІЙ

ВЕЧАР У МУЗЕІ ПЕСНЯРА

Заўчора, 17 лістапада, на ласкавае «Запрашаем у Дом Купалы» ў Літаратурным музеі народнага песняра сабраліся шматлікія аматары і прыхільнікі роднай паэзіі. Тут адбыўся першы з літаратурных вечароў «Паэты Купалаўскіх прэмій», якія праводзіць музей напярэдадні 90-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы.

— Сярод усіх помнікаў нашаму народнаму паэту, — гаварыў, адкрываючы вечар, дырэктар музея Уладзімір Юрэвіч, — найвялікшым і неўміручым з'яўляецца беларуская савецкая літаратура, ля калыскі якой стаялі Янка Купала і Якуб Колас. Вышэйшай ацэнкай творчасці нашых паэтаў і празаікаў стала наданне ім звання лаўрэатаў Купалаўскай і Коласаўскай прэмій. Сёння ў нас сустрэча з адным з самых слынных вучняў Купалы, з лаўрэатам прэміі яго імя, выдатным нашым паэтам Петрусём Броўкам.

Слова пра П. Броўку, пра тое, як жывуць у яго творчасці традыцыі Купалы, зрабіў кандыдат філалагічных навук М. Ярош.

З вялікай увагай слухалі прысутныя выступленне старэйшага нашага паэта. Пётр Усцінавіч расказаў пра свае сустрэчы з незабыўным Янкам Купалам, пра тое, як вучыўся і вучыцца ў яго, прачытаў вершы, прысвечаныя памяці народнага песняра.

Потым вершы П. Броўкі чыталі студэнты Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута Уладзімір Волікаў і Марыя Вінакур.

Закончыўся вечар музычнай часткай: салісты Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета Ірына Шыкунова і заслужаны артыст БССР Аркадзь Саўчанка праспявалі творы беларускіх кампазітараў на тэксты П. Броўкі.

Фота Ул. КРУЧКА.

КАРОТКІЯ

Уладзімір АПЯХНОВІЧ

МАЛЮНАК НА ПЯСКУ

МЫ ЖЫЛІ НА ХУТАРЫ. Наша хата стаяла ў гушчары чаромхі і бэзу. Яна была невялічкая, прыземістая, з зеляніны выглядвалі на свет толькі два акны ды ляпіна саламянай страхі. З аднаго боку хаты быў агарод, абнесены нароўным высокім плотам з яловых карэнняў. Далей, ва ўсе бакі, раскінуліся лугі. Толькі воддаль быў бачны досыць вялікі плечаны ўзгорак, на якім стаяла калматая сасна. Прыбітая вятрамі і дажджамі, яна здалёк нагадвала чорны воўчы грыб на крывой ножцы.

Збоч хаты ішла плечаная дарога. Пясок на ёй быў дробны і жоўты, прамыты дажджамі. Другіх хутароў паблізу не было і таму сябрукоў у той час я не меў і гуляў адзін. А як можна аднаму? Нельга нагуляць у жмуркі ці ў вайну, альбо проста набегаць, даганяючы адзін аднаго. І я маляваў, маляваў на пяску. Асабліва хораша маляваць на пяску пасля дажджу, калі ён вільготны.

Неяк бабулька Ганна мне расказала, што за Дзярэчынскай шашою ёсць дрымучы бор, а пасярод яго—Бядоннае возера. Мне вельмі хацелася ўбачыць той бор і бліскучае люстэрка вады, бо паблізу ў нас ні лесу, ні возера не было. І я аднойчы намаляваў на пяску зубчаты бор на схіле гары, возера і сонца над ім. На хвалях возера маленькую лодку і ў лодцы такога ж маленькага хлопчыка.

Маляваў я, лежачы на жываце. У той дзень свяціла ласкавае сонца і я, перавярнуўшыся на спіну, падставіў пад яго праменні твар. Заплюшчыў вочы. І тут сапраўды ўбачыў сябе ў лодцы. Яна ціха плыве па срабрыстых хвалях, а побач растуць нейкія белыя-белыя кветкі. Міма праплываюць прыгожыя хвастатыя птушкі. У далечыні нешта ціхенька пагрукае, гэта ідзе навальніца. Але сюды яна не прыйдзе, бо не асмеліцца засланіць роўнядзь чароўнага возера.

— Тпру!—пачуўся зычны голас.

Прапалі возера, лодка, кветкі і птушкі. А нада мною стаіць вусаты дзядзька Сцяпан, ён кожны дзень возіць з вёскі на шашу бідоны з малаком.

— Зноў ты заснуў на дарозе, Алеська,—здакорам сказаў дзядзька.—А што ты такое тут намаляваў?

Дзядзька Сцяпан нахіліўся ніжэй, каб лепей разгледзець малюнак, усміхнуўся. Потым прысеў на кукішкі, пагладзіў рукой мяне па валасах, сказаў:

— Малайчына, хлопчык, малой. У цябе гэта добра выходзіць.

Дзядзька падняўся, сеў на воз і, ад'язджаючы, кіраваў каня так, каб не наехаць на малюнак на пяску.

ШАЛЁНЫ ВОЎК

У ШКОЛУ МЫ ХАДЗІЛІ за чатыры кіламетры. Дарога перасякала Доўгі луг, невялікі Малаўскі лясок, потым вяла полем. Добра было хадзіць зімою цераз лес, там менш ветрана ды і снег не такі глыбокі. Дзе і надзьме вялікі сняжгур, дык яго можна абысці. Горш у полі. У лагчынах па пояс снегу, а на ўзгорках—галалёд, вецер. Асабліва цяжка было ўзбірацца на Скопаную горку. Калісьці яе трохі скапалі, бо нават самыя дужыя коні не выцягвалі тут вазы, але і цяпер Скопаная высокая—змакрэе спіна, пакуль узбярэшся.

Па гэтай дарозе хадзіла ў школу нас, хутарскіх хлапчукоў, чалавек сем. З іх я быў самы малы і таму часта адставаў па дарозе. Праз лес дык яшчэ цягнуўся, а ў полі не паспяваў.

Нядаўна ў нашых мясцінах паявіўся шалёны воўк. Аб гэтым толькі і гаварылі: на Груздкаўскім хутары перадушыў шмат гусей, у Варонічах сцягнуў авечку, а ў Выганаўскім лесе ўкусіў лесніка... Мы вельмі баяліся гэтага ваўка і хадзілі ў школу цесной гурбой і з кадзілам. Але пакрысе чуткі пра ваўка прыціхлі, і мы забыліся пра яго.

Аднойчы я адстаў ад хлапчукоў яшчэ ў лясу—зачапіўся за корч і ўпаў. Калі падняўся, то заўважыў, што адарваўся гузік ад кажушка. Доўга прыйшлося поўзаць на каленях па снезе, пакуль знайшоў. Калі выйшаў на ўскраіну, то хлопцы ўжо ўзбіраліся на Скопаную горку.

Гора мне было з ботамі. Трафейныя, цяжкія. Абцасы стаптаны і боты выкручвалі ногі. Напэўна, немец, які насіў іх да мяне, быў дужа касалапы.

— Падбіў бы хлопцу боты, а то зусім скрывіць ногі,—не раз гаварыла бацьку маці.

Але таму было не да гэтага: у пачатку зімы рубіў хлеў, а цяпер паехаў недзе далёка вывозіць лес.

І вось я цягнуўся на глыбокім снезе цераз лагчыну, праклінаючы ў думках таго крыванога

саны п'есы «Віхор на балоце» і «Белыя ружы». Зварот да драматургіі быў падрыхтаваны папярэдняй мастацкай практыкай унутранай і знешняй драматызацыяй дзеянняў у празаічных творах. П'есы ўзбагачаюць творчую лабараторыю, выяўляюць плённыя магчымасці пісьменніка ў новым для яго жанры. Тым не меней глыбока арыгінальны талент Міхася Зарэцкага найбольш поўна і ярка раскрываецца ў прозе. Яго пяру належаць лепшыя нарысы таго часу—«Падарожжа на новую зямлю», «Лісты ад знаёмага» і «Вясна 1930 года», надзвычай змястоўныя, цікавыя і непаўторныя раманы «Сцежкі-дарожкі» (1927), «Крывічы» (1929), «Вязьмо» (1932). Яны прысвечаны надзённым праблемам жыцця народа.

Бідаць, ёсць патрэба сказаць, што ў свой час творы Міхася Зарэцкага, асабліва «Падарожжа на новую зямлю» і «Крывічы», падвяргаліся жорсткай вульгарна-сацыялагічнай апрацоўцы, а іх аўтар абвінавачваўся ў нечуваных грахах. Зразумела, з цягам часу ўсё становіцца на свае месца. Аб рамане «Крывічы» гаварыць асабліва не выпадае, бо рукапіс твора недзе загінуў, хоць па апублікаваных урыўках можна меркаваць, што ў ім ставілася праблема сацыяльнага і нацыянальнага абнаўлення Беларусі ў працэсе рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва. А што датычыцца нарыса «Падарожжа на новую зямлю», дык гэта, думаецца мне, цудоўная, своеасаблівая паэма «Над ракой Арэсай» у прозе. Аўтар нарыса адпявае старое Палессе і ўрачыстай песняй услаўляе «маладую задорную БССР», раздумвае ўслых аб вялікіх магчымасцях народа ў галіне матэрыяльнай і духоўнай культуры.

Міхась Зарэцкі — пісьменнік сацыяльны. Вялікія падзеі эпохі, прыватны лёс людзей, інтымныя гісторыі, уласнае жыццё—усё гэта з'яўляецца ў творах пісьменніка прадметам сацыяльнага аналізу. Да лепшых твораў савецкай літаратуры, у якіх шырока і яскрава адлюстраваны эпахальныя падзеі нашай эпохі — рэвалюцыя і калектывізацыя, адносяцца раманы «Сцежкі-дарожкі» і «Вязьмо».

У першым з іх М. Зарэцкі сцвярджае гуманістычны змест Вялікага Кастрычніка. Перад намі ўзнаўляецца лёс прадстаўнікоў розных сацыяльных класаў і груп ва ўмовах класавай барацьбы, духоўнае абнаўленне чалавека, які змагаецца за сацыялістычныя ідэалы. У рамане дзейнічаюць рабочыя, сяляне, гарадскія мяшчане, памешчыкі, інтэлігенты. Аднак рэвалюцыйныя падзеі ў губернскім горадзе і навакольных вёсках падаюцца праз успрыманне самапаглыбленага і летуценнага семінарыста Васіля Лясніцкага. Менавіта ён у гушчы падзей, у сутыкненнях з людзьмі розных палітычных інтарэсаў — анархістам Халімам, народнікам Матруніным, памешчыкамі Карлам Шэмпелем і Раісай Яновай, камуністамі Багуном, Андрэем, Нінай Ідэйна-псіхалагічны і эмацыянальны змест «Сцежак-дарожак» —жыццёвы шлях Лясніцкага, яго погляды, сумненні, перажыванні, інтымны свет, складаная і цяжкая ўнутраная эвалюцыя героя, карацей кажучы, пошукі інтэлігенцыяй свайго месца ў рэвалюцыі. «Пасланіся перад вачмі бязмежныя сцежкі-дарожкі, перапляліся пераплётам заклятым — не згадаць, па якой трэба пайсці, каб патрапіць на правільны шлях». Вось галоўнае пытанне, на якое павінны даць недвухсэнсоўны адказ герой і аўтар.

На працягу ўсяго твора развенчваюцца антысацыялістычныя ці правінцыяльна-рамантычныя ўяўленні і заблуджэнні інтэлігенцыі (Матрунін, Халіма, Славін), паказваецца той шлях, па якім лепшыя прадстаўнікі інтэлігенцыі ідуць да палітычнай сталесці, да разумення ленінскай праўды.

На рубяжы 20—30-х гадоў Міхася Зарэцкага асабліва хвалявала праблема сацыяльнага «разлому» на вёсцы. Гэтаму і прысвечаны раман «Вязьмо», які з'явіўся прыкметным дасягненнем самога пісьменніка і ўсёй беларускай прозы 30-х гадоў.

Канфлікт рамана—барацьба новага чалавека-калектывіста і чалавека-ўласніка. Пераўтварэнні на вёсцы адлюстраваны з пункту гледжання высокай гуманістычнай ідэі: перабудова жыцця ў імя чалавека і з любоўю да чалавека.

У рамане ўзнаўляюцца драматычныя сітуацыі эпохі, створаны адметныя людскія характары—прыхільнікаў калектывізацыі і яе ворагаў. Гэта камуністы Лакота, Зелянюк, Карызна, кулак Гвардыян і яго памагатыя. Барацьба за новае, сацыялістычнае жыццё на вёсцы мае сваю крызую абвастрэнняў і спадаў, але ўрэшце завяршаецца перамогай працоўнай беднаты. «Наш шлях быў нялёгкім, — гаворыць важак калгаснага будаўніцтва Якуб Лакота,—на ім было многа каўдобін, у якіх мы здорава грузлі, але пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі мы перамаглі ўсе перашкоды і выйшлі на роўную цвёрдую дарогу...»

У першай палове 30-х гадоў па рамане «Вязьмо» была зроблена драматызаваная аповесць «Сымон Керызна», напісаны кінасцэнарый «Пачатак шчасця», п'еса «Ная». Пісьменнік жыў новымі творчымі планамі і задумамі. Ды задумам гэтым не суджана было здзейсніцца: жыццё яго абарвалася ў самым росквіце сіл...

Міхась Зарэцкі — пісьменнік шчодрага, непаўторнага дару, адзін са слаўных пачынальнікаў беларускай савецкай прозы. Яго лепшыя творы і сёння хвалююць грамадзянскім пафасам, драматызмам падзей, жывымі чалавечымі страсцямі.

Споўнілася 70 год з дня нараджэння Міхася Зарэцкага, а да гэтага часу перавыдадзены толькі раманы «Сцежкі-дарожкі» і «Вязьмо». Найлепшым ушанаваннем светлай памяці пісьменніка было б выданне збору яго твораў.

Мікола ЛУФЕРАЎ.

ЧАРГОВЫ, КАРАЛІШЧАВІЦКІ...

Стала ўжо традыцыяй, што ў канцы года Саюз пісьменнікаў Беларусі праводзіць творчыя семінары літаратурных пачаткоўцаў. Праз два дні, 22 лістапада, у Доме творчасці імя Якуба Коласа ў Каралішчавічах пачынае сваю работу чарговы такі семінар.

Сёлетні семінар у параўнанні з папярэднімі мае шэраг асаблівасцей. Па-першае, для ўдзелу ў яго рабоце запрошаны пераважна тыя маладыя паэты і празаікі, якія ўжо выдалі свае першыя кніжкі (журналістка з Мінска Валянціна Коўтун, настаўніца з Горак Нэла Тулупава, пімнерважатая з Гомеля Ніна Шклярава, супрацоўнік Клімавіцкай раённай газеты Мікола Мінчанка, журналіст са Жлобіна Мікола Янчанка, настаўнік з Брэстчыны Алесь Разанаў) альбо падрыхтавалі іх да друку (мастак з Аршанскага ільнокамбіната Леанід Калодзежны, журналіст з Салігорска Анатоль Крывіцкі, ваеннаслужачы Алесь Жук, брэсцкі журналіст Васіль Жуковіч, супрацоўнік Мазырскай раённай газеты Уладзімір Рудзінскі). Па-другое, найбольш шматлікую групу ўдзельнікаў семінара складаюць сёлета маладыя празаікі, у той час як на ранейшых такіх творчых сустрэчах пераважалі паэты. І, па-трэцяе, сёлета ў Каралішчавічах упершыню будзе працаваць творчая секцыя маладых крытыкаў (рабочы Мінскага станкабудаўнічага завода імя Кірава Анатоль Псікаў, аспірант Гомельскага універсітэта Радзівальт Літвінаў, бібліятэкар з Пухавіцкага раёна Віктар Рабкоў і іншыя).

Кіраваць работай творчых секцый (па жанрах) запрошаны вядомыя нашы паэты, празаікі, крытыкі і літаратуразнаўцы.

Гастролі ў братняй Латвіі

Сёння ў Даўгаўпілсе спектаклем «Прачніся і спявай» М. Дз'ярфіна пачынаюцца гастролі Магілёўскага тэатра драмы і камедыі, які працуе ў Бабруйску. Малады творчы калектыў за два тыдні паказае яшчэ тры спектаклі: «Трыбунал» А. Макаёнка, «Даходнае месца» А. Астроўскага і «А зоры тут ціхія...» паводле аповесці Б. Васільева.

Са спектаклямі беларускага тэатра пазнаёмяцца жыхары Рэзекне і іншых гарадоў і пасёлкаў братняй рэспублікі.

АПАВЯДАННІ

немца, што сапсаваў боты. Снег мокры, рыхлы, і я іду, нізка апусціўшы галаву, трымаючыся па слядах сябрукоў.

Нечакана пачуў далёкія галасы. Калі ўскінуў галаву, то ўбачыў хлопцаў на Скопанай. Яны сталі там гуртам і чагосьці рашуча махалі рукамі. І тут даляцеў да мяне страшны воклiч:

— В-о-о-ў-к!..

Аглянуўшыся, я ўбачыў яго—воўк шыбаваў, высока перакоквачы снегуры, ад Выганаўскага лесу.

Мяне ахапіў жах, здранцвелі ногі, і я не мог нават зварухнуцца. Зірнуўшы ў бок Скопанай, заўважыў, што хлапчукі схаваліся на той бок гары.

Воўк быў блізка, і трэба было ўцякаць. Сабраўшы апошнія сілы, зрабіў крок—другі, паслізгнуўся і ўпаў. Калі ўзнімаўся, з нагі з'ехаў шырокі нямецкі бот, і я набег пад гару, кульгаючы і цягнучы за сабой доўгую анучу.

Нешта ўсё больш і больш сціскала горла, не хапала павэтра, салёны пот і слёзы залівалі вочы...

Калі ўзбег на горку, ледзь не наляцеў на чалавека, што бег насустрач з сякерай. Апошняе, што я пачуў, трапячы прытомнасць, як страшна завыў, заскавытаў воўк.

Мяне выратаваў дзядзька Сцяпан. Той самы, што пашкадаваў мае малюнкі на пяску.

ВАРАНЁ

ЯЦЕЛА Ў ВОГНІШЧА ламачча, цягнуліся да маўклівых яловых лап языкі полымя, моцна крычала варона. Яна сядзела на верхавіне высокай елкі і, здаецца, сваім гартаным голасам пасылала нейкія трывожныя сігналы.

— І чаго яна раскрычалася? — кідаючы ў агонь чарговага рака, сказаў Васька.—Мо на елцы гняздо, падлез бы, Мішка...

Міша Пявун, рабы, цыбаты хлопец, прыжмурыў вока і наглядзеў на елку.

— Нешта ёсць,—сплюнуўшы праз зубы ў вогнішча, аўтарытэтна адказаў ён. — Толькі высока лезці.

— Падлезь, Мішка, падлезь, — зноў напрасіў Васіль.—Мо яйкі ёсць.

— Якія там яйкі. Канец ліпеня,—адказаў Міша. Але ж падхапіўся, падцягнуў штаны і пабег да елкі.

З Васькам і Мішкам, маімі сябрукамі, я часта лавіў ракаў у Акоўцы. Рэчка тут цячэ цераз Выганаўскі лес і пад карчамі іх шмат. Ляжаш на бераг, запусціш руку пад корч і мацаеш. А ён, дурань, спяшаецца схапіць кляшнёй за палец.

Пяклі ракаў мы тут жа ў лесе. Высыпалі з шапак у адно месца, а потым раскладвалі па тры кучкі: спачатку буйнейшых, а там драбнейшых. Калі які рак аказваўся лішнім, ён ляцеў назад у Акоўку. Гэта каб паміж намі не было сваркі.

Раптоўна варона закаркала мацней, падхапілася з верхавіны і шуганула туды, дзе варушыўся на елцы Мішка. Там пачалася мітусня. Быў чуцён толькі адчайны крык вароны, ляцела пер'е, ды ўздрыгвалі яловыя галіны.

Па ствале елкі амаль скаціўся Мішка. Ён бег ва ўвесь дых да нас, трымаючы ў адной руцэ дзягу і падтрымліваючы гэтай жа рукой штаны, у другой было даволі вялікае варанё. Па шчацэ Мішы цякла кроў.

— Во, халера, дзеўбанула,—падаючы на траву, адным выдыхам сказаў Мішка.

Варона недзе адляцела і цяпер яе не было чуваць. Варанё ляжала з закручанымі крыламі ля ног Мішы. Яно цяжка дыхала шырока адкрытай дзюбай, рыўкамі ўзнімаючы волле, і з нейкім жахам вадзіла з боку ў бок вачыма.

— Зараз мы вырадка падсмажым,—уставаючы, сказаў Мішка.

— Можа няварта,—запярэчыў Васька. — Давайце лепш аднясём дадому, у мяне ёсць клетка.

— Гавары тут мне,—не згадзіўся Міша. — Нядаўна варона ўкрала ў нас куранё. Душыць іх трэба, гадавак...

Міша падняў варанё і ўжо намерыўся кінуць у агонь. Мяне быццам працяло токам. Я кінуўся да сябрука і стукнуў яго па руцэ. Варанё ўпала на зямлю і з нейкім грудным піскам, падскокваючы, пабегла. У адно імгненне каля яго плюхнулася варона, падхапіла і знікла ў гушчары.

— Усё-такі, калі другі раз злаўлю вырадка, то спалю,—адкручваючы хвост у рака, мармытаў сабе пад нос Міша.

Але другога разу не было: вараняты хутка падраслі і паляцелі, а да наступнага лета падрос і Мішка.

ДЗІКІ КОТ

ЭТАЯ ХАТКА стаяла на ўскрайку Выганаўскага лесу. Яна нават не зусім нагадвала хату, бо была вельмі малюсенькая, без сенцаў, і мела толькі адно падслепаватае акно. Над саламянай страхой, на якой ад зімы да зімы цвіў купінамі мох, шалясцеў жорсткім лісцем таўшчэзны дуб. Каля хаты—ні адрыны, ні хлеўчыка, бо ў бабыля дзеда Мацея, які жыў у гэтай хатцы, акрамя рудога ката Чыха, нікай жывёлы не было.

Людзі расказвалі, што калісь Мацей працаваў лесасекам у Выганаўскім лесе. Была ў яго жонка Маня і двое сыноў. У вайну сыны пайшлі на фронт і не вярнуліся, а Маня трапілася на дарозе п'яным паліцаям і яе забілі. З таго часу і жыў дзед Мацей бабылём. Жыхары з суседняй вёскі не раз гаварылі Мацею, каб ён будаваўся і пераязджаў да людзей у вёску. Але стары і слухаць не хацеў. «Позна мне ўжо будавацца,—гаварыў ён. — Восьмы дзесятак пайшоў. Дажыву свой век у лесе».

І пасмейваліся вяскоўцы з яго: «Не, каб трымаць парсючка ці кароўку, дык на табе—ката дармаеда»,—гаварылі адны. «У Мацея і мышам няма чым паласавацца»,—разважалі другія.

Асабліва шмат было гаворак у вёсцы пра адно паляванне дзеда Мацея. Аб гэтым расказвалі вяскоўцы зімой на вечарынках і ў летнія прыцемкі, калі збіраліся на прызбе лушчыць семачкі.

Пайшоў неяк Мацей у лес на барсука—напярэдадні нагледзеў пару—і кот Чых бяжыць наперадзе яго, як сабачка. Бяжыць і жаласліва мяўкае, быццам адчувае нейкую бяду. Ішлі на барсука, а тут, адкуль ні вазьміся, ліса. Мацей ускінуў стрэльбу, націснуў на курок—асечка. А ліса тым часам асядлала ката, б'ецца—аж поўсць ляціць. Падбег дзед, адагнаў лісу, а Чых увесь у крыві. Загарнуў Мацей ката ў кашулю і панёс дахаты. Тры тыдні выходжваў ён Чыха, як хворае дзіця: змазваў нейкай маззю раны, клаў кампрэсы і нават кожную раніцу хадзіў у вёску купляць свежае малако і ачуняў Чых.

Хаця многія ў вёсцы пасмейваліся з Мацея, мы, хлапчукі—Васька, Мішка і я, дзеда вельмі любілі. У ціхія летнія вечары дзед выходзіў з хаткі, садзіўся на шырокую калоду, на якой звычайна сек ламачча, і расказваў нам усякія гісторыі. Аказваецца, недалёка ад нас, за Выганаўскім лесам, жыве царэўна-прыгажуня і ў яе ёсць тры дачкі-лябёдкі. Страшыдла-лясун ужо даўно хоча падпільнаваць адну з лябёдак, каб украсці і забраць сабе ў жонкі...

Мы слухалі дзеда і з нейкай радаснай трывогай глядзелі на махнатыя ліны і стромкія сосны Выганаўскага лесу, лавілі далёкае «ку-ку» і спадзяваліся, што вось-вось на палянцы з'явіцца царэўна-прыгажуня і яе беласнежныя дочкі-лябёдкі. І яшчэ мы пакляліся, што абавязкова абаронім іх ад страшыдла-лесуна...

Увосень дзед Мацей захварэў і памёр. Пахавалі яго тут жа ля хаты. Хату разабралі на дровы, засталася толькі цагляная печ з разваленым задымленым комінам. Ката Чыха ўзяў да сябе дзядзька Сцяпан, але кот збег у першую ж ноч на магілу Мацея... Хацелі злавіць Чыха, але ён не падпускаў нікога да сябе.

Пасяліўся кот у падпечку былой Мацвеевай хаты і жыве там зімою і летам. Кажуць, начамі ён бегае на магілу дзеда і доўга жалобна мяўкае.

Вяскоўцы, праязджаючы каля разваленай печкі, расказваюць спадарожнікам: «Жыве тут дзікі кот... Дзіўны быў чалавек яго гаспадар, Мацей...»

ПАСТАЎЛЕНА ПЕДАГОГАМ...

«ДЗЕЦІ ВАНЮШЫНА» НА СЦЭНЕ РУСКАГА ТЭАТРА БССР ІМЯ М. ГОРКАГА

ПРА ГЭТЫ спектакль крытыка выказала сваю думку: поспех тэатра, цікавая і змястоўная работа амаль усіх выканаўцаў роляў, суладдзе рэжысуры і мастака... Гэта справядлівая ацэнка. Даўно руская сцэна ў Мінску не ведала такога поспеху творчага парадку. Ёсць тут свая заканамернасць, пра якую, здаецца, яшчэ не пісалі,—«Дзеці Ванюшына» самастойна прачытаў і даў сцэнічнае жыццё свайму разуменню п'есы рэжысёр з яркім педагагічным ухілам Уладзімір Маланкін. Гэта ён здолеў абудзіць у выканаўцаў нешта раней імі не паказанае.

Скажам, Т. Кудраўцава адчула маштабнасць эпізадычнага персанажа Акуліны, якая амаль не мае тэксту; В. Краўчанка ў добрым сэнсе слова здзіўляе публіку натуральным жыццём у вобразе Арыны Іванаўны; Ю. Сідараў філігранна распрацаваў партытуру ролі Канстанціна Ванюшына, даючы партрэт завершанага і хісткага захопніка; дэбютант на мінскай сцэне К. Шышкін раскрывае трагедыю Ванюшына-старэйшага як адплату за бесчалавечны шлях да багацця... Акцёры не дазваляюць сабе карыстацца штампам, з іх «здзёрта» скура амплуа. Рэжысёр навучыў іх слухаць адзін аднаго, больш таго — слухаць тую злавесную цішыню, якая часам аж трымціць у гэтым знешне добрачынным доме, дзе на самой справе ўсё даўно перабыталася і зваручнулася з месца.

Якім чынам рэжысёр дасягае мэты? Здаецца, адказаць на гэта зусім проста: У. Маланкін давярае драматургу, ён не «паляпшае» яго і не разбурае задумы, бо напісана С. Найдзёнавым п'еса так, што кожны душэўны рух яе герояў мае пад сабой глыбокі сацыяльна-псіхалагічны грунт, і ён, грунт,— у тэксце, дзе слова падрыхтавана характарам і сітуацыяй, прарываецца з глыбіняў сэрца. Адчуваеш, што ў часе рэпетыцый вучань выдатных майстроў — сучасныя рэжысуры А. Папова і М. Кнебель У. Маланкін не загадваў артыстам «так іграць!», не паказваў ім узораў, якія яны павінны пераймаць, а падказваў — «вось-нто вы павінны шукаць у саміх сабе». І яны шукалі.

Паўла Сяргеевіча Шчоткіна — аднаго з зяцёў Ванюшына іграе А. Кашкер. Гэты жыхар ванюшынскага дома прадаў сябе. Часова ён атрымаў «кватэру» недзе ў цокальным паверсе, «пад зямлёй». І помсціць за свой лёс. Помсціць усім. Усяму свету. Перш-наперш, зразумела, Ванюшыным. Страх перад агідлівасцю і пагардай да яго з боку тых, хто «купіў» яго, робіцца рэфлексам Шчоткіна, якім яго паказвае А. Кашкер. Шчоткін цягне руку, каб прывітацца з Ванюшыным, а той кідае яму, нібы лакею, сурдут. Шчоткін не паспявае пакрыўдзіцца, бо ўсё ж такая халуйская ў яго натура, але потым раптам прымае позу Напалеона: маўляў, нічога, яшчэ будзе свята на яго вуліцы! А пакуль герой А. Кашкера пускае чутку, намякае на тое, што «нехта» з «некім» парушаюць мараль, ён атручвае жыццё кожнаму, хто хоць трошкі больш за яго мае права на павагу.

У доме Ванюшына здараецца, што хтосьці з малых ці дарослых раптам успомніць — перад ім маці, пачуцці якой трэба дзеля «высакароднасці» паважаць, перад ім хворы бацька, які пакутуе ад таго, што яго дзеці не такія, якімі ён хацеў бы іх бачыць. Шчоткін А. Кашкера не стрымае сябе, і ў такіх выпадках, ён гучна абвесціць або шэптам намякне пра тое, аб чым уголас не скажа нават Канстанцін! З ліслівай усмешкай або з выразам гневу на твары, ён от сабе так, ад няма чаго рабіць будзе «выкрываць» чужыя сквапнасць і фальш. І вось што радуе ў такой акцёрскай інтэрпрэтацыі ролі — спачатку Шчоткіна; чалавека, як кажуць, «маленькага» і «прыніжанага» разумеш: гэта ж натуральнае імкненне абараніць сваю годнасць, але яно робіцца злачынным, калі становіцца ўнутранай неабходнасцю бачыць у людзях толькі дрэннае і помсціць ім любымі спосабамі. Паказваючы вобраз у руху, у развіцці, артыст даводзіць яго да той мяжы, пасля якой ні пра якое духоўнае «адраджэнне» не можа быць і гаворкі — канчаткова прыгнечаны, Шчоткін ужо і раб самога сябе...

Затое другі зяць Ванюшына — Сцяпан Фёдаравіч Красавін у выкананні Ю. Сцяпанава выслядае асобай з іншай унутранай «перспектывай». Рэжысёр дазволіў артысту быць тэатральным амаль у кожным выхадзе на сцэне — інтанацыі самавітыя, рухі свабодныя, паводзіны раз'юшанага і не вельмі разумнага то дзіцяці, то звяругі... Красавін часам па ўсіх акцёрскіх фарбах «адсоўвае» на другі план амаль усіх астатніх дзеючых асоб, і гэта зроблена У. Маланкіным невыпадкова, прынамсі, не толькі для таго, каб прадэманстраваць здольнасць Ю. Сцяпанава бліскуча пераўвасабляцца. Рэжысёру важна паказаць яшчэ аднаго прэтэндэнта на багацце, яшчэ аднаго кандыдата на «магільшчыка» Ванюшына як чалавека. Забойца, але свой гонар мае! Праўда, трэба заўважыць, што на асобных спектаклях Ю. Сцяпанаў перабірае мастацкую норму і празмерна малюўніча паказвае «п'яны бунт» Красавіна. Кампенсуецца гэта ў другой частцы — тады, калі яго герой свядома і цвяроза «выдзірае» з Ванюшына не толькі грошы, а і загад дачцы, каб яна ехала ў Маскву разам з зяцем. Тут Красавін страшны, бо з пасткі, падрыхтаванай ім, вырвацца немагчыма: мёртвая хватка. Вось ён схапіў абрус і трымаючы яго, як лейцы, «кіруе» тройкай коней: едзе Красавін на Маскве з ванюшынскімі грашыма ў кішэні і з ванюшынскай дачкой... Так яно і будзе!

Нічога не скажаш — рэжысёр і артыст адкрыта ствараюць вобраз пасвойму здольнага, нават таленавітага ў нечым чалавека, які ўмее пажыць сабе на радасць. Ды талент той дастаўся хаму. Улада над людзьмі і над іх душамі — вось евангелле ад Сцяпана Красавіна. Ён і на каленкі ўпадзе, ён і песню заспявае, ён і ручку пацалуе... Ён і да шыбеніцы падвядзе. І не вельмі п'яны быў Красавін Ю. Сцяпанава, калі ўваліўся ў дом Ванюшына, ён хутчэй за ўсё дэманстраваў, да чаго можа дайсці, калі толькі яго не паслухаюць тут. (Між іншым, і з гэтай «падсветкай» ролі перабіраць норму выканаўцу не варта).

Важны ідэйны акцэнт спектакля гучыць якраз тады, калі Красавін нічыра абвяшчае, што ён — махляр, нават махляр ад галавы да пят, ды толькі і ганарыцца гэтым. Бо — такі свет, у якім яны жывуць: Ванюшыны, Красавіны, Шчоткіны. Іншым у ім быць нельга: загінеш. Каб не загінуць, танчы, прыніжай, пускай у свет жабраком таго, хто не можа выстаяць у канкурэнцыі. Сямейны «карабель» Ванюшыных тоне. Хай сабе Канстанцін зменіць на ім «абсталяванне» — ратунку не будзе. І жывы стары застанецца на палубе, пакуль не наглыне карабель хваля новага жыцця, дзе ўжо трагедыя дойдзе да свайго завяршэння — настане час перамяніць свет. Але гэта ўжо не для Ванюшыных, гэта зробяць не яны...

Да гэтай думкі-ўражання вядзе нас рэжысёр У. Маланкін, раскрываючы змест і дух трагедыі дома Ванюшыных праз акцёра-выканаўцу. Так, вядома ж, ён знайшоў аднадумцу ў мастаку Ю. Туры, тонка ўвёў у гукавую тканіну спектакля музыку (шкада, праўда, што адной-чы тут гучыць цытата з «Трох сясцёр» МХАТ, гучыць марш, адрасаваны далёка не Ванюшыным, а Прозаравым!) — і гэта сведчыць, аб тым, што ён не абмінаў і чыста пастаноўчых задач. Выразна распрацаваны ім і мізансцэны, якія то даюць графічны малюнак знешне прыстойнага і страшнага жыцця, то нібы «ўцягваюць» гледача ў мураннік па-жывёльнаму мітуслівага існавання герояў п'есы. І ўсё ж перш-най і галоўнай вартасцю зробленага У. Маланкіным трэба прызнаць яго педагагічны такт і педагагічную настойлівасць у паказе глыбока матываваных акцёрскіх паводзін на сцэне, паводзін, якія ўспрымаюцца натуральнымі і па-мастацку абагульненымі «кавалкамі» жывога жыцця. Памеры артыкула давалі мне магчымасць спыніцца толькі на тым, што робяць на сцэне А. Кашкер і Ю. Сцяпанаў. Пра іншых ужо гаварылася ў іншых рэцэнзіях. І незалежна ад так званага «касавага» поспеху «Дзяцей Ванюшына», па высокім творчым рахунку іх можна аднесці да даўно чаканай намі ўсімі творчай перамогі тэатра, у які нарэшце завітаў сапраўдны педагог і ўдумлівы мастак.

К. ХАДЗЕЕЎ.

ІДЗЕ ФЕСТЫВАЛЬ

Гэта афіша адразу прыцягвае ўвагу. Розна каляровы россып нотных знакаў, контур раяля, строгая лесвічка арганных труб. Сёння гэту афішу з надпісам: «Фестываль камернай музыкі» можна ўбачыць у многіх гарадах Беларусі. Камерная музыка, якая калісьці была разлічана на вузкае кола слухачоў, зараз прыцягвае ўсё большую і большую ўвагу аматараў музыкі. Яна можа перанесці нас у сярэднія стагоддзі, адраджаючы цудоўныя мелодыі Антоніо Вівальдзі і Арканджэла Карэлі. Яна гаворыць з намі вечнай мовай Баха і Бетховена, Моцарта і Гендэля. Яна перадае самыя сучасныя інтанацыі твораў Дзмітрыя Шастаковіча, Ігара Стравінскага, Радзіёна Шчадрына.

Сёння санаты, квартэты і «канчэрці гросі» гучаць на канцэртных пляцоўках нашай рэспублікі. Аматары музыкі Мінска і Гомеля, Віцебска і Оршы, Гродна і Ліды пазнаёмяцца з майстэрствам многіх выдатных савецкіх музыкантаў. Сярод удзельнікаў фестывалю — Масноўскі камерны аркестр пад кіраўніцтвам Антона Шароева, Мінскі камерны аркестр пад кіраўніцтвам Юрыя Цырука, славуты квартэт імя Камітаса з Арменіі, заслужаная артыстка Грузінскай ССР піяністка Элісо Вірсаладзе, лаўрэат міжнародных конкурсаў у Бруселі, Манрэалі, Генуі, пераможца IV Міжнароднага конкурсу імя Чайкоўскага скрыпач Гідон Крэмер, народны артыст Саюза ССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Літоўскай ССР Вірґіліус Нарэйка, народная артыстка БССР Святлана Данілюк.

Фестываль, арганізаваны Міністэрствам культуры БССР і Беларускай дзяржаўнай філармоніяй, працягваецца.

ПАД ЗНАЁМЫ НАПЕЎ

АДЗІН ЭПІЗОД З БАЛЕТА «ПАСЛЯ БАЛЮ»

БАЛЬ скончыўся. Першы ў жыцці Юнака — цудоўны, казачны баль...

У шчаслівым паўзабыцці ён ходзіць па вуліцах начнога Пецярбурга. Сёння ён асабліва зачараваны яго мастамі, помнікамі, палацамі. Сёння ў складаным начным жыцці гэтага дзівоснага горада ён хоча бачыць толькі шчасце і дабрату. У вушах гучыць музыка, у жаночых тварах ён пазнае рысы каханай... А ў гэтую ноч, як і ў іншыя, людзі не толькі сустракаюцца, каб пакахаць адзін аднаго, але і разыходзяцца. Людзі паміраюць. Канчаюць самагубствам, не перамогшы жыццёвых нягод...

У гэтую ноч скончыцца

Цыганка — Р. Красоўская.

і шчасце Юнака, шчасце, што нарадзілася некалькі гадзін назад.

А пакуль што яму здаецца, што вакол радасць і святло. І пакуль што — бясконцая, поўная чараўніцтва зімовая ноч. Яна вабіць феерверкам сняжынак, карнавальных масак, бляскам і холадам гранітнага горада на Няве. Зусім так, як у паэта, жыццё якога непадзельна з ім звязана: «За окошком Нева дымится, ночь бездонна и длится, длится — петербургская чертовня... В черном небе звезды не видно, гибель где-то здесь, очевидно, но беспечна, пряна, бесстыдна маскарадная болтовня»...

І раптам у гэтай начной музычнай поліфаніі пачуліся дакладныя, напружаныя рытмы. Цыганка? Так. Зараз апячэ агнём — і знікне. Але музыка гучыць не «пацыгански» ў традыцыйным сэнсе гэтага слова. З кожнай хвілінай усё больш трапляеш ва ўладу своеасаблівай мелодыкі, вобраза, што вабіць сваёй неадназначнасцю, што раптам раскрывае перад вамі цэлы свет чалавечых пачуццяў і мар... У гэтым вобразе штосьці ад неабсяжнага рускага раздолля, бяскрайніх палеткаў і разам з тым — адчуваеш у ім артыстычную натуру, пажаночы абаяльную, парывістую, з несумненным адбіткам «сталічнасці».

Па сведчанні А. Купрына, Леў Мікалаевіч Талстой незадоўга да смерці сказаў, што з усіх заваёў чалавечых культур яму шкада было б расстацца з музыкай і... «вось яшчэ з цыганскай песняй». Апавяданне «Пасля балю» напісана ў адзін перыяд з «Жывым трупам», дзе назаўсёды запамінаецца бясконца мілая Машанька, пад спевы якой забываўся на свае пяшчасці Фёдар Пратасаў. Спяваюць цыганы і ў «Вайне і міры», і ў «Двух гусарах»...

...Па сцэне плыве ў танцы цыганка. Яна яшчэ, напэўна, у тым настроі, што валодаў ёю толькі што, у час канцэрта, дзе яна была «прымай», ведала, як парадаваць і павесяліць «гасцей». А цяпер яна адна са сваім сэрцам і думкамі.

Пра што яны думалі, што адчувалі — слазутая Сцеша або Танюша, канцэрты якіх прыводзілі ў захапленне Аляксандра Пушкіна і яго сяброў? «Новы год сустрэў з цыганамі і Танюшай, — пісаў Пушкін П. Вяземскаму 2-га студзеня 1831 года. — Яна спявала песню, у табары складзеную, на голас «Прыехалі сані». Ці ведаеш ты гэтую песню?» Можа, і пра гэтае цудоўнае сяброўства сваіх сапляменніц з вялікім рускім паэтам расказвае цыганка з балета «Пасля балю»?

Альбо яе праніклівы расказ пра тую ноч, калі Аляксандр Блок, забыўшыся на ўсё, слухаў цыганскія спевы? «Яны спявалі бог ведае што... Зусім разарвалі сэрца», — пісаў ён В. Пясту. А ў адным з пісьмаў паэта мы чытаем: «Цыганка, якая спявала пра мноства светаў, потым газарыла мне незвычайныя рэчы, потым — пад праліўным дажджом у цемры ночы на платформе — бліснула доўгімі пальцамі ў брані з вострых пярсцёнкаў, а ўчора абярнулася крывазай зарой (верш)». Ён напісаў пад гэтымі ўражаннямі верш «Сівая раніца».

...Цыганка плыве па сцэне. Нетаропкія стрыманыя рухі. Толькі на імгненне раптам апячэ вачыма, нешта пазбяцае, на штосьці паскардзіцца. «Бред безумья и страсти, бред любви... Невозможное счастье! На! Лови!» І пра гэтую немагнымасць шчасця таксама расказвае цыганка ў балеце. Яно было нерэальнае для яе, як і для герояў твора.

Вядомы рускі мастак К. Каровін успамінае:

— Ты чуеш, — сказаў Шаляпін Сярову. — Канстанціну не падабаецца, што я спяваю. Дрэнна спяваю. А хто, дазвольце вас спытаць, спявае лепш за мяне?

— А вось ёсць. Цыганка адна спявае лепш за цябе.

— Якая цыганка?

— Вера Паніна. Спявае цудоўна. І голас дзівосны.

— Гэта якая ж, дазвольце вас спытаць, Канстанцін Аляксеевіч, Вера Паніна?

— У «Стрэльні» спявае. За пяцёрку песню спявае. І спявае, як трэба.

Яны танцавалі і спявалі за пяцёрку, гэтыя выдатныя артысткі, што прыводзілі ў захапленне Пушкіна і Блока, Талстога і Купрына, Фета і Ляскова... А мары пра шчасце разбіваліся пры першым жа сутыкненні з рэчаіснасцю царскай Расіі, што была іх радзімай, іх болем.

Шэрай пецярбургскай раніцай яна пабрыдзе па вуліцах, стомленая ад поспеху, апладысментаў і прывідных летуценняў, што не даюць спакою палкаму сэрцу. І дзесьці па горадзе будзе цяжка крочыць Юнак, які толькі што перажыў жудасную жыццёвую драму...

У спектаклі «Пасля балю» ёсць шмат цікавага, ёсць натуральна і недахопы. Пра яго пісалі, спрачаліся крытыкі.

Мне ж толькі хочацца сказаць гарачае дзякуй кампазітару Генрыху Вагнеру, пастаноўшчыку Атару Дадзішкіліячі і артысткам Раісе Красоўскай і Веры Елсуковай за натхнёную, праніклівую цыганскую аповесць.

Б. ШАРАШЭЎСКАЯ.

Цыганка — В. Елсукова.

 СЯРОД КНІГ СЯРОД КНІГ

ЗАВЯЗЬ ТАЛЕНТУ

ГАРАЧАЯ хваля пяшчоты, радасці, любві да свету і жыцця захлёстваюць усю істоту маладой паэтэсы Ніны Шкляравай, якой належыць толькі што выпушчаная выдавецтвам «Беларусь» кніга вершаў «Мая вёска». У вершы «Мой верш» аўтар шчыра прызнаецца: «Напісаць хацела пра вайну, ды дзіця спрасоння засмяялася! Выйшаў верш пра шчасце і вясну...» Потым — «напісаць хацела пра бяду, ад якой яшчэ балела рана...», але «кукарэкнуў певень у садку — і у вершы задыміўся ранак», хацелася напісаць пра зло, ды на калені ўзабралася сястрычка — і выйшаў верш пра дабрату.

І гэта натуральна, так і трэба: лепш напісаць, горача і праўдзіва, пра тое, што сапраўды хвалюе цябе, чым выдумваць пачуцці. Праўда ўласнага пачуцця — галоўнае ў паэзіі, яе пачатак і канец.

Канечне, гэту праўду трэба яшчэ «знайсці», выявіць. Трэба яшчэ, каб перажыванне было змястоўным. Каб дасягнуць гэтага, паэт павінен і перажываць сваё пачуццё і глядзець на яго як бы збоку, быць і ў ім і па-за ім, інакш, па-першае, і сам не разбярэцца ў сваіх адчуваннях, а, па-другое, не даб'ецца і суперажывання ў чытача. Н. Шклярава — толькі яшчэ на подступах да вырашэння гэтай неверагодна цяжкай задачы. Справа ўпіраецца ў праблему валодання словам. Калі паглядзець на кнігу «Мая вёска» з гэтага пункту гледжання, то, здаецца, з яе выданнем можна было нават крыху памарудзіць. Менавіта па той адзінай прычыне, што большасць вершаў яшчэ «не адстаялася ў слове», іх эмоцыя нібы расцякаецца па паперы, г. зн. у значнай сваёй частцы губляецца.

Узяць хоць бы рыфмы. Н. Шклярава рыфмуе вельмі прыблізна, нават нібы наўмысна неахайна. Дрэнныя рыфмы тырчаць, як спружыны з канапы. Н. Шкляравай, здаецца, проста не хапае цярпення. У адной страфе яна рыфмуе «раненька — дранікаў» і «соладка — соланкі», а ў наступнай — «паставіць — засмажыць, парай — салам» (верш «Маці»). У першым выпадку — музыка галосных і зычных, якія чаргуюцца, у другім — выпадковых, аддаленых сугуччаў.

Але справа, вядома, не толькі ў рыфмах. Замнога ў вершах Н. Шкляравай сцёртых, зношаных слоў. Зразумела, адкуль бяруцца ўсялякія «духмяны», «блакітны», «сіні», «краса», «шумлівыя лясы»; «зялёныя гаі», «залатое сонца» — яны адпавядаюць таму душэўнаму стану, у якім пакуль знаходзіцца паэтэса, яны шчырыя, як усё ў яе вершах, але для чытача яны ўжо амаль нічога не значаць і не адкрываюць. Пройдзе два-тры гады, і перачытваючы сваю першую кніжку, Н. Шклярава сама, мабыць, заўважыць, як няўклюдна выказвала яна свае думкі і пачуцці, камечучы радкі ненатуральнымі інверсіямі. Вось прыклады:

Калі ж частавалі лазовою
ласкаю —
Мой крык у другім канцы
чулі сяла...

З коміна дым сцелецца дугою
З пахам перасмажаных
грыбоў...

На лоб альховы
Лістон прыліп...

Дзе, скажыце, адшукаць мне
сэрца,
Побач біцца каб з маім
магло?..

Хай жа будзе
Мядовай ніва,
Што ўзрасціла
Цябе яна...

Як нестае гэтым радкам натуральнасці гучання!

Нарэшце, у кнізе «Мая вёска» надараюцца вершы, напісаныя як быццам без пэўнай задумы, якая б пранізвала ўвесь верш ад пачатку да канца. У якасці прыкладу можна назваць, скажам, верш «Хачу быць...», дзе паэтэса, мне здаецца, сама заблыталася ў тым, кім жа ёй «хочацца быць»: грэшніцай, святой, манашкай або, на благі канец, «жаркаю, да сораму, рабінай»...

А вось верш «Смага». Тут ёсць усё: і калодзежная вада, і зара, і трактар, і «аднагодак мілы», і цішыня, і зноў жа «блакіт», а яшчэ і такое:

Мацярынства святое зямлі
І адчайнасць (!) вялікіх
пачуццяў,
Нібы шчодрасць людской
цеплыні
У юнацтве знаходзіць
сутнасць...

Цяжка рабіць з гэтага нейкія высновы, цяжка дайсці да сэнсу гэтых цьмяных радкоў.

З усяго сказанага можна зрабіць вывад, што маладой паэтэсе трэба прайсці яшчэ немалы шлях творчай вучобы.

Але нельга не сказаць пра лепшае, што ёсць у кнізе, пра тыя вершы, якія дазваляюць меркаваць пра магчымасці аўтара і даюць пэўнае ўяўленне пра творчае аблічча маладой паэтэсы.

Характар лірычнай гераіні «Маёй вёскі» — вельмі прывабны: і пяшчотна-жаноцкі, і чалавечна-цвёрды. Яна не баіцца выпрабаванняў, што могуць выпасці на яе долю. «Могуць» — таму што ў гаворцы пра гэта пакуль што ўсё-такі больш дэкларацыі, чым жыцця, больш магчымага, чым наяўнага:

Як стала дарослай —
дарогі камені,
Здзіраючы скуру, кацілі
пад ногі...
Ды ўсё ж я маўчу, не згінаю
калені...

Камені і дарогі — гэта, канечне, яшчэ ўмоўна, алегарычна, а вось ужо зусім рэальнае — «Боль»: гераіня папярэджвае каханага, каб ён не баяўся, што радкі яго пісьма прынясуць ёй пакуты:

Не, не трэба цадзіць, як праз
сіта,
Боль, што можа ўраз апячы.
Мы таксама не лыкам шыты.
Мы надзенем на боль абручы.
Мы сашчэпім так пальцы,
што цені
У смяшлівых вачах
замігцяць...

Вядома, праз сіта сеюць, а не цэдзяць, але наогул гэта не мяняе ўражання ад верша, у якім адбіўся па-жаноцку горды, непахісны характар гераіні. Той жа матыў гучыць і ў вершах «Не шкадуйце» і «Прыходзь», у цудоўнай, па-сапраўднаму народнай прымаўцы, якую — не ўтрымаюся — прывяду цалкам:

Каціўся яблык па роснай
траве...
Ты мяне любіш, а я цябе —
не!
Прэч ідзі, прэч!
Адразу гара з плеч...
Кацілася торба з высокай
гары,
А ў той торбе што хочаш —
бяры.
Хлеб, соль, пшаніца...
Ты не хочаш на мне
ажаніцца?
Каціўся яблык
Ружовага колеру...,
Ты мяне любіш,
А я цябе болей...

Многа вершаў Н. Шкляравай прысвечана роднай вёсцы — адсюль і назва зборніка. Н. Шклярава — у вёсцы, у свеце дзяцінства, палёў, лясоў, рэчкі Цярухі, у родным доме (больш поўна гэта адлюстравалася ў вершы «Родная хата»). З задавальненнем і гордасцю канстатуе Н. Шклярава сваё сялянскае паходжанне («Дачка селяніна — я змалку сялянская»). Але яна не ўсведамляе (і, бадай, добра, што не ўсведамляе, інакш, можа, выйшла б няпраўда) таго факта, што горад яе перарабіў ужо на свой лад або што гэта перапрацоўка ідзе вельмі хутка. Адкуль гэта відаць? Ды хоць бы адтуль, што кахае лірычная гераіня зусім «па-гарадскому» (а для жанчыны каханне — галіна найбольшага праяўлення). Вось, скажам, у цытаваным вершы «Хачу быць» — хіба ў ім вясковая дзяўчына або жанчына? Хіба гэта не псіхалогія: хачу быць святой, грэшніцай, спакусніцай, манахіняй і г. д. Не, канечне. Або вось:

Не шкадуйце вы мяне —
я выжыву!
Жонкаю няверная ці
любоўніцай,
Ці, як людзі кажуць, трэцяй
лішняю...

Усё гэта гаворыцца і цытуецца не ў дакор маладой паэтэсе, наадварот, я вітаю і гэтую праўду ў яе вершах. А праўда гэтая заключаецца ў тым, што пачуццямі гераіня яе вершаў (галоўнымі пачуццямі яе, любоўнымі) — у горадзе: яна не чакае свайго каханага пакорліва, уючы вянок з рамонкаў за гаем, не ўздыхае, седзячы ля расчыненага акна. Яна выступае ініцыятарам сустрэчы:

Дык хутчэй прыходзь, чаго
чакаеш?
Будзе лепей так абоім нам...

І гаворыць усё гэта — аб раздвоенасці чалавечай істоты, аб несумяшчальным біцці сэрца і думкі. Не кажучы нічога пра горад, Н. Шклярава гаворыць пра дыялектычна супярэчлівае ў ім.

І гэта, як ні дзіўна можа здацца, больш за ўсё пераконвае мяне ў тым, што талент маладой паэтэсы і несумненны, і арганічны.

Фёдар ЯФІМАЎ.

Ніна Шклярава. «Мая вёска». Першая кніга паэта. Выдавецтва «Беларусь». Мінск, 1971.

РЭВАЛЮЦЫЯЙ НАТХНЁНЫ

Неўзабаве пасля пераезду ўрада маладой савецкай дзяржавы з Петраграда ў Маскву ў Крамлі быў створаны Курсанцкі тэатр. Ён даваў спектаклі, галоўным чынам, для байцоў аховы Крамля. Адным з кіраўнікоў тэатра быў юны літаратар і энтузіяст аматарскай сцэны Юрый Тарыч. Ён супрацоўнічаў з маладымі тады, а пазней вядомымі дзеячамі савецкага мастацтва — з рэжысёрам і акцёрам М. Нарокавым, рэжысёрам А. Роомам, паэтам У. Лугаўскім, кампазітарам Д. Васільевым-Буглаем і іншымі. «Марат», «Выбух на Лявонцьеўскім», «На дне», «Лес», «Чырвоны трыбун», «Нарадавольцы» «Крах самадзяржаўя» — такія назвы былі на афішы творчага калектыву, спектаклі якога наведвалі і кіраўнікі партыі і ўрада.

Аўтар нядаўна выдадзенай кніжкі «Юрый Тарыч» кіназнаўца Анатоль Красінскі правільна зрабіў, падрабязна спыніўшыся на гэтым, хай сабе і не вельмі доўгім па часе, але важным у працэсе станаўлення арыгінальнага мастака перыядзе. Зарад палітычнай пільнасці ў выбары тэм і вобразаў, атрыманы Ю. Тарычам на пачатку самастойнай мастацкай дзейнасці, быў глыбокі і заўсёды гатовы раскрыцца ў тэмпераментным выступленні гэтага майстра савецкага экрана на рэжысёрскай і літаратурнай ніве. Тады ён і навучыўся быць палымяным публіцыстам у агітках і ўдумлівым псіхолагам ў раскрыцці рэалістычных твораў, гісторыкам, здольным разглядаць мінулае праз прызму сучаснасці і ацэньваць яго з рэвалюцыйных пазіцый. Да кінарэжысуры, якая пазней стала галоўным прызваннем Ю. Тарыча, рыхтавала і яго дзейнасць арганізатара масавых святочных відовішчаў на маскоўскіх вуліцах і плошчах. Тут яму давялося мець справу з вялікімі калектывамі ўдзельнікаў і апаратыўна кіраваць тым, што на мове тэатра і кіно называюць «натоўпам».

З такім творчым багажом ён і пераступіў парог кінастудыі, каб аддаць свой талент маладому мастацтву, якое з першых гадоў Савецкай улады было прызнана самым масавым і самым важным па ўздзеянні на гледача. Мабыць, кожны чытач, знаёмы з гісторыяй нашага экраннага мастацтва, зацікавіцца гэтымі старонкамі, бо яны даюць яшчэ адзін канкрэтны прыклад і раскрываюць канкрэтны лёс аднаго з піянераў мастацкага кінематографа Беларусі. Маючы багаты вопыт сцэнарыста і драматурга ў многіх жанрах гэтага віду літаратуры, Ю. Тарыч натуральна і ўпэўнена ўступае ў рады рэжысёраў. Аўтар кніжкі падрабязна пераказвае змест, сюжэт і характарызуе літаратурныя вартасці твораў, аўтарам якіх выступаў гэты тэарэтычна ўзброены і дасведчаны, арыгінальны і дапытлівы мастак. Упершыню ў навуковае асвятленне трапляюць дакументы і мемуарныя выказванні, знойдзеныя А. Красінскім у архівах, «аднаўляюцца» стужкі, якія, на жаль, не захаваліся ў кінафондах краіны, выкарыстоўваюцца выказванні перыядычных выданняў той пары... Засяродзіўшы ўвагу на рэжысёрскай дзейнасці Ю. Тарыча, даследчык не «забывае» і яго выступленняў на акцёрскай ніве.

Так крышталізуецца партрэт няўрымслівага мастака, які ніколі не ведаў, што такое «спакой» і што такое «стомленасць», умеў сваім гарэннем захапіць і супрацоўнікаў-калег. Напрыклад, многае ў індывідуальнасці выдатных рэжысёраў сучаснага кінематографа, народных артыстаў СССР І. Пырьева і У. Корш-Сабліна адкрыў і замацаваў сваім творчым даверам і падтрымкай Ю. Тарыч.

Наогул А. Красінскаму пашчасціла як даследчыку — ён бачыць героя сваёй кнігі ў «ланцугу» з'яў і імёнаў. Тое, што тарычаўскі фільм «Крылы халопа» манціравала славутая Э. Шуб, а сцэнарыстам «Грышкі-свінапаса» («Лясная быль») быў М. Чарот, «Булат-Батыра» — Н. Зархі, «Капітанскай дачкі» — В. Шклоўскі, кампазітарам «Шляху карабля» — І. Дунаеўскі, а «Нябёсаў» — В. Салаўёў-Сядой, — ва ўсіх гэтых фактах мы, чытачы кнігі, бачым прыклад сапраўды творчай садружнасці талентаў, садружнасці, якую так цаніў гэты рэжысёр.

Думаецца, што раздзел «Ля вытокаў беларускага кіно» мае такі карысны і цікавы пазнавальны матэрыял, што яго перачытаюць і знаўцы гісторыі нашага экраннага мастацтва, і моладзь, для якой тыя гады — мінуўшчына. Скажам, А. Красінскі так «паказвае» тую ж «Лясную быль», што і тыя, хто не бачыў карціну нават у фрагментах, атрымліваюць яркае ўяўленне пра стужку і знаёмяцца з грунтоўным эстэтычным аналізам твора. Таксама падрабязна разгледжаны аўтарам і фільм «Адзінаццатае ліпеня», які быў пэўнай вяхой у развіцці нацыянальнага беларускага кінамастацтва.

Багатая на інфармацыю і цікавыя фактычныя звесткі, змястоўная ў аналізе творчасці выдатнага рэжысёра Юрыя Тарыча, кніга пакідае добрае ўражанне як манаграфічны партрэт мастака, натхнёнага рэвалюцыяй. Трэба спадзявацца, што на яе звернуць увагу шматлікія аматары і прыхільнікі дзесятай музы мастацтва.

В. ІВІН.

А. Красінскі. «Юрый Тарыч». На рускай мове. Выдавецтва «Навука і тэхніка», Мінск, 1971.

МІКОЛКА ЕДЗЕ НА ВЯРБЛЮДЗЕ

Міколку Паўлаву, вучню адной з мінскіх школ, вельмі пашчасціла. Цэлае лета ён правёў у вандроўках па краіне казак і легендаў — Егіпце. Сюды, у гэтую краіну, узяў яго з сабой бацька, які працаваў тут на адной з найвялікшых будоўляў свету.

Дзе толькі ні пабываў Міколка, чаго толькі ні пабачыў: ездзіў на вярблюдзе, хадзіў па зямлі горада, які праглынула пустыня, спускаўся ў сутарэнні старажытных пірамід, якім па пяць тысяч гадоў...

Міколкавым здзіўленням у гэтай краіне, здавалася, не будзе канца. Але найвялікшае з іх, нечаканае нават для Міколкі, было на Асуанскай плаціне.

«Я глядзеў на плаціну,— расказвае Міколка,— яна надзвычай прыгожая, з ружовага граніту, і аж свеціцца на сонцы... Нічога больш велічнага, чым Асуанская плаціна, я ніколі ў жыцці не бачыў».

3.600 метраў яе даўжыня. На 111 метраў узвышаецца яна над вадой, ад верху плаціны да дна Ніла — 980 метраў. 14 метраў шырыня дарогі, якая ідзе па плаціне.

Гэтыя лічбы яму назваў бацька. Міколка зноў у незвычайным захапленні. «Вось дык перагародка!» — усклікае ён, гледзячы на магутны вадаспад, які вырываўся праз гранітныя тунелі, падаў, кіпеў, пеніўся, бушаваў...

Міколка Паўлаў — герой аповесці Галіны Васілеўскай «Я еду на вярблюдзе», аповесці, скажам адразу, цікавай. І не столькі тымі дзівосамі, якія пабачыў Міколка за дні сваіх вандровак, што ўжо само па сабе мае вялікую чытацкую цікавасць, колькі шчырасцю і непасрэднасцю самога героя, яго паводзінамі, думкамі. Падарожнічаючы па егіпецкіх пустынях, наведваючы славутыя каірскія музеі, Міколка ніяк не можа прызвычаіцца да многіх рэчаў. Ужо зварот «сэр» выклікае ў яго пярэчанне. «Я — не сэр, я — Міколка»,— спрабуе пераканаць ён тых, хто гэтак звяртаецца да яго. І гэтае Міколкава пярэчанне выклікае ў нас прыемную ўсмешку.

Пісьменніца вельмі арганічна «ўжылася» ў ролю хлопчыка. Яна, бадай, ні ў чым (ні ў мове, ні ў паводзінах, ні ў псіхалогіі) не фальшывіць.

Праўда, сям-там пісьменніца ўсё ж навязвае не характэрныя яму рэплікі, заўвагі, вывады. Асабліва гэта адчуваецца ў канцоўцы. Плынь гутарковай мовы тут перабіваецца апісальніцтвам, а яно заглушае Міколкаву індывідуальнасць, псуе натуральнасць апавядання.

Ул. СОДАЛЬ.

Галіна Васілеўская. «Я еду на вярблюдзе». Выдавецтва «Беларусь». Мінск. 1970.

ПА ЖЫЦЦІ — З ПЕСНЯЙ

100 ГАДОЎ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ У. ТЭРАЎСКАГА

УСЁ сваё жыццё прысвяціў Уладзімір Васілевіч Тэраўскі папулярызацыі беларускай народнай песні. Збіраў, запісваў, выхоўваў выканаўцаў, кіраваў хорамі. Любіў песню бязмежна, самааддана, не ўяўляў сабе жыцця без яе. На жаль, захавалася занадта мала звестак, каб было магчыма поўна і глыбока расказаць пра той скарб, які ён падараваў беларускаму музычнаму мастацтву. Але паспрабуем узнавіць усё, што сёння магчыма.

Нарадзіўся Уладзімір Васілевіч 11 лістапада 1871 года ў мястэчку Раманава былога Слуцкага павета. Дырыжыраваць хорам пачаў ужо ў 16—17 гадоў, а ў 19 уладкаваўся на работу ў Мінску. Пасля адбыцця вайсковай службы У. Тэраўскага запрашае ў свой хор вядомы дырыжор Славянскі. Наступны перыяд дзейнасці Тэраўскага звязаны з кіраўніцтвам аматарскімі хорамі на Урале. Як сведчыць газета «Савецкая Беларусь» ад 28 жніўня 1927 года, дзейнасць яго там была вельмі плённай. Канцэрты хораў Шайтанскага і Білімбаеўскага заводаў пад кіраўніцтвам Уладзіміра Васілевіча карысталіся незвычайным поспехам, прычым значную частку праграмы складалі беларускія народныя песні.

З 1901 года У. Тэраўскі зноў працуе ў Мінску. У час першай сусветнай вайны палкавы Тэраўскага не раз выступаў у шпіталях перад параненымі, і зноў беларуская песня абавязкова ўключалася ў рэпертуар.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года Мінскі аматарскі хор, якім кіраваў Уладзімір Васілевіч, быў рэарганізаваны ў Беларускі народны хор. Тады ж ён пачынае сваю дзейнасць у прафесійным мастацтве. Калі было арганізавана Першае таварыства беларускай драмы і камедыі на чале з У. Фальскім і Ф. Ждановічам, музычную частку гэтага аб'яднання ўзяў на сябе У. Тэраўскі.

Нягледзячы на часовую акупацыю тэрыторыі Беларусі кайзераўскімі войскамі, стваральнікам таварыства ўдалося 19 мая 1918 года адкрыць у Мінску Народны дом імя Максіма Багдановіча, У. Тэраўскі — аўтар музыкі да п'есы «Бязвінная кроў», якую У. Галубок напісаў спецыяльна да адкрыцця дома. Мяркуючы па ўспамінах прысутных, музыка садзейнічала поспеху ўсяго спектакля, паставленага Ф. Ждановічам. З гэтага часу пачынаецца супрацоўніцтва Тэраўскага і Галубка, якое дало выдатны плён: з'явіліся цікавыя творы для тэатра, напісаныя ў жанры музычнай драмы.

Далейшая творчая дзейнасць У. Тэраўскага звязана з Першым беларускім дзяржаўным тэатрам. Для гэтага калектыву, які меў у сваім складзе таксама хор, балетную трупу і сімфанічны аркестр, Уладзімір Васілевіч напісаў музыку да такіх спектакляў, як «На Купалле», «Каваль-ваявода», «Машэка», «Кастусь Каліноўскі» і інш. На думку Змітрака Бядулі, у спектаклі «На Купалле» багацце выкарыстаных народных мелодый адыграла не меншую ролю ў поспеху спектакля, чым драматургія М. Чарота. Дадамо, што для пастаноўкі «На Купалле» У. Тэраўскі гарманізаваў народныя песні «Ой, рана на Івана», «Сёння Купала, а заўтра Ян», «Купала ночка маленькая», «Купалінка», «Цёмная ночка» і інш. Частка музычных нумароў, у тым ліку вакальныя ансамблі і хоры, была напісана самім Уладзімірам Васілевічам.

Якое значэнне мелі ў музычным жыцці тагачаснай Беларусі гарманізацыі і апрацоўкі У. Тэраўскага, сведчыць той факт, што ўжо ў 1920 годзе ў Мінску быў выдадзены зборнік 25 яго арыгінальных песень і апрацовак, а праз некаторы час у Берліне выйшаў з друку складзены ім зборнік «Лірнік», у які ўвайшло 100 твораў. Да ліку творчых здабыткаў У. Тэраўскага ў песенным жанры трэба аднесці і яго зборнік «Вацці песеннік», складзены з трыццаці арыгінальных песень.

Гаворачы пра значэнне творчай спадчыны У. Тэраўскага, нельга не адзначыць, што ягоная музыка да драматычных спектакляў, у якой кампазітар выкарыстоўваў шматбаковыя сродкі музычнай выразнасці, садзейнічала падрыхтоўцы слухачоў да ўспрыняцця складаных форм музычнага тэатра, што нарадзіўся на Беларусі ў пачатку трыццатых гадоў. Дарэчы, такія оперы, як «Кветка шчасця» А. Туранкова, «Машэка» Р. Пукста, «Кастусь Каліноўскі» Д. Лукаса, у пэўнай ступені могуць разглядацца як «нашчадкі» аднайменных драматычных твораў, што ішлі на сцэне Першага БДТ з музыкай У. Тэраўскага.

І сёння, калі мы гаворым пра росквіт музычнай культуры Савецкай Беларусі, нельга абмінуць яркую дзейнасць Уладзіміра Васілевіча Тэраўскага, 100 гадоў з дня нараджэння якога споўнілася гэтымі днямі.

Л. ІВАШКОЎ.

З почтаў Ліма

ДАЙЦЕ СВЕЖУЮ ГАЗЕТУ

У кожнай працоўнай раніцы нашых гарадоў ёсць адзіная агульная прыкмета. На прыпынках грамадскага транспарту, у аўтобусах і трамваях шалясцяць старонкі свежых газет. Будні, але заўсёды хвалюючы момант сустрэч чалавека з навіной!

Вось за гэтай навіной мы і прыйшлі ў адзін з газетных кіёскаў Віцебска. Блакітная шыльдачка кіёска ў самым цэнтры горада, на рагу вуліц імя Леніна і «Праўды», побач з гарвыканкомам. Ранішнія гадзіны пік ужо адшумелі, па вуліцы снавалі паўпустыя трамваі. Нікога не было і ля кіёска.

— Нам, калі ласка, «Советскую Белоруссию», сённяшні нумар.

— Прабачце, няма...

Мы меркавалі, што спазніліся, што адну з папулярных газет рэспублікі ўжо даставілі прагнаму да навін чытачу. Што зараз яе чытаюць ва ўсіх кутках буйнага індустрыяльнага горада. Аднак высветлілася, што ў кіёск ніводная, ні цэнтральная, ні рэспубліканскія газеты, датаваныя сённяшнім днём, яшчэ не паступалі.

Мы прайшлі па вуліцы Леніна, цэнтральнай вуліцы Віцебска, і ў кожным кіёску нам адказвалі:

— Свежыя газеты будуць не раней дзесяці гадзін...

— І так кожны дзень?

— Так кожны дзень,— пачулі ў адказ.

Прыгожыя газетныя кіёскі, якіх шмат у Віцебску і якія растуць, як грыбы пасля дажджу, жылі ўчарашнім днём.

Паэт Пятрусь Броўка ў адным з вершаў вобразна параўноўваў пустую паштовую скрынку, у якую спазнілася газета, з ледзяным склепам. Яшчэ горшае ўражанне пакідаюць газетныя кіёскі без свежай перыёдыкі.

А на газетных вітрынах свежая перыёдыка з'яўляецца раней, чым у кіёсках. Недзе ўжо пасля васьмі гадзін раніцы па вуліцах ідуць расклейшчыкі газет. І неўзабаве на кожнай вітрыне свеціцца навіной свежы нумар. Такім чынам, толькі ўнутрыведамасныя прычыны стрымліваюць своечасовае паступленне ў кіёскі «Саюздруку» свежай перыёдыкі, якая прыходзіць у Віцебск раніцой.

Газетныя вітрыны — важная крыніца навіны. Тут нельга не ўспомніць увагу Уладзіміра Ільіча Леніна да такога спосабу распаўсюджвання перыядычных выданняў. У сваім артыкуле «Аб рабоце Наркамасветы» У. І. Ленін указвае на вялікую эфектыўнасць «расклейкі» газет, мэтазгоднасць такой формы распаўсюджвання друку, падкрэсліваў, што да кожнага газетнага нумара трэба адносіцца пагаспадарску.

А вось парадак размяшчэння газетных вітрын у Віцебску не заўсёды бясспрэчны. На плошчы Чарняхоўскага — буйнейшым скрыжаванні горада, праз якое штодзённа перамяшчаецца шматтысячны паток людзей, толькі адзіны газетны стэнд. І той, дарэчы, размешчаны не ў самым ажыўленым месцы. Такое ж становішча — на плошчы Леніна, дзе знаходзяцца вялікі кінатэатр, палац культуры ўпраўлення бытавой абслугі, шматлікія магазіны, прадпрыемствы бытавой абслугі. Мэтазгодна было б абсталяваць газетныя вітрыны ля будынкаў вышэйшых навучальных устаноў горада, тэхнікумаў, ля многіх прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў.

Не лепшае становішча з абсталяваннем газетных вітрын у некаторых раёнах вобласці. Справа іншы раз даходзіць да курʼёзаў. У Паставах, напрыклад, у памяшканні аўтавакзала, газета знаходзіцца за... драцянай сеткай. Дзіўныя меры для аховы газеты... тыднёвай даўнасці.

На турбазе «Браслаўскія азёры» летам, у разгар масавага адпачынку, нялёгка ў мясцовым аддзяленні сувязі набыць свежую газету. Пошта, дарэчы, прыходзіць сюды пасля 14 гадзін. Адзіная вітрына абнаўляецца свежай газетай далёка не кожны дзень.

Прыходзілася чуць, што ў некаторых дачах адпачынку пабудаваны лёгкія павільёнчыкі са сціплай вывескай «чытальня». Туды заўсёды даставляюцца свежыя газеты, часопісы. Зразумела, што мэтазгоднасць такіх чытальняў вызначаецца колькасцю адпачываючых. А вось некалькі газетных вітрын з рознымі выданнямі не цяжка абсталяваць у любым месцы.

Лёгкі павільёнчык-чытальня, думаецца, не пуставаў бы ў людным парку, скверы, асабліва ўлетку.

Абсталяванне газетных вітрын, павільёнаў-чытальняў, зразумела, патрабуе адпаведных сродкаў. Але гэтыя выдаткі не перавышалі б тыя, іншы раз залішнія сродкі, што ідуць на абстрактную, далёка не танную рэкламу тыпу «Выпісвайце і чытайце»... «Саюздрук» павінен, як кажуць, прапанаваць тавар, паказаць яго аблічча. І вось гэтая самарэклама выдання будзе і больш дзейсная, і больш патрэбная, больш танная.

У гэтай справе важная роля належыць грамадскім распаўсюджвальнікам друку. Бадай у кожным вялікім калектыве не цяжка абсталяваць адну або некалькі газетных вітрын, вывешваць на іх газеты, якія ідуць па ведамаснай падпісцы. Ініцыятарамі такой работы могуць і павінны стаць грамадскія распаўсюджвальнікі друку.

Шмат работы прадстаіць камсамольскім актывістам. У Віцебску зараз зусім мала вітрын з маладзёжнымі выданнямі рэспублікі.

Віцебск — важны культурны цэнтр вобласці. Тут працуюць Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр імя Якуба Коласа, шмат культасветустаноў, мастацкія майстэрні... І нідзе ў горадзе не знойдзеш вітрыны з газетай «Літаратура і мастацтва».

«Саюздрук» — істотнае звяно ў ланцугу «падзея — газета — чытач». Работа гэтай важнай службы падпарадкавана аднаму з асноўных фактараў усёй газетнай работы — аператыўнасці. Вось аб гэтым і хацелася напомніць калектыву абласнога аддзялення «Саюздрук».

А. ПАЛОНСКІ,
В. МАГІЛЬНЫ,
журналісты.

ПАКУЛЬ ШТО НА ПЛАНШЭТАХ...



Праект будынка Гомельскага прафтэхвучылішча.

У Саюзе архітэктараў БССР адкрылася выстаўка работ Беларускага праектна-тэхналагічнага інстытута Белмясцпрампраект. Тут работы апошніх год, цікавыя па аб'ёмна-планіровачных і канструктыўных рашэннях. Ажыццёўленыя і такія, што толькі распрацоўваюцца.

Архітэктары Белмясцпрампраекта прапанавалі праект рэканструкцыі Мінскага маторнага завода. Узбудаваюцца карпусы дызельнага цэха № 2, цэнтральнай заводскай лабараторыі, інжынерны корпус з размешчанымі ў ім кіраўніцтвам завода, паліклінікай, сталовай. У цэхах зменяцца інтэр'еры. Будзе больш святла, прасторы, будуць створаны ўсе ўмовы для павышэння прадукцыйнасці працы.

Распрацаваны таксама праект рэканструкцыі Мінскага трактарнага завода. Фасады яго ўпрыгожаць анадзіраваны алюміній, паліраваны мармур, граніт.

Вось праект абнаўлення швейнай фабрыкі ў Брэсце. Фабрыка размешчана ў цэнтры жылога раёна, акружана грамадска-бытавымі і жылымі будынкамі. Усё гэта ўлічвалі архітэктары, прапаноўваючы новыя прыёмы ашклення і аздаблення цэхаў. Фабрыка будзе важным горадабудаўнічым акцэнтам.

Архітэктары прапанавалі і праект рэканструкцыі свайго інстытута. У адзінае цэлае аб'ядноўваюцца некалькі розных па прызначэнні будынкаў, атрымліваецца цікавы аб'ём.

Увагу наведвальнікаў выстаўкі прыцягваюць таксама праекты друкарні ў Барысаве, мэблевага прадпрыемства для горада Броды, што на Украіне, прафтэхвучылішча ў Гомелі, трыкатажнага камбіната ў Вінніцы. Па выстаўцы представлены таксама работы аддзела прамысловай эстэтыкі інстытута.

Л. КАРПАВА.



Праект пашыранага вытворчага будынка інстытута Белмясцпрампраект.

НА БЛАКІТНЫМ ЭКРАНЕ — «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ»

(Заканчэнне. Пачатак на 8-й стар.)

справа, што пісьменнік часам вельмі стрыманы ў сваім знешнім эмацыянальным праяўленні. У такім выпадку работнікам тэлебачання трэба знайсці спосаб «разгаварыць», прымусіць яго «раскрыцца».

Пісьменніку трэба памятаць, што тэлеэкран патрабуе ад выступаючых умення наладжваць кантакт з нябачнай аўдыторыяй. Застаўшыся сам-насам з гледачамі, ён гутарыць з кожным паасобку і адначасова з мільёнамі людзей. І для таго, каб авалодаць увагай чытачоў, зрабіць іх «сааўтарам» сваіх думак і пачуццяў, трэба быць шчырым і эмацыянальна актыўным субяседнікам. Практыка паказала, што людзей, надзеленых «талентам шчырасці», якія могуць свабодна трымацца перад тэлекамерай, умеюць імправізаваць і цікава расказваць, заўсёды слухаюць з вялікім задавальненнем. Сакрэт поспеху такіх выступленняў у тым, што перад гледачамі ў дадзеным выпадку раскрываюцца таксама характар расказчыка і яго непаўторныя рысы.

Тэлеэкран — гэта своеасаблівы каталізатар зацікаўленасці да кніг і служыць добрым компасам у бурлівым кніжным моры. Тэлебачанне, ажыццяўляючы сувязь чытача з пісьменнікам, далучае мільёны людзей да духоўных каштоўнасцей, якія раней былі набыткам даволі акрэсленага і вузкага кола аматараў літаратуры. Пісьменнік павінен зразумець, што тэлебачанне

РАБОЧЫ ТЭАТР

НАРОДНАМУ ТЭАТРУ МІНСКАГА ТРАКТАРНАГА ЗАВОДА—25 ГАДОЎ

АДНОЙЧЫ мне давялося бачыць, як урачыста ад заводскай прахадной да Палаца культуры ішоў Фёдар Конанавіч Самусеў. У рабочым жыцці ветэрана было нямала дзён, калі ён падымаўся на ганак палаца віноўнікам урачыстасці, але гэтым разам праслаўлены каваль, Герой Сацыялістычнай Працы ішоў з іншым клопатам. Якім?.. Калі прэм'ера пагодзінскай «Паэмы аб тапары» была пастаўлена на сцэне палаца сваім народным тэатрам — гледачы прачыталі ў праграме спектакля: «Кансультант — Ф. К. Самусеў».

«Паэма аб тапары» М. Пагодзіна — аб рабочым класе. І Самусеў вельмі дапамог артыстам і рэжысёру заводскага тэатра зрабіць па-сапраўднаму рабочы спектакль, героямі і артыстамі якога былі калегі Самусева: кавалі, ліцейшчыкі, тачыльшчыкі.

Я расказваю пра гэты факт як пра радок з біяграфіі не толькі Самусева, але і народнага тэатра трактарабудаўнікоў. Наш тэатр — рабочы. Натуральна, што рабочыя завода бываюць тут не толькі ў глядзельнай зале, але і на сцэне, на рэпетыцыях, як дарадчыкі і кансультанты. У гэтым — сіла тэатра. А калі адбываецца прэм'ера, то ў першых радах партэра сядзяць лепшыя рабочыя завода, людзі, без якіх наш тэатр не можа жыць, такія, як Самусеў — гонар завода.

Невыпадкова, што пад адным дахам Палаца культуры — два музеі. У адным экспануецца прадукцыя прадпрыемства, яго працоўная слава, у другім — экспанаты дваццаціпяцігадовай гісторыі рабочага тэатра. Завод і тэатр кроўна блізкія, тэатр — своеасаблівы цэх завода. Фотаздымкі, праграмкі, эскізы дэкарацый расказваюць аб 54 прэм'ерах на сцэне тэатра, аб 2000 спектакляў, паказаных тут. Амаль мільён гледачоў Беларусі, Масквы, Ленінграда, Кіева, Вільнюса, Калінінграда, Клайпеды, Ліепаі пабывалі на гэтых спектаклях.

РАБОЧЫ тэатр... Рабочы артыст... Гэта — цэлае жыццё. Багатае, прыгожае. Яго відаць хоць і ў акцёрскай дынастыі Крамарэнкаў. Гэта сям'я мае цікавую біяграфію і цікавы творчы лёс.

Вольга Гаўрылаўна Крамарэнка знайшла дарогу да тэатра яшчэ ў трыццатыя гады, калі актыўна ўдзельнічала ў вядомай «сіняй блузе». Маці яе, урач-стаматолаг, і бацька, ваенны фельчар, падтрымлівалі захапленне дачкі, і гэтае раннее захапленне Вольга Гаўрылаўна пранесла праз усё жыццё. У 1950 годзе ў тэатральны калектыў трактарнага завода яна прыйшла ўжо сапраўднай актрысаю, у рэпертуары якой была галоўная роля з «Любові Яравой» К. Трэнёва, вобразы маці з «Славы» В. Гусева, Лідзіі — з «Платона Крэчата» А. Карнейчука, Вольгі — з «Падзі Сярэбранай» Л. Лянова, Машы — з «Трох сясцёр» А. Чэхава.

— Калі я першы раз прыйшла ў драмгурток трактарнага завода, — з усменкаю прыгадвае Вольга Гаўрылаўна, — мяне выбралі старастаю, даручылі сачыць за парадкам на рэпетыцыях. І я заўсёды кажу сваім маладым калегам: «Не цурайцеся чарнавой работы ў мастацтве. Грамадская работа дапамагае акцёру наблізіць сваё «я» да мастацкага вобраза. Ды і наогул рабочы тэатр — гэта вялікая грамадская справа».

З прыходам у тэатр Крамарэнка знайшла і сваё сямейнае шчасце. Тут, пасля доўгай разлукі, яна, нарэшце, сустрэлася з дачкою Валянцінай і сынам Мікалаем, з якімі развяла вайна: маленства дзяцей прайшло ў партызанскіх лясах, а сама Вольга Гаўрылаўна была франтавой разведчыцай; потым, цяжка параненая, доўгія гады лячылася ў шпіталях.

Шматпакутны жыццёвы вопыт ляжыць у аснове ўсіх яе роляў: Вольгі Мікалаеўны — у «Чужым дзіцяці», Лукер'і — у «Вяселлі з пасагам», маці — у «Паэме аб тапары» і іншых. Шмат цікавых вобразаў стварыла Вольга Гаўрылаўна на сцэне тэатра трактаразаводцаў. Адной з першых у калектыве яна атрымала пачэснае званне артысткі народнага тэатра. А разам з маці на рэпетыцыі і спектаклі ідуць дзеці. Не гледачамі — таксама ўдзельнікамі спектакляў. Ёсць пастаноўкі, дзе маці іграе разам з дзецьмі. Як «Сарачынскі кірмаш», дзе Вольга Гаўрылаўна цудоўна сыграла Макрыну, дачка Тамара — Парасю, сын Павел — Грыця. З прэм'ер яны прыносяць кветкі дадому, да партрэта бацькі, які загінуў у баях за Радзіму, за сённяшні шчаслівы дзень.

— Прыгожыя людзі, — кажа мне Фёдар Конанавіч Самусеў на адной з прэм'ер.

Каго ён меў на ўвазе? Артыстаў, такіх, як Вольга Гаўрылаўна, ці герояў? І тых і другіх, бо акцёр і яго сцэнічны герой часта жывуць адным жыццём. А інакш не варта выходзіць на сцэну. У нашым тэатры гэта ведае кожны артыст. Ім прывіў гэтае адчуванне перш за ўсё галоўны рэжысёр тэатра Аляксей Мікалаевіч Бяляеў.

ТЭАТР завода самадзейны, але выйсці на яго сцэну — вялікі гонар для любога маладога артыста. Гэты гонар даецца не адразу. Падрыхтоўка акцёраў тут пачынаецца з «азоў», у двухгадовай студыі, дзе заняткі ідуць па праграме Мінскага тэатральна-мастацкага інстытута. У вучэбных класах тэатра чатыры разы на тыдзень бываюць заняткі па акцёрскім майстэрстве, рухах на сцэне, тэхніцы мовы, музычнай грамаце, па гісторыі мастацтваў. Тут выкладаюць вядомыя ў Беларусі артысты, работнікі тэатральна-мастацкага інстытута. Пяць разоў студыя выпускала на сцэны тэатраў сваіх выхаванцаў. Кожны выпуск — свята для тэатра. Студыйцы сёлетняга выпуску падрыхтавалі спектакль «Цудоўны сплаў» па п'есе У. Кіршона, і гэты спектакль быў адразу ўключаны ў асноўны рэпертуар тэатра, увайшоў у дэкадны спектакль, якія мы будзем паказваць на сцэнах тэатра імя Янкі Купалы і Палаца культуры прафсаюзаў з нагоды 25-годдзя народнага тэатра.

Вялікі давер у нас да сваёй студыі. Кожны артыст тэатра прайшоў праз яе. Дванаццаць выхаванцаў студыі сталі прафесіянальнымі артыстамі. Рыгор Белацаркоўскі цяпер у Брэсцкім тэатры імя Ленінскага камсамола Беларусі, Таццяна Мархель — артыстка вядомага тэатра імя Якуба Коласа, Рэгіна Дамброўская прынята ў Акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы.

Упэўнены, што невыпадкова народны тэатр трактарнага завода мае рэпутацыю лепшага самадзейнага тэатра рэспублікі. Тут цікава пастаўлена не толькі творчае жыццё, але, што таксама важна, і арганізацыйная работа.

ЁСЦЬ у нас «Памятка артыста, удзельніка і студыйца народнага тэатра». У ёй — 19 запаветаў, абавязковых для кожнага. І сярод іх — такія: «Адзін — за ўсіх, усе — за аднаго», «Думай не толькі аб сваёй ролі, але і аб агульным ансамблі», «Кожны — не толькі артыст, але і работнік пастановачнага цэха, удзельнічае ў вырабе дэкарацый, рэквізіту, бутафорыі», «Катэгарычна забараняецца хадзіць без справы, калі ідуць спектаклі ці рэпетыцыі» і іншыя. Такая памятка, як і многае іншае, дапамагае выхоўваць сапраўды рабочых артыстаў, іх грамадзянскія якасці. Канечне, нормы ўнутранага жыцця тэатра выпрацоўваліся гадамі, калектыўна. Адзін рэжысёр не можа сфарміраваць аблічча тэатра. Наш рэжысёр і па натуры супраць усялякай келейнасці. На яго творчую кухню заўсёды можа прыйсці кожны, каму гэта цікава.



А. Бяляеў праводзіць рэпетыцыю. Фота Ул. КРУКА.

За сезон тэатр, звычайна, ставіць тры-чатыры прэм'еры, і кожны раз, калі пасля апладысментаў залы гасне рампа, за кулісамі ў цёплай таварыскай абстаноўцы праводзіцца традыцыйны круглы стол — сустрэча рабочых артыстаў з грамадскасцю. Сюды запрашаюцца дырэктар завода, сакратар парткома, нашы лепшыя трактарабудаўнікі — Г. Мягкова, Е. Клімчанка, Героі Сацыялістычнай Працы Ф. Самусеў і Р. Прусава. Прыходзяць на сустрэчу народныя артысты СССР П. Малчанаў і З. Стома, народная артыстка рэспублікі С. Станюта, прадстаўнікі з БТА, навуковыя супрацоўнікі інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук. Гэта — пашыраны склад мастацкага савета тэатра. Пачынаецца размова аб прэм'еры, аб рэпертуары, майстэрстве акцёраў, рэжысуры. Тут жа вырашаюцца і матэрыяльныя цяжкасці тэатра.

Доўгая бывае размова. Але цікавая заўсёды. А пасля гэтай размовы яшчэ Павел Сцяпанавіч Малчанаў, звычайна, папросіць артыстаў:

— Сябры, а цяпер можа пройдзем па кавалках спектакль? Пасля прэм'еры ўбяром рэдакладнасці.

ТАКОЕ жыццё нашага самадзейнага калектыву. Тэатр не старэе з гадамі, наадварот — набывае вопыт, усё большую любоў свайго рабочага гледача.

Калі азірнуцца назад — колькі цікавых спектакляў адбылося на яго сцэне! Тут пастаўлены п'есы Янкі Купалы «Паўлінка», «Раскіданае гняздо», «Прымакі», Міхася Чарота «Мікітаў лапаць». А як цёпла сустракалі нашы гледачы спектаклі па п'есах Івана Козела «Папараць-кветка» і «Над хвалямі Серабранкі»! Тэатр вярнуў да жыцця на сцэне забытыя п'есы выдатнага акцёра, рэжысёра і драматурга Еўсцігнея Міровіча — пастаўлены яго «Графіня Эльвіра» і «Тэатр кунца Япішкіна». Больш за 600 разоў паказваліся яны гледачу. Шмат творчай радасці прынеслі нам «Навальніца», «Позняе каханне», «Ваўкі і авечкі» А. Астроўскага, «Вяселле Крачынскага» А. Сухаво-Кабыліна, «Лекар паняволі» Мальера, водэвіл А. Чэхава «Мядзведзь», «Юбілей», «Прапанова». Вялікі поспех выпаў на нашай сцэне творам савецкай драматургіі, такім, як «Калінавы гай» А. Карнейчука, «Таня» А. Арбузава, «Троцкія патэтычнай» М. Пагодзіна, «Снежная каралева» Я. Шварца і многім іншым.

Тэатр трактаразаводцаў жыве цікава, творча. Многае ў гэтым яго жыцці радуе і ўдзельнікаў спектакляў, артыстаў і гледачоў. Вядома, ва ўсякай справе поспехі не выключаюць цяжкасцяў. Наш калектыў іх не баіцца. Праблем хапае. Менш складаных, больш складаных. Аб іх думаем сёння, будзем думаць і заўтра. Выраішым іх — больш цікавай, радаснай, плённай будзе праца.

Скажам, такая праблема — ці не наспела патрэба даць тэатру імя? Чалавек мае імя, горад мае імя, а тэатр? Тэатр — таксама жывы арганізм. А называецца дзіўна: «Тэатр ДК МТЗ».

Якое імя? Ды хіба малы заслугі тэатра ў рабоце над драматургіяй выдатнага беларускага дзеяча сцэны Еўсцігнея Афінагенавіча Міровіча? Нашаму тэатру дарагое імя яго, мы даражым яго драматургіяй, і хіба нельга даць імя Міровіча тэатру, які мае жыццёвую сілу, сваё творчае аблічча, цудоўны калектыў і цудоўную перспектыву.

РАБОЧАМУ тэатру завода — 25. Тэатр малады і ўжо — сталы. Будзем верыць, што такім ён і застанецца: маладым і сталым. Такім ён патрэбен сваім гледачам. У такім — цікава працаваць творчаму калектыву.

Іван СУХАРУКАЎ,
работнік Дома культуры трактарнага завода.

дае магчымасць імгненна данесці свае думкі і словы да мільёнаў чытачоў. Бо якія б ні былі вялікія тыражы кнігі, якую б шырокую аўдыторыю ні прадстаўлялі другія віды мастацтва, яны ніколі не параўнаюцца з «тыражом» і аўдыторыяй тэлебачання. Але справа не толькі ў адной колькасці. Тэлебачанне можа не толькі тактоўна рэкамендаваць той ці іншы твор, але і выхаваць добры эстэтычны густ чытача, непасрэдна ўмешвацца ў працэс успрыняцця кнігі.

І вось тут на дапамогу гледачу павінен прыйсці тэлевізійны крытык ці, лепш сказаць, літаратурны каментатар. (Неяк так склалася, што літаратурная крытыка, якая гучыць у эфіры, не прымаецца пад увагу, быццам гэта справа другарадная і несур'ёзная. Штотыднёвік «Літаратура і мастацтва», спадзяёмся, закране гэтае пытанне ў сваёй цяперашняй дыскусіі). Зразумела, крытыка ў друку больш аналітычная, яна разлічана на ўважлівае чытанне. Тэлебачанне ў гэтых адносінах больш дэмакратычнае. Скажам, літаратурную перадачу на блакітным экране можа глядзець і школьнік, і калгаснік, і вучоны, і літаратар. І, канечне, пры такіх умовах трэба ўлічваць густы многіх катэгорый людзей. Таму тэлевізійную перадачу робяць у больш займальнай і цікавай форме: інакш яе проста не будуць глядзець. Адначасова тэлевізійным работнікам трэба займальнасць формы спалучаць з глыбокім аналізам. Але, зноў-такі, усё сыходзіцца на літаратурным каментатары: паспрабуй знайсці яго. Цяжка адшукаць чалавека, які б свабодна трымаўся на тэлеэкране, меў бездакорны літаратурны густ, быў дасведчаны ва ўсіх пытаннях літаратурнага жыцця. Пакуль што аб такім літаратурным каментатары застаецца толькі марыць.

Але давайце ўявім сабе, што такі тэлевізійны літаратурны крытык-каментатар знайшоўся. Як бы ажывіліся старонкі тэлечасопіса «Літаратурная Беларусь»! Скажам, ідзе тэлевыпуск, прысвечаны чарговаму выхаду зборніка «Дзень паэзіі». (Дарэчы, чаму б не арганізаваць гэтую перадачу з бібліятэкі ці студэнцкай аўдыторыі? Чаму б не наладзіць дыялог паміж паэтам і чытачом?) Выступаюць паэты, расказваюць гісторыю нараджэння таго ці іншага верша. І вось бярэ слова крытык. Ён аналізуе, параўноўвае, прыводзіць цікавыя літаратурныя аналогіі. Завязваецца ажыўленая дыскусія. Думаецца, гледачам было б вельмі карысна паслухаць і стаць яе заочнымі саўдзельнікамі.

Я ўжо адчуваю, як мой апанент, работнік тэлебачання, скептычна ўсміхаецца. Маўляў, добра табе даваць разумныя парады, лётаць на крылах фантазіі. А ты вось паспрабуй цягнуць маё ярэмца, знайдзі гэтага ідэальнага крытыка-каментатара. Што ж, ён мае рацыю. Але думаць аб гэтым неабходна, шукаць такіх людзей трэба тым больш актыўна.

Безумоўна хацелася б, каб блакітны экран, у прыватнасці, тэлечасопіс «Літаратурная Беларусь» дапамагаў лепш адчуць і глыбей зразумець творчую індывідуальнасць нашых пісьменнікаў, каб у перадачах гаворка аб літаратурных творах ішла на больш прынцыповай, крытычнай аснове. Хацелася б таксама, каб кіраўніцтва Беларускага тэлебачання з большай увагай ставілася да запатрабаванняў літаратурна-драматычнай рэдакцыі: павялічыла колькасць штатных супрацоўнікаў, больш выдзяляла плёнкі для запісу выступленняў нашых вядомых пісьменнікаў, літаратурных вечароў і г. д.

Будзем аптымістамі, будзем спадзявацца, што да пажаданняў нашых тэлегледачоў прыслухаюцца. У тэлевізійнага часопіса «Літаратурная Беларусь» ёсць усе магчымасці стаць яшчэ больш значнай з'явай у нашым культурным жыцці.

ВЯСЁЛАЯ ТРАСЯНКА

ЖАРТЫ, ГУМАРЭСКІ, ПАРОДЫІ, ЭПІГРАМЫ, ШАРЖЫ

Я. ГЕРЦОВІЧ

ПА САКРЭЦЕ...

Парада аўтарам-кан'юнктуршчыкам: пішыце на грыфельных дошках. Табы лягчэй, пры з'яўленні новых літаратурных мод, сцерці адно і напісаць другое.

Парада плагіятарам: калі вас вельмі прываблівае чужое, то крадзіце ў такіх жа, як і вы, плагіятараў, бо яны звычайна ў суд не падаюць.

Парада фантасту: адкрыўшы новую зорку, неадкладна зарэгіструй яе ў органах аховы аўтарскіх правоў, каб ніхто з тваіх калег не прэтэндаваў на яе.

Парада грэшніку: не спішайся паперад бацькі ў пекла, а выбірай такі час, калі чэрці загулялі і зрываюць падвоз смалы, рамантуюць катлы, пераходзяць на больш дасканалы графік.

Многія літаратурныя крытыкі падобны на пшанічнае цеста, якому дужа карысна, калі яго б'юць — яно тады падымаецца вышэй.

Не з кожным чалавекам трэба з'есці пуд солі, каб пайлепш пазнаць яго. З крытыкам П. дастаткова выпіць чарку гарэлкі.

Печаткоўцам ён марыў пра заволачны Парнас. Пасталёўшы, аддае перавагу эямному Літфонду.

С. ШУШКЕВІЧ

ХАЛОДНЫ АГОНЬ

Дзьмецца ён, як цецярук,
Гонару — дай божа,
Піша вершы абы з рук,
Перакласці можа.

Зважыць плён ягоны чым!
Ды якім бязменам!
Можа, хутка прагучыць
Слёзны марш Шапэна.

Скажа крытык, што гарэў
Ён у творчых муках,
Ды агонь той не сагрэў
Ні сыноў, ні ўнукаў.

Слабых вершаў дробны шрот
Падаў рыкашэтам...
Жыў на свеце вершаплёт
З гонарам паэта.

З ПАДСЛУХАНАГА

ЧЫЙ ПЛАШЧ ЛЕПШЫ!

Прыехаў да маці сын з горада ў кароценькім модным плашчы. Павіталіся. Маці, адступіўшы крокі на два, уважліва агледзела сынава ўбранне.

— Міколка, а колькі ж твой плашч каштуе?

— Шэсцьдзесят рублёў, мама.

— А божачка, транжыр ты гэткі. Вунь сусед Хведар за сорак рублёў дык па самыя пяты купіў!

Запісаў Якаў АЛЯКСЕЙЧЫК.

В. ШАЎЧЭНКА

АДЗІНЫ СВЕДКА

— Навошта, Іване, ты ромбік знімаеш,—
Праводзіць дзядок «агітацыю»,—
Адзіны ён сведчыць, што ты, братка, маеш
Вышэйшую адукацыю.

А. Пяткевіч

Старыя знаёмыя

СЦЭНІЧНЫ АБРАЗОК

МАЛЕНЬКІ гарадскі сквер, якіх многа ў Гродне. На лаўцы сядзіць стары чалавек. Кідаюцца ў вочы яго доўгія сівыя вусы, калярова хусцінка па шыі (павязаная на модзе!), стары, цёмна-зялёнага колеру капялюш, да бляску паглянцаваныя боты. Чалавек сядзіць, абапіраючыся на парасон. Паўз яго, не спяшаючыся, ідзе па сваіх справах жанчына. Чалавек аглядае яе зацікаўленым позіркам. І калі жанчына ўжо мінула лаўку, ён раптам занепакоіўся. Пават устаў.

ЧАЛАВЕК (*разгублена*). Э-э-э... А-а... Паўлінка!

ЖАНЧЫНА (*спынілася, азірнуўшыся*). ...?

ЧАЛАВЕК. Панна Паўлінка!!!

ПАЎЛІНКА. Што?! Якая я панна? Што вы?.. Хто вы такі? (*Падыходзіць*).

ЧАЛАВЕК. Хе-хе! Не пазнае мяне панна Паўлінка. Багатым буду, гаспадаром, як пекалі.

ПАЎЛІНКА. А божачкі!.. Быкоўскі? Пан Адальф Быкоўскі?.. Гэта ж столькі гадоў прайшло... (*Быкоўскі галантна цалуе ёй руку.*) І настарэў жа мой кавалер.

БЫКОЎСКІ. Хе-хе! Панна Паўлінка схільна да жартаў, як калісь. Што стары я, не сказаў бы. От так чалавек у самых гадах, я ест млоды духам.

ПАЎЛІНКА (*смяецца*). О-о! То пан Адальф усё яшчэ мае імпэт да маладых дзяўчат?

БЫКОЎСКІ. О, так! Жонкі я яшчэ не выбраў пазэдлут свайго становішча і густу. Праўда, адна тутэйшая маладзіца, дыхт якая ладная, улялюскалася ў мяне на самую шыю. Толькі я не маю пакуль паважных намераў. Трэба прыгледзецца.

ПАЎЛІНКА. Дык пан Адальф жыве тут, у Гродне?

БЫКОЎСКІ. Так, так, васпані, ужо два рокі. Я пераехаў з-над Вісы. Там у мяне быў уласны домік з садам і агародам. І добры прыбытак меў, скажу па праўдзе. Грошы ў мяне гадаваліся, дык па два кілё штука. Як вывезу, бывала, на рынак, дык і мужыкі купілі, не то што людзі шляхетныя.

ПАЎЛІНКА. То чаго ж пан Адальф перабраўся ў Гродна?

БЫКОЎСКІ. Натуральна рэч, васпані. Усе цяпер стараюцца, каб у горад, то чым я горшы. Я люблю таварыства, люблю падтрымаць гаворку па культурныя тэмы, насядзець з пажоўклымі людзьмі за шклянкай чорнай кавы, кілішкам канбяку. А там глуш, проша панні. І мешчанчукі толькі жлукцяць гэтую самую самагонку, як мае былыя стаўнікі валу... А яшчэ раматус убіўся, халера на яго, і сэрца падакучае, а ў вас, у Гродне, клімат прыстойны, мяккі ды і Друскінінкай блізка, мінулага року я курсоўку браў, то добра...

ПАЎЛІНКА. То пан Адальф можа тут і кватэру атрымаў у новым доме?

БЫКОЎСКІ. О так... дужа хочуць выдзеліць мне добрую кватэру, але я, пэўне, не вазьму яе. Не паважаю я гэтых камунік, проша панні. Я кватарую ў адной тут гаспадыні. Яна мае свой драўляны дом, і ў доме ўсё як належыць. Тэлевізар ёсць, вядома, то заходжу глядзець, свой купляць не трэба. Панчай Ядвігай зваць яе, далікатнага ўжо ўзросту кабета. Гэта недалёка ад вуліцы Ажэшковай...

ПАЎЛІНКА. То пан Адальф на суседстве, пэўна, у Дом афіцэраў на танцы ходзіць? Памятаю ж добра, як пекалі ў нашай хаце на вечарынцы пан Адальф вытылінгіваў на ямык і вучыў мяне падзі-кварту скакаць. А зграбны ж быў да танцаў, як вол да карэты!

БЫКОЎСКІ. А панна Паўлінка ўсё мне кампліменты гавора... Што ж, слаўныя былі тады часы, і я быў зух хоць куды, не то, што пяперашнія маладыя ды з бародамі. Весела было ў вас тады. Толькі вось гэты сваяк ваш... Як яго... Францыць Пустарэвіч, падта ж ядавіты чалавек быў, няхай яму матка боска, застуніца панна, сірыне (*хрысціцца*)... Дарэмна тады, васпані, не пайшла за мяне замуж!

ПАЎЛІНКА (*весела*). Дык жа пан Адальф хацеў мяне ўкрасці праз акно, а татка, помніце, турнуў пана як злодзея з хаты, так што пан Адальф аж галёшы свае пагубляў. Няўжо забыўся?

БЫКОЎСКІ. Як можна, як можна, васпані... Хіба я хацеў нашу Паўлінку красці? Я ж яе вёсус які-небудзь, а прыстойны гаспадар быў... Гляджу я, што на васпані старасці няма. І выфранцілася як семнаццатка. То як жа жывецца? Пэўна, васпані насаду выгодную мае?

ПАЎЛІНКА. Не трэба мяне называць панай, а то яшчэ знаёмыя пачуюць, смяяна будуць. А жыву, як усе, працую і, кажуць, добра. Людзі паважаюць. Так што жыццём задаволена. А як жа пан Адальф жыў гэтыя гады, чым займаўся?

БЫКОЎСКІ. Ды нішто сабе жыў, хоць, канечне, лепш, чым іншыя. Паўлінка ж памятае, пэўне, які ў мяне жарабец быў, каровы, колькі валок зямлі. Ну, а пасля, пры Саветах... я на інтэлігентную працу перайшоў. Кур'ерам быў у адной невялічкай, праўда, установе. А затым павышэнне далі, за сталом сядзеў, з паперамі меў справу. Заўсёды ў пяпле, чыста, з культурнымі людзьмі знаўся... І цяпер жыву—дай бог кожнаму. Ашчадную кніжку маю... А выдаткі якія?.. Пяць капеек прафсаюзных у месяц плачу як пенсіянер... Толькі вось як даўнейшае ўспомню... Гэта ж трыста пяцьдзесят мікалаеўскімі каштаваў мой жарабец...

ПАЎЛІНКА. Эх, пан Адальф, таварыш Быкоўскі! Не ўчарашнім, а сённяшнім трэба жыць, і дзень во сёння які харошы... Ну, нагаварылася я, пайду... Гэта ж я з абеду на работу, каб не спазніцца. Я ж у брыгадзе камуністычнай працы. І здзівіліся б мае дзяўчаткі: «Паўліна Сцяпанаўна, вы ж ніколі не позніцеся...» А як скажу, што Адальфа Быкоўскага сустрэла, ніхто не паверыць.

БЫКОЎСКІ. Я такеама маю пільны інтэрас, трэба ісці. Да касцёла панна Ядвіга запрасіла пайсці разам...

ПАЎЛІНКА. Глядзіце, каб яна вас у прымы не ўзяла, гэтая панна Ядвіга!

БЫКОЎСКІ. О, не, не, васпані, я чалавек выхаваны, і не пара яна мне. Вось пасля касцёла гуляць пайду... У мяне—рэжым. Па набярэжнай каля Нёмана гулянь, то там пагледзеў адну... Ва ўласным доме, проша панні, з бацькамі жыве. А дзеўка, як цацуха...

ПАЎЛІНКА. Ну, то бывайце, пан Адальф Быкоўскі: у розныя бакі нам.

БЫКОЎСКІ (*падымае капялюш, паркае ножкай*). Маё шанаванне, васпані, добрага здароўечка! (*Выходзячы, напявае*): «Плываёш голэмбе, лятаёш лабэндзе...».

МІМАХОДЗЬ

Р. БОХАН

У навуковым інстытуце ён вырашаў праблему вырошчвання квашанай капусты.

□

Шырокафармальны і шэразкранны фільм.

□

У Барбоса на ўсё была ланцуговая рэакцыя.

□

Гора ялінцы, калі шэфства над ёй возьме дрывасек.

□

Кінафільм не быў павучальны: у ім шмат пілі, але ніхто не трапляў у выцвярэзнік.

А. ЛІХАЧ

«Дапушчаныя памылкі» — справа недапушчальная.

□

Пальчаткі ў атэлье шылі на скорую руку.

□

Аўтар гумарэсак працаваў начальнікам цэха плоскага друку.

□

Адны разводзяць вадаплаўную птушку, некаторыя ж — толькі рукамі.

□

Ставячы загаловак «Нататкі на палях», не лічы сябе журналістам сельскагаспадарчага профілю.

□

Іншы раз здаецца, што ў начальніка ўсе пальцы на руках указальныя.

□

Пра марынаваныя агуркі можна напісаць так, што напісанае не замарынуюць.

Д. РОХКЕС

Выйшаў з сябе і не вярнуўся.

□

Засуджаны майстар спорту.

□

Нулявы момант.

□

Банкет на лёдзе.

□

Вечар адпачынку ад танцаў.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 АТ 08011

Адрас рэдакцыі: Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-44-04, аддзела літаратуры — 33-22-04, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-24-62, аддзела публіцыстыкі — 33-24-62, аддзела культуры — 33-21-53, выдавецтва — 33-22-19, бухгалтэрыі — 32-15-37.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Л. Я. ПРОКША.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, А. С. ГРАЧАНІКАЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.